Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

20 ЖНІЎНЯ 2008 г.
СЕРАДА
№ 155
(26268)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«БЕЛАРУСІ І РАСІІ НЕАБХОДНА ПЕРАХОДЗІЦЬ АД ПРОСТЫХ ГАНДЛЁВЫХ АДНОСІНАЎ ДА БУЙНЫХ СУМЕСНЫХ ПРАЕКТАЎ»


Фота БЕЛТА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка, які знаходзіцца з рабочым візітам у Расійскай Федэрацыі, 19 жніўня ў Сочы правёў перагаворы са сваім расійскім калегам Дзмітрыем Мядзведзевым.

Дамоўленасць аб гэтай сустрэчы была дасягнута ў час візіту расійскага прэзідэнта ў Беларусь у чэрвені.

У пачатку перагавораў, якія праходзілі ў рэзідэнцыі «Бачароў ручай», Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем адзначыў «адзін вельмі важны пазітыўны момант», што датычыцца выканання дамоўленасцяў, дасягнутых прэзідэнтамі дзвюх краін два месяцы таму ў Брэсце. «Я вельмі ўважліва назіраў за тым, як будуць выконвацца ўсе нашы дамоўленасці. Нават дробныя пытанні, якія мы з вамі разглядалі, знайшлі вырашэнне літаральна на наступны дзень, на наступным тыдні. У такім ключы дзейнічае і беларускі бок», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Закранаючы перспектывы развіцця гандлёва-эканамічных адносінаў, кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што ёсць усе перадумовы для таго, каб у 2008 годзе ўзаемны тавараабарот перасягнуў адзнаку $30 млрд.

«Але сёння ў звычайных адносінах — эканоміцы, палітыцы — настаў час, і абстаноўка нас да гэтага падштурхоўвае, у тым ліку канфлікт паміж Грузіяй і Паўднёвай Асецыяй, калі Расіі давялося абараняць сваіх людзей, ужо да нейкіх няпростых дзеянняў у рамках нашай Саюзнай дзяржавы. Я лічу, час простых дзеянняў і рашэнняў скончыўся. Нам трэба дзейнічаць больш цесна», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў расійскаму калегу за праяўленую ім мудрасць у вырашэнні ўзброенага канфлікту ў Паўднёвай Асеціі. «Гэта была спакойная, ціхая рэакцыя, якая прывяла да таго, што ў рэгіёне ўсталяваўся мір, і я лічу, што надоўга. Усё было зроблена вельмі спакойна, мудра і прыгожа», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. Ён звярнуў увагу на рэакцыю шэрагу заходніх дзяржаў і ЗША адносна трагічных падзей у Паўднёвай Асеціі. Аляксандр Лукашэнка лічыць у такой сітуацыі няправільным павучаць Расію, як ёй дзейнічаць у вырашэнні гэтага канфлікту.

Дзмітрый Мядзведзеў назваў рэкордным аб'ём тавараабароту, які, на думку расійскіх экспертаў, сапраўды можа перасягнуць у гэтым годзе адзнаку $30 млрд. «Гэта добры, сур'ёзны вынік», — сказаў расійскі прэзідэнт. Ён прапанаваў Аляксандру Лукашэнку абмеркаваць шэраг пытанняў міжнароднага жыцця, а таксама сумесныя крокі па ўмацаванні стратэгічнага партнёрства.

Кіраўнікі дзяржаў у ходзе працяглай размовы разгледзелі шырокае кола пытанняў двухбаковых беларуска-расійскіх адносінаў, актуальныя праблемы міжнароднага парадку дня. Размова, у прыватнасці, ішла аб нарошчванні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, узаемадзеянні ў сферах энергетыкі і транзіту, поглядах на забеспячэнне еўрапейскай бяспекі, будаўніцтве Саюзнай дзяржавы, удзеле беларускіх будаўнікоў ва ўзвядзенні алімпійскіх аб'ектаў у Краснадарскім краі.

Як было адзначана, беларуска-расійскі тавараабарот у 2007 годзе перасягнуў $26 млрд. На долю Расіі прыпадала 49,2 працэнта аб'ёму знешняга гандлю Беларусі. Наша краіна ў знешнегандлёвым абароце Расіі заняла шостае месца. У студзені—чэрвені 2008 года аб'ём узаемнага гандлю склаў больш як $18 млрд і павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 60,7 працэнта. Паспяхова развіваюцца кааперацыйныя сувязі паміж прадпрыемствамі розных галін эканомікі. А зняцце сумеснымі намаганнямі большасці ўзаемных эканамічных прэтэнзій з'яўляецца сведчаннем здольнасці ўрадаў дзвюх краін эфектыўна вырашаць складаныя праблемы.

Разам з тым, на думку беларускага боку, сёння неабходна пераходзіць ад простых гандлёвых адносінаў да больш высокай формы эканамічнага супрацоўніцтва — рэалізацыі буйных сумесных узаемавыгадных праектаў. Станоўчы вопыт, набыты ў сферы прамысловай кааперацыі па стварэнні сумесных вытворчасцяў, у пэўнай ступені можа служыць прыкладам для астатніх галін. Неабходны праекты, якія могуць аб'яднаць значныя прамысловыя патэнцыялы Беларусі і Расіі. Ва ўмовах глабальнай канкурэнцыі на міжнародных рынках такі падыход з'яўляецца найбольш прагматычным і лагічным. Прэзідэнты, у развіццё размовы, якая адбылася два месяцы таму ў Брэсце, абмеркавалі магчымасці такога супрацоўніцтва.

Беларусь гатова нарошчваць кантакты з Расіяй у сферы энергетыкі, транзіту энергарэсурсаў. У прыватнасці, больш поўнае выкарыстанне транзітнага патэнцыялу Беларусі выключна выгаднае для абодвух бакоў. Гэта адносіцца і да транзіту ў Еўропу расійскіх энергарэсурсаў.

Асаблівая ўвага прэзідэнтаў была ўдзелена актуальным пытанням міжнароднага парадку дня. На думку беларускага боку, пытанні ўмацавання бяспекі і процідзеяння сучасным выклікам і пагрозам у еўраатлантычным рэгіёне павінны вырашацца ў форме адкрытага раўнапраўнага дыялога ўсіх зацікаўленых дзяржаў. Немагчыма забяспечыць еўрапейскую бяспеку, улічваючы інтарэсы адных і ігнаруючы інтарэсы іншых. У гэтым пытанні погляды беларускага і расійскага бакоў супадаюць.

Нядаўна Расійская Федэрацыя вылучыла ініцыятыву аб распрацоўцы ўсёабдымнага дагавора аб еўрапейскай бяспецы, які стаў бы эфектыўным інструментам забеспячэння міру ў гэтым рэгіёне планеты. Пазіцыі Беларусі заключаецца ў падтрымцы гэтай ініцыятывы. Пры гэтым, як лічыць беларускі бок, у яе рэалізацыі павінен быць задзейнічаны патэнцыял Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў таксама дамовіліся аб тым, што да канца 2008 года будзе падпісана Пагадненне аб стварэнні адзінай сістэмы ППА Беларусі і Расіі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 20.08.2008 г.

1 долар ЗША	2 111,00
1 еўра	3 096,52
1 латвійскі лат	4 402,04
1 літоўскі літ	896,75
1 фунт стэрлінгаў	3 920,97
1 польскі злоты	930,30
1 расійскі рубель	85,92
1 украінская грыўня	457,67
1 шведская крона	330,81
1 швейцарскі франк	1 921,01

Ва Урадзе

ІСЦІ НАСУСТРАЧ ІНВЕСТАРАМ

Неабходнасць гэтага падкрэсліў Прэм'ер-міністр краіны на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў.

Сяргей Сідорскі адзначыў, што некаторыя міністэрствы і канцэрны практычна не прыцягнулі прамых замежных інвестыцый. «Няма неабходнасці чакаць, калі ў краіну прыйдуць інвестары, трэба самім ісці ім насустрач», — лічыць прэм'ер.

Ён запатрабаваў дакладна прааналізаваць, хто з інвестараў прыязджаў за апошні час у Беларусь з прапановамі і колькі праектаў з імі рэалізавана.

Першы намеснік міністра эканомікі Пётр Жабко паведаміў, што прамыя замежныя інвестыцыі ў першым паўгоддзі склалі $339,3 млн. Нягледзячы на трохразовае павелічэнне іх у другім квартале ў параўнанні з першым, выкананне гадавога задання па выніках шасці месяцаў склала толькі 24,2 працэнта, падкрэсліў ён.

Тэмп росту інвестыцый у асноўны капітал у студзені — чэрвені 2008 года склаў 123,9 працэнта да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года, прыцягнута Br14,3 трлн, што складае 41,4 працэнта гадавога задання. Крэдыты банкаў на інвестыцыйныя мэты перасягнулі Br4 трлн. Для фінансавання інвестыцыйных праектаў прыцягнута $900 млн. Усяго ў першым паўгоддзі рэалізоўваліся 773 інвестпраекты, асвоена 41,8 працэнта ад запланаванага на год. Завершана рэалізацыя 33 праектаў. Паводле слоў першага намесніка міністра, у цэлым дынаміка па прыцягненні інвестыцый ёсць, створаны неабходныя ўмовы для работы ў гэтым напрамку.

БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

КРУГЛАЕ ЛЕТА

в. Гарадзішча, Слуцкі раён.

СВАЯ КАСАВІЦА

Вясковыя гаспадары задаволеныя ўласнымі ўраджаямі

Аніськаўшчына — невялікая вёска ў Вішоўскім сельсавеце. Там цяпер жывуць адны пенсіянеры, якія заўсёды клапоцяцца пра сваё жніво — каб усё зрабіць своечасова, пры сухім надвор'і атрымаць добры ўраджай. Таму ў Аніськаўшчыну камбайны едуць адразу, як толькі пачынаецца ўборачная кампанія на ўласных прысядзібных участках.

Марыя Ануфрыеўна Стукачова ўраджайнасцю цалкам задаволеная: з яе 19 сотак сабрана 11 мяхоў збожжа, вагой дзесьці да паўтоны.

— Хлеб сёння, вядома ж, ніхто не пячэ, — усміхаецца гаспадыня. — Праўда, калі спатрэбіцца, і гэта майстэрства ўзгадаем ды адолеем. Толькі гледзячы на сёлетні ўраджай, нам тут харчовыя крызісы не пагражаюць! І ўсё маё збожжа пойдзе на корм жывёле.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

Дакументы ад прэтэндэнтаў паступілі ў акруговыя камісіі

На дэпутацкія крэслы ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прэтэндуюць 365 чалавек. Такая колькасць заяўнікаў прадставілі ў акруговыя выбаркамы дакументы на рэгістрацыю кандыдатамі ў дэпутаты. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай Лазавік.

Нагадаем, што ў склад ніжняй палаты беларускага парламента ўваходзяць 110 дэпутатаў. Дзень выбараў назначаны на 28 верасня 2008 года. Вылучэнне кандыдатаў завяршылася 18 жніўня, з 19 па 28 жніўня акруговыя выбарчыя камісіі будуць праводзіць іх рэгістрацыю.

«Пры гэтым у камісіі пададзены 494 камплекты дакументаў, што сведчыць аб вылучэнні некаторых кандыдатур двайным або трайным спосабам», — падкрэсліў сакратар ЦВК. Жадаючыя балатавацца ў беларускі парламент могуць вылучацца ад палітычнай партыі, працоўнага калектыву і шляхам збору подпісаў.

(Працяг тэмы на 2-й стар.)

Пытанне — адказ

ПЕРАМОЖАМ РАК

На любыя вашы пытанні, звязаныя з узнікненнем, дыягностыкай і лячэннем дабраякасных і злаякасных пухлін рознай лакалізацыі гатовы адказаць галоўны **ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансэра Зігмунд Эдуардавіч ГЕДРЭВІЧ.**

Пытанні можна пакінуць па нумары 8 (017) 287 18 29.

Адказ можна будзе атрымаць непасрэдна праз публікацыю ў газеце «Звязда». Пакідайце свае пытанні да 26 жніўня.

ОАО «Белтрансгаз» (арендодатель) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона)

ПРОВОДЯТ АУКЦИОН

на право заключения договоров аренды с 01.10.2008 г. нежилых помещений (сроком на 3 года), расположенных по адресу: Минский район, дер. Б. Тростенец, ул. Западная, 9: **Лот № 1:** складское помещение, об. пл. 209,3 кв.м (инвентарный номер капитального строения 600/С-70495). Начальная цена – 19 530 000 бел. рублей; **Лот № 2:** складское помещение, об. пл. 118,3 кв.м. Начальная цена – 11 040 000 бел. рублей; **Лот № 3:** складское помещение, об. пл. 151,9 кв.м. Начальная цена – 14 173 000 бел. рублей; **Лот № 4:** административное помещение, об. пл. 13,6 кв.м (инвентарный номер капитального строения 600/С-95249). Начальная цена – 762 000 бел. рублей; **Лот № 5:** административное помещение, об. пл. 17,7 кв.м (инвентарный номер капитального строения 600/С-95248). Начальная цена – 991 000 бел. рублей. Договор аренды предусматривает ставки арендной платы: 10 евро – за 1 кв.м за складское помещение, 6 евро – за 1 кв.м за административное помещение. Помещения расположены в 3 км от МКАД, (2 остановки от ст. метро «Могилевская»), охраняемая территория, автостоянка, удобный подъезд. Право на заключение договоров аренды продается с условием использования арендуемых площадей по назначению (административные помещения под офис, складские помещения для складирования, хранения продовольственных, промышленных товаров). Оплата стоимости права аренды производится в течение 10 дней после подписания протокола о результатах аукциона на р/с арендодателя. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор аренды подписывается сторонами в течение 5 календарных дней после полной оплаты. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 18.09.2008 г. в 12.00 по адресу: Минский район, дер. Б. Тростенец, ул. Западная, 9, актовый зал Управления «Торгсервис».** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.09.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Тел.: (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

Лошанский сельский исполнительный комитет Минского района (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов в Минском районе, в том числе:

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Начальная цена бел. руб.	Расходы по подготовке земле-устроительной документации, бел. руб.	Инфраструктура
1	д. Лошаны	623684005601000195	0,1478 га	16 645 236	601 447	электроснабжение, в непосредственной близости имеются сети газоснабжения, водопровод
2	д. Суковичи	623684012101000073	0,1305 га	6 676 941	628 724	электроснабжение, водопровод
3	д. Щербины	623684013101000069	0,1410 га	5 867 123	648 951	электроснабжение, водопровод

Примечание: по ЛОТУ № 2 имеются ограничения в использовании в связи с нахождением земельного участка в водоохранной зоне пруда.

Задаток в размере 5 % от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 23.09.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.09.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

ОАО «ГОРИЗОНТ» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 3 этажного кирпичного производственного здания 1993 г.п., общей площадью 612,5 кв.м, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева В.В.,19 (л. Ж 3/К). Начальная цена с НДС – 3 238 931 850 бел. руб. Площадь земельного участка — 0,0360 га. Задаток в сумме 100 000 000 бел. рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата за объект должна быть произведена в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 19 сентября 2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18 сентября 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

КРАІНЫ НАТА ДАМОВІЛІСЯ ПЕРАГЛЕДЗЕЦЬ АДНОСІНЫ З РАСІЯЙ

Краіны НАТА перагледзяць свае адносіны з РФ у сувязі з яе дзеяннямі ў дачыненні да Грузіі, паведамляе AFP.

Да такога рашэння прыйшлі кіраўнікі міністэрстваў замежных спраў, якія прадстаўлялі дзяржавы альянсу на пасяджанні 19 жніўня. «Мы вырашылі, што адносіны з Расіяй не могуць быць такімі, як раней», — гаворыцца ў іх сумеснай заяве.

Сваё рашэнне міністры матывавалі тым, што Расія, паводле іх меркавання, парушае свае абавязацельствы па ўрэгуляванні канфлікту і не выводзіць войскі з Грузіі. У чым канкрэтна праявіцца змена палітыкі НАТА ў дачыненні да Расіі, у заяве міністраў не ўдакладняецца.

ІЗРАІЛЬ ВЫПАДКОВА ПРАВЁЎ САКРЭТНЫЯ РАКЕТНЫЯ ВЫПРАБАВАННІ Ў ПРАМЫМ ЭФІРЫ



Па недаглядзе міністэрства абароны Ізраіля ў прамым эфіры спадарожнікавага тэлебачання быў раскрыты ваенны сакрэт краіны.

Сувязь паміж рознымі цэнтрамі кіравання, якія ўдзельнічалі ў ракетных выпрабаваннях, ажыццяўлялася з дапамогай спадарожнікавай сувязі, але пры перадачы сігналу не выкарыстоўвалася кадаванне і не быў усталяваны код доступу. У выніку трансляцыю з палігона і з цэнтра кіравання мог убачыць любы ўладальнік «спадарожнікавай талеркі», паведамляе NEWSru Israel.

Аб тым, што менавіта ўбачылі гледачы Блізкага Усходу, распавёў 10-ы канал ізраільскага тэлебачання. У яго рэпартажы адзначалася, што ракетныя магчымасці Ізраіля дагэтуль з'яўляюцца таямніцай за сямю пячаткамі, і ў свеце няшмат сакрэтаў, якія ахоўваліся б так дбайна, як гэты. Падчас трансляцыі гледачы маглі даведацца пра ўсё, што магло цікавіць замежныя спецслужбы: імёны людзей, якія займаліся распрацоўкай і выпрабаваннем сакрэтнай зброі, параметры ракеты. Так, у тэлефоннай гутарцы адзін з кіраўнікоў выпрабаванняў прасіць сураз-моўцу назваць код доступу да камп'ютара міністэрства абароны. Ён запэўнівае, што «іх нікто не чуе, а ўсе прысутныя заткнулі вушы». А затым па літарах паўтарае код доступу. У кіраўніцтве 10-га канала ІТВ удакладнілі: каб падключыцца да трансляцыі, было дастаткова звычайнай «спадарожнікавай талеркі», якую можна купіць у любой краме.

ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР ЭСТОНІІ АХВЯРАВАЎ ГРУЗІІ 500 ДОЛАРАЎ

Андрус Ансіп ахвяраваў пяць тысяч крон (каля 500 долараў) у падтрымку грузінскіх бежанцаў, паведамляе прэс-служба эстонскага ўрада.

Паводле яе інфармацыі, іншыя эстонскія міністры таксама выплацілі грошы на дапамогу грамадзянам Грузіі, пацярпелым падчас грузіна-асецінскага канфлікту. Усяго ж у падтрымку пацярпелым Чырвоны Крыж Эстоніі сабраў больш як два мільёны крон (каля 200 тысяч долараў). Эстонская дзяржава аказвае дапамогу толькі грузінскаму боку.

Нагадаем, што падчас абвастрэнняў сітуацыі ў Паўднёвай Асеціі краіны Прыбалтыкі выступілі ў падтрымку пазіцыі Грузіі. Міністр замежных спраў Эстоніі Урмас Паэт заявіў, што краіна гатовая аказаць дапамогу Грузіі на агульную суму 10 мільёнаў крон (каля мільёна долараў), а жыхары Эстоніі выказалі сваю падтрымку, пачаўшы масава скупляць грузінскія віны.

Выгодный СТАРТ на «Линию роста»

ОАО «Белагропромбанк» принимает денежные средства во вклад «СТАРТ!».*

ВАЛЮТА ВКЛАДА	белорусские рубли
ФИКСИРОВАННАЯ ПРОЦЕНТНАЯ СТАВКА	15% годовых, (по договорам банковского вклада заключенным с 19.08.2008г.)
СРОК РАЗМЕЩЕНИЯ	95 дней
МИНИМАЛЬНАЯ СУММА ВКЛАДА	1 000 000 рублей
ЧАСТИЧНОЕ СНЯТИЕ	до неснижаемого остатка (1 000 000 белорусских рублей) без перерасчета процентов

По истечении срока размещения в случае невостребования денежных средств сумма вклада автоматически переоформляется на вклад «Линия роста» с плавающей процентной ставкой и сроком хранения 500 дней.**

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

время работы Контакт-Центра Банка 8.00-20.00 без выходных и праздничных дней

звонки со стационарного телефона – бесплатно на территории РБ; звонки с мобильного телефона (velcom, МТС) – по тарифам оператора мобильной связи.

* Подробные условия вклада "Старт" в газетах: "Советская Белоруссия" (№105 от 30.10.2007г.), "Звязда" (№207 от 30.10.2007г.).
**Подробные условия вклада "Линия роста" в газетах: "Советская Белоруссия"(№48 от 10.03.2008г.), "Звязда" (№50 от 04.03.2008г.). Процентная ставка по состоянию на 11.12.2007г. опубликована в газетах: "Звязда" №235 от 11.12.2007г., "Советская Белоруссия" №238 от 18.12.2007г., на сайте банка и сети Интернет - www.belapb.by и в офисах ОАО "Белагропромбанк". Информация о размере процентов, выплачиваемых по вкладам в течение последнего финансового года – в офисах и на Интернет-сайте банка. Сохранность средств во вкладах ОАО "Белагропромбанк" обеспечивается в соответствии с законодательством РБ.

www.belapb.by
Белагропромбанк

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания конторы (464,4 кв.м), расположенного: Узденский р-н, пос. Новый, начальная цена снижена на 20 % и составляет 116 996 400 белорусских рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.08.2007 г. **Аукцион состоится 04.09.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 03.09.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

КУП «Гродненский центр недвижимости»

СООБЩАЕТ,

что аукционные торги, объявленные на 10.09.2008 г. по лотам № 1, 2 продажа права аренды земельных участков по ул. Брикеля и «Вишневец-4» позиция по генплану № 93 в г. Гродно, **отменяются.**

УНП 590727594

В извещении о проведении открытого аукциона

по продаже земельных участков в д. Слобода и д. Василевщина Самохваловичского с/с Минского р-на, опубликованном в газете « Звязда» от 15.08.2008 г., в графе таблицы «Инфраструктура» **читать по ЛОТУ № 1 «газоснабжение, электроснабжение, гравийно-песчанный подъезд», по ЛОТУ № 2 «электроснабжение, асфальтированный подъезд».**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

Адказныя пасады будучай АЭС зоймуць замежныя спецыялісты

Набор кадраў і падрыхтоўка персаналу для будучай атамнай электрастанцыі, якую плануецца пабудаваць у Беларусі да 2016 года, ажыццяўляецца ўжо цяпер. Згодна з адпаведнымі нарматыўнымі дакументамі, не пазней чым за два гады да ўвядзення АЭС у эксплуатацыю яна цалкам павінна быць укамплектавана персаналам.

Як паведаміў інжынер ДУ «Дырэкцыя будаўніцтва атамнай станцыі» Уладзімір Петрушкевіч, на першы блок патрабуецца каля 1200 спецыялістаў, на забеспячэнне работы ўсёй станцыі — каля 2000. Асноўныя крыніцы кадраў для будучай АЭС — прыцягненне спецыялістаў з-за мяжы, а таксама выкарыстанне выпускнікоў беларускіх ВНУ і айчынных спецыялістаў. Апошнія павінны мець адпаведную адукацыю і вопыт работы на энергетычных прадпрыемствах, а таксама прайсці перападрыхтоўку за мяжой. Замежныя спецыялісты-атамшчыкі неабходныя для бяспечнай эксплуатацыі атамнай станцыі на пачатковым этапе, пакуль выпускнікі ВНУ атрымаюць неабходны вопыт работы. Гэта 70—80 спецыялістаў, якія зоймуць такія адказныя пасады, як галоўны інжынер і яго намеснікі, персанал рэактарнага цэха, спецыялісты аддзела ядзернай бяспекі. На другі блок названыя спецыялісты будуць падрыхтаваны беларускімі ВНУ. Персанал на іншыя пасады будзе набірацца з ліку беларускіх спецыялістаў шляхам іх перападрыхтоўкі за мяжой на канкрэтную спецыяльнасць, а таксама падрыхтоўкі ў айчынных ВНУ.

Як падкрэсліў Уладзімір Петрушкевіч, падрыхтоўка аператыўнага персаналу для працы на АЭС уключае некалькі этапаў. Па-першае, гэта праходжанне кандыдатамі псіха-фізіялагічнага адбору, паколькі да асноўных пасад аператыўнага і кіруючага персаналу прад'яўляюцца надзвычай жорсткія патрабаванні. Па-другое — тэарэтычная падрыхтоўка ў ВНУ Беларусі і за мяжой па неабходнай спецыяльнасці. Трэці этап — стажыроўка і дубліраванне па пасадзе на дзеючай АЭС (дубліраванне ўключае допуск да ўпраўлення абсталяваннем). Апошні этап — падтрымманне прафесійнай кваліфікацыі спецыялістаў, якая ажыццяўляецца ў вучэбна-трэніровачных цэнтрах (у нас ён будзе знаходзіцца на АЭС). Пасля праходжання ўсіх этапаў спецыяліст здае экзамен і атрымлівае дазвол на працу.

Нягледзячы на жорсткія патрабаванні да спецыялістаў, паводле слоў начальніка ўпраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Беларусь Юрыя Міксюка, маладыя людзі праяўляюць зацікаўленасць у новых спецыяльнасцях, звязаных з атамнай энергетыкай. Тлумачыцца гэта тым, што пасля заканчэння ВНУ гэтыя спецыялісты будуць запатрабаванымі, будуць мець высокі ўзровень заработнай платы і забяспечвацца жыллём. А падчас навучання ў студэнтаў гэтых спецыяльнасцяў будзе павышаная стыпендыя, пакуль мяркуецца, што з каэфіцыентам 1,5, паведаміў Юрый Міксюк.

Падрыхтоўка персаналу для АЭС будзе весціся ў чатырох беларускіх ВНУ: у Беларускім дзяржаўным універсітэце, Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце, Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі і ў Міжнародным дзяржаўным экалагічным універсітэце імя А.Д. Сахарава. Як паведаміў дэкан фізічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта Віктар Анішчык, вучэбныя праграмы беларускіх ВНУ распрацаваныя з улікам вопыту замежных універсітэтаў і будуць аналагічнымі з некаторымі спецыяльнасцямі ядзернай энергетыкі расійскіх ВНУ. Менавіта ў гэту суседнюю краіну будуць накіроўвацца нашы выпускнікі для навучання ў магістратуры, аспірантуры, дактарантуры, і менавіта з ВНУ Расіі плануецца запрашаць навукоўцаў для выкладання некаторых дысцыплін.

Што датычыцца спецыялістаў, якія будуць будаваць АЭС, то часткова іх рыхтуе факультэт энергетычнага будаўніцтва БНТУ. Астатні персанал будзе запрошаны з-за мяжы. Як паведаміў Уладзімір Петрушкевіч, з гэтага тыдня пасада галоўнага інжынера атамнай станцыі занятая расійскім спецыялістам, стаж работы якога складае 25 гадоў на адной з атамных станцый Расіі.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Дакументы ад прэтэндэнтаў паступілі ў акруговыя камісіі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле слоў субяседніка, 240 прэтэндэнтаў выкарысталі толькі адзін спосаб вылучэння. З іх 197 суіскальнікаў вылучыліся ад грамадзян шляхам збору подпісаў, 13 — ад працоўных калектываў і 30 кандыдатур — ад палітычных партый. Адначасова двума спосабамі вылучыўся 121 грамадзянін. У прыватнасці, шляхам збору подпісаў і ад працоўнага калектыву — 96 чалавек, шляхам збору подпісаў і ад палітычнай партыі — 25. Усе тры спосабы вылучэння выкарысталі 4 прэтэндэнты на дэпутацкія крэслы. Мікалай Лазавік канстатаваў, што «аб сваёй партыйнай прыналежнасці заявілі 59 вылучэнцаў». Так, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя («Грамада») плануе зарэгістраваць 5 сваіх актывістаў, Кампартыя Беларусі — 14, Ліберальна-дэмакратычная — 7, Аб'яднаная грамадзянская партыя — 12, Партыя «Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада» — 2, БНФ — 6, Партыя камуністаў Беларуская — 7, Рэспубліканская партыя — 1, Кансерватыўна-Хрысціянская партыя БНФ — 1, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці — 4.

БЕЛТА.

Ці трэба было там сеяць, а потым убіраць?

У СВК «Свяцілавічы» Веткаўскага раёна каля адселенай вёскі было пасеяна збожжавых на плошчы ў 13 гектараў і тое ж самае, толькі на 40 гектарах, было зроблена ў КСУП «Чырвонаакцябрскі» Буда-Кашалёўскага раёна.

— Прыйшло жніво, — расказвае галоўны спецыяліст адміністрацыі зонаў адчужэння і адсялення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Гомельскай вобласці Аляксандр Пяршко, — і хлеб той убралі, аб чым стала вядома і нам, і абласной пракуратуры. У сувязі з гэтым кіраўнікі ўказаных гаспадарак аштрафаваныя ў адміністрацыйным парадку.

Дарэчы, за рознага роду парушэнні (а іх за паўгода было выяўлена 156), сярод якіх збор металалому ў зоне адсялення, грыбоў, ягад і г.д., на вінаватых накладзены штраф у суме 46 мільёнаў рублёў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

За сужыцельку — ды ў печ... Ну і ну!

А там поўным ходам шугалі чырвоныя языкі полымя. Жанчыну ахапіў жах, які, напэўна, надаў ёй дадатковыя сілы, і яна вырвалася з рук мужчыны, які цэліўся запіхнуць яе ў печ. Жанчына падала заяву ў міліцыю, узбуджана крымінальная справа. Адбылося гэтае здарэнне ў вёсцы Веляцін Хойніцкага раёна пасля сямейнай сваркі.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Кубак у «Кераміна» Хакей

Хакеісты сталічнага «Кераміна» сталі ўладальнікамі Кубка Беларусі. У фінальным матчы, які адбыўся ў Бабруйску, падапечныя Андрэя Гусава выйгралі ў сваіх пастаянных сапернікаў хакеістаў мінскага «Юнацтва» з лікам 6:5. Уладальнікі Кубка краіны 21 жніўня правядуць у сталічным Палацы спорту «выставачны» матч з мінскім «Дынама».

БЕЛТА.

«Дынама» чакаюць «хваробы росту»


Фота БЕЛТА.

У Кантынентальнай хакейнай лізе ў мінскага «Дынама» будуць «хваробы росту» і «цяжкія часы», заявіў галоўны трэнер каманды паўночнаамерыканец Джым Хьюз на прэс-канферэнцыі. «Расійская ліга — другая па сіле пасля НХЛ, дзе выступаюць высокакваліфікаваныя, хуткасныя хакеісты. Мы павінны прадэманстраваць сілу волі і пастарацца стварыць адзіны моцны калектыў, які павінен будзе змагацца за перамогу ў кожным матчы». Джым Хьюз адзначыў, што яму давядзецца хутка вучыцца і адаптавацца да новых умоў, у якіх будзе праходзіць першы сезон КХЛ. «Я шмат патрабую, і ў першую чаргу ад сябе», — заявіў паўночнаамерыканскі спецыяліст. Наконт задач, якія будзе ставіць беларускі прадстаўнік у КХЛ, галоўны трэнер «Дынама» адзначыў, што гэтак жа, як у НХЛ усе трэнеры жадаюць выйграць Кубак Стэнлі, у КХЛ усе будуць змагацца за Кубак Гагарына. «Аднак гэта толькі словы, якія нічога на азначаюць. Няма сэнсу разважаць пра люты, калі мы знаходзімся ў жніўні», — сказаў Джым Хьюз.

Алена КРАВЕЦ.

Наглядальнікі БДІПЧ АБСЕ пачынаюць маніторынг

Доўгатэрміновыя наглядальнікі БДІПЧ АБСЕ за выбарамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі чацвёртага склікання пачалі работу 19 жніўня, паведамілі ў Офісе АБСЕ ў Мінску.

Нагадаем, што асноўная дата парламенцкіх выбараў — 28 верасня 2008 года. З 19 жніўня пачынаецца чарговы этап бягучай палітычнай кампаніі — працэс рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты, які прадоўжыцца па 28 жніўня. Затым будзе праходзіць перадвыбарная агітацыя і прапаганда. Чакаецца, што ажыццяўляць доўгатэрміновае назіранне за выбарамі ў Беларусі будуць амаль 40 прадстаўнікоў АБСЕ. Напярэдадні асноўнага дня галасавання ў краіну прыбудуць яшчэ 300 кароткатэрміновых наглядальнікаў БДІПЧ АБСЕ для маніторынгу адкрыцця выбарчых участкаў і працэдуры падліку бюлетэняў. Доўгатэрміновыя эксперты маюць намер сачыць за работай адміністрацыйнага персаналу па выбарах і адпаведных дзяржаўных структур, прымяненнем выбарчага заканадаўства, за сродкамі масавай інфармацыі.

БЕЛТА.

Тарыфы на ўнутрырэспубліканскія перавозкі грузаў па чыгунцы з 20 жніўня павышаюцца на 25 працэнтаў

Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства эканомікі № 167, паведамілі ва ўпраўленні Беларуская чыгункі. У сувязі з гэтым з 0.00 20 жніўня 2008 года да ставак прэйскуранта нумар 10-01 на грузавыя чыгуначныя перавозкі ва ўнутрырэспубліканскіх зносінах устанаўліваецца павышальны каэфіцыент 4,438. ПДВ да праваздных плацяжоў, дадатковых збораў, плацяжоў за паслугі чыгункі будзе налічвацца згодна з раней устаноўленым парадкам.

БЕЛТА.

Атруціліся невядомымі рэчывамі — наркатычнымі і алкагольнымі

18 жніўня ўвечары ў Магілёве ў бытавым пад'ездзе аднаго з дамоў на вуліцы Першамайскай знойдзены целы двух мужчын, без бачных слядоў гвалтоўнай смерці. Высветлілася, што мужчыны ўзростам 30 і 32 гадоў нідзе не працавалі. Аператыўна-следчая група ўстанавіла, што яны атруціліся невядомым рэчывам, бо на месцы здарэння былі знойдзены два шпрыцы і адна лыжка. Верагодна, што рэчывы былі наркатычныя.

У той жа дзень у Бялыніцкім раёне з вуліцы ў вёсцы Буднікі ў бальніцу даставілі трох мужчын. Дыягназ — атручэнне невядомай вадкасцю. Выявілася, што рознаўзроставая, але адзінадушная ў імкненні выпіць кампанія (22, 38 і 44 гады) нідзе не працуючых і рабочага адной з сельскіх гаспадарак пачаставалася нейкім таямнічым алкагольным напоем. А вось што канкрэтна «сцямілі на траіх» мужчыны — адказа экспертыза, якая вывучае бутэльку з месца атручэння.

Алена КАЗЛОВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Брэсцкая вобласць.

Касі каса, пакуль раса... на балоце

Другі чэмпіянат па кашэнні балота прайшоў на тэрыторыі заказніка «Спораўскі» ў Бярозаўскім раёне. І хоць у параўнанні з леташнім мерапрыемства атрымалася не такім шматлюдным і прадстаўнічым, арганізатары адзначылі рост майстэрства ўдзельнікаў спаборніцтваў з касой.

Чэмпіянат праходзіў у два этапы. Спачатку прадстаўнікі камандаў касілі паласу даўжынёй 100 метраў і шырынёй тры метры, затым спаборнічалі на хуткасць скошвання ўдвая меншай і ўдвая вузейшай паласы. Рухаючыся па калені ў вадзе і балотнай грязі, трэба было накасаць выдатную якасць касьбы, бо за агрэхі — пакінутыя чубы — налічваліся штрафныя ачкі. Першае месца заняла каманда заказніка «Спораўскі». І ў асабістым заліку пераможцам стаў член гэтай каманды Віктар Брынковіч, які на леташнім чэмпіянаце таксама паказаў добры вынік. Цяпер пераможцы рыхтуюцца да міжнародных спаборніцтваў. Восенню яны паедуць на чэмпіянат Еўропы па кашэнні балота ў Польшчу.

Яна СВЕТАВА.

Абзац

■ **На сусветных рынках цана на золата цяпер самая нізкая за апошнія 20 гадоў. Спецыялісты прагназуюць далейшае падзенне цэнаў на жоўты метал. Такі ж лёс напаткаў і плаціну, якая за апошні час страціла 13 працэнтаў сваёй «вагі».**

■ На звестках Мінстата краіны, сёлета ў чэрвені сярэдні заробак ва ўстановах навукі і навуковага абслугоўвання Беларусі склаў Вr1 млн 285 тыс.

■ **На прамысловых прадпрыемствах сярэдняя заработная плата была ў чэрвені Вr1 млн 1 тыс. — на 12,5 працэнта вышэй за сярэднерэспубліканскі ўзровень аплаты працы.**

■ Першым трохтысячнікам у Брэсцкай вобласці стаў Андрэй Каспярчук з СВК «Нарутавічы» Бярозаўскага раёна. На камбайне «Джон Дзір» ён намалаціў 3047 тон збожжа. Такі высокі намалот сярод камбайнераў у вобласці дасягнуты ўпершыню за апошнія гады.

■ **Прыпынак і стаянка транспартных сродкаў будуць забароненыя сёння з 15 гадзін па перыметры мінскага стадыёна «Дынама» на вуліцах Кірава, Свярдлова, Ульянаўскай, Леніна ў сувязі з правядзеннем таварыскага футбольнага матча паміж нацыянальнымі зборнымі Беларусі і Аргенціны. Дзяржаўтаінспекцыя рэкамендуе балельшчыкам карыстацца грамадскім транспартам або выкарыстоўваць для паркоўкі транспарту пляцоўку каля канцэртнай залы «Мінск» або паркінг «Сталіца».**

■ У Столінскім раёне падчас купання ў штучным возеры патануў 15-гадовы школьнік. Гэта адбылося непадалёк ад вёскі Першамайск, куды падлетак прыехаў з сябрамі пакупацца. Дзесяцікласнік патануў прыкладна за 6 метраў ад берага, сябрам не ўдалося яго выратаваць. Раніцай наступнага дня цела загінулага дасталі з вады вадалазы. З пачатку года ў Брэсцкай вобласці патанула 80 чалавек.

■ **У Беларусі за сем месяцаў гэтага года зарэгістравана пяць выпадкаў завозу малярыі. Іншых небяспечных інфекцыйных захворванняў адзначана не было.**

■ Вёска Тумарын у Веткаўскім раёне напалову згарэла з-за лясного пажару. З-за моцнай засухі ў лесе ўзнік пажар, які вельмі хутка стаў верхавым: хваёвыя дрэвы гарэлі на вышыні каля 15 м, тушыць пажар пры гэтым цяжка. Агонь падступіў да вёскі, і пажар перакінуўся на пабудовы. З агнём змагаліся больш за 30 супрацоўнікаў МНС трох раёнаў Гомельшчыны, а таксама міліцыянеры і работнікі лясной службы. Знішчана 2 жылыя дамы, 2 дачы, 3 нежылыя дамы і 11 гаспадарчых пабудоў, эвакуявана 11 чалавек. Пашкоджана больш за 110 га лесу.

■ **Жыхарка Чалябінскай вобласці, якая месяц таму пайшла ў лес па ягады і не вярнулася, знойдзена жывой мясцовымі рыбакамі. На працягу двух тыдняў 19-гадовую дзяўчыну шукалі 85 чалавек, у т.л. выратавальнікі, пажарныя, міліцыянеры і ваеннаслужачыя. У пошуках быў задзейнічаны верталёт. Дзяўчыну знайшлі ў нежылым пасёлку. Месяц яна харчавалася толькі ягадамі і зрэдку — яшчаркамі. Зараз пацярпелая знаходзіцца ў бальніцы з моцнай скудненасцю.**

■ На чэмпіянаце свету па футболе сярод паліцэйскіх зборная дэпартамента аховы МУС Беларусі абыграла зборную МУС Расіі з лікам 3:0. У расійскіх калег зборная МУС Беларусі выйграла ўпершыню. Спаборніцтвы праходзяць у Сімферопалі, у іх удзельнічаюць 12 камандаў.

■ **У Беларусі ў першым паўгоддзі на 1000 шлюбаў прыходзілася 629 разводаў (летась гэтая лічба складала 581 развод).**

Поўны абзац

■ **Былы абсалютны чэмпіён свету сярод баксёраў-прафесіяналаў Канстанцін Цзю, які знаходзіцца зараз на Алімпійскіх гульнях у Пекіне, выйграў скрыню гарэлкі. Як паведамілі СМІ, гэты прыз быў сыграны ў «Доме сяброў Алімпіяды» ў конкурсе па стральбе з лука. Цзю ўдалося трапіць у «яблычак» з першага стрэлу і такім чынам абысці сваіх сапернікаў, сярод якіх былі акардэаніст Пётр Дранга і бронзавы прызёр Алімпіяды-2004 па дзюдо Дзмітрый Носаў.**

■ Паралізаваная афрыканская чарапаха па мянушцы Арава знайшла сваё каханне ў ізраільскім заапарку. 10-гадовая чарапаха вагой 25 кг трапіла ў заапарк нядаўна. З-за паралізаваных задніх лапаў яна не магла перасоўвацца. Каб дапамагчы Араве, працаўнікі заапарка прыдумалі для яе спецыяльнае крэсла-качалку на двух колцах. На ім яна праводзіць некалькі гадзін у дзень. Чарапаха паспела стаць цэнтрам увагі ў заапарку і заваяваць прыхільнасць свайго суродзіча.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Калейдаскоп

THE GUARDIAN: АБДУРЫЦЬ ПРА ЗША ВЕЛЬМІ ЛЁГКА, ТАМУ ШТО ЯНА НЕ ПРАЦУЕ

Польшча — гэта апошняя ахвяра амерыканскай знешняй палітыкі, прадыктаванай ваенна-прамысловым лобі ў Вашынгтоне. Тады, як Расія прадэманстравала, што можа адбыцца з яе былымі саюзнікамі, Польшча пагадзілася размясціць у сябе амерыканскую базу ПРА, піша ў аўторак The Guardian.

Амерыканскі ўрад настойвае на тым, што перахопнікі, якія будуць усталяваныя на ўзбярэжжы Балтыйскага мора, не маюць ніякага дачынення да Расіі — іх мэта ў тым, каб абараніць Еўропу і ЗША ад міжкантынентальных балістычных ракет, якімі не валодаюць Іран і Паўночная Карэя. Вось чаму іх размяшчаюць у Польшчы, якая, як вядома кожнаму студэнту-геаграфу ў Тэхасе, мяжуе з абедзвюма краінамі-ізгоямі, Іранізуе выданне.

Добрая навіна заключаецца ў тым, што пры цяперашніх тэмпах прагрэсу надзейныя сістэмы ПРА з'явяцца праз нейкія 50 гадоў. Дрэнная навіна ў тым, што да іх з'яўлення заставалася ўсяго 50 гадоў. Сістэмы распрацоўваюцца з 1946 года, але пакуль вынік нулявы. Вы б не пазналі гэтага, калі б прачыталі прэс-рэліз, апублікаваны агенцтвам супрацьракетнай абароны Пентагона: слова «поспех» сустракаецца часцей, чым любы іншы назоўнік. Праўда, у тым, што праграме ўдалося збіць дзве з пяці ракет, выпушчаных падчас выпрабаванняў. Але, на жаль, гэтыя выпрабаванні не маюць нічога агульнага з сучасным ядзерным ударам.

Усе праведзеныя дагэтуль выпрабаванні былі інсцэніроўкай. Іх мэта, від, траекторыя і кірункі вядомыя да пачатку выпрабаванняў. На выпрабаваннях выкарыстоўваецца толькі адна варожая ракета, бо ў сістэмы няма шанцаў на тое, каб збіць дзве і больш, адзначае The Guardian. Як адзначае былы высокапастаўлены прадстаўнік Пентагона, адказны за супрацьракетную абарону, магчымасці іншай дзяржавы абдурыць сістэму бязмежныя. На кожную рэальную выпушчаную ракету можна выпусціць серыю фальшывак. Вораг можа вывесці сістэмы з ладу нават з дапамогай металічнай фольгі. Такія тэхналогіі, даступныя ў кожнай краме, робяць шматмільярдную сістэму нямоглай. А яшчэ вораг можа проста забыцца аб балістычных ракетах і здзейсніць нападз дапамогай крылатых ракет, супраць якіх гэтая сістэма не дзейнічае.

НА МАРСЕ ЖЫЦЦЯ НЕ БЫЛО?

Касмічны марсаход «Фенікс» знайшоў у марсіянскай глебе рэчыва, якое можа з'яўляцца непераадольным бар'ерам для ўзнікнення жыцця на планеце, перадаюць інфармагенцтвы.

За мінулы месяц хімічнай лабараторыяй МЕКА, размешчанай на борце аўтаматычнага апарата, быў праведзены хімічны аналіз двух узораў грунту, сабраных на месцы прызямлення. У адным з іх быў знойдзены моцны акісляльнік — перхларат, які перашкаджае ўзнікненню жыцця на планеце. У цяперашні час праводзяцца дадатковыя даследаванні, якія павінны дапамагчы высветліць, ці не было гэта рэчыва занесена на паверхню Марса звонку.

Раней вынікі аналізаў, праведзеных у лабараторыі МЕКА, дазволілі вызначыць, што марсіянскі грунт утрымлівае злучэнні магнію, натрыю і хлору, гэта значыць рэчываў, неабходных для ўзнікнення жыцця. Але, як адзначаюць амерыканскія вучоныя, наяўнасць у марсіянскім грунце перхларату робіць яго менш «сяброўскім» для любых формаў жыцця.

Місію касмічнага апарата «Фенікс» планавалася закончыць у канцы жніўня, аднак мноства атрыманай інфармацыі прымусіла вучоных прадоўжыць яе да верасня.

«Фенікс» з'яўляецца не адзіным марсаходам, закліканым раскрыць тайну Чырвонай планеты. На яе паверхні ўжо больш за чатыры гады працуюць амерыканскія апараты «Спірыт» і «Апорцьюніці». На 2009 год запланаваны запуск яшчэ аднаго марсахода — «Марс Саенс Лаб», які павінен стаць самым прасунутым і дарагім у гісторыі. Задачай агрэгата будзе вызначыць, ці існавалі калі-небудзь на Марсе спрыяльныя ўмовы для ўзнікнення жывых мікраарганізмаў, а таксама ці ёсць на Чырвонай планеце хімічныя злучэнні, неабходныя для ўзнікнення жыцця.

ЛЮДЗІ-ВЕЛІКАНЫ ЖЫЛІ Ў САХАРЫ

У Сахары амерыканская навуковая экспедыцыя знайшла пахаванне каменнага веку.

Паводле ацэнак вучоных, гэта самыя вялікія са знойдзеных на тэрыторыі афрыканскай пустыні могілак той эпохі. Пахаванню можа быць ад 8 тыс. да 10 тыс. гадоў.

Цяпер на гэтым месцы — пясчаныя дзюны, а некалькі тысячагоддзяў таму там было возера, на берагах якога жылі прадстаўнікі дзвюх культур — кіфійскай і ценерыянскай. Яны вызначаліся высокім ростам, які часта перавышаў два метры. Кіфійцы жылі ў гэтым раёне 8—10 тыс. гадоў таму, на тысячу гадоў пазней там з'явіліся ценерыянцы. Вучоных здзівіў той факт, што абедзве культуры хавалі сваіх суродзічаў у адным і тым жа месцы.

Вучоныя знайшлі акрамя астанкаў людзей мноства шкілетаў жывёл, якія ва ўмовах пустыні не жывуць. Гэта прамы доказ таго, што ў каменным веку Сахара была «зялёным» рэгіёнам.

Некаторыя чалавечыя астанкі цудоўна захаваліся. Вучонымі знойдзены амаль некрануты шкілет жанчыны, яе рукі былі выцягнуты, быццам яна абдымае дваіх дзяцей, пахаваных побач. Узрост астанкаў — прыкладна 5 тыс. гадоў. У ліку іншых знаходак — чалавечая сківіца з зубамі, якія амаль цалкам захаваліся, а таксама пахавальны інвентар, упрыгажэнні з косці, каменныя прылады. Акрамя таго, палеантолагам удалося раскапаць астанкі вялізных кракадзілаў і дыназаўраў, якія жылі на Зямлі больш як 100 млн гадоў таму.

КОНКУРС «МІС СВЕТУ» АБМІНЕ УКРАІНУ

Аб магчымасці такога рашэння аргкамітэта размова ішла з пачатку грузіна-асецінскага канфлікту і ўмяшання ў яго Расіі. І вось цяпер стала вядома дакладна, што тэрміны правядзення фіналу 58-га па ліку конкурсу (ён павінен быў адбыцца 4 кастрычніка ў Кіеве) будуць зменены.

Акрамя таго, як пацвердзілі прадстаўнікі адміністрацыі ўкраінскай сталіцы, арганізатары разглядаюць магчымасць правядзення фіналу «Міс свету» ў іншай краіне. У якасці альтэрнатыўных варыянтаў, напрыклад, разглядаюцца Чэхія, Паўднёвая Карэя, Кітай або В'етнам. Зрэшты, апошняя краіна, у якой нядаўна выбіралі «Міс Сусвет», ужо адмовілася ад прыёму прыгажунь — у сувязі з хуткім пачаткам сезона дажджоў.

У афіцыйнай заяве аргкамітэта конкурсу адзначаецца: «З прычыны абставінаў, якія знаходзяцца па-за нашым кантролем, мы з вялікім жалем вымушаны перанесці фінал конкурсу «Міс свету-2008». Гэта рашэнне было прынятае ў інтарэсах удзельніц, а таксама арганізацыі «Міс свету». Ад усякіх іншых каментарыяў старшыня названай арганізацыі Джулі Морлі адмовілася. Дакладныя тэрміны і месца правядзення конкурсу будуць названыя ўжо напрыканцы гэтага тыдня. У любым выпадку, запэўніваюць арганізатары, выбары новай каралевы прыгажосці свету адбудуцца да канца гэтага года. Беларусь у конкурсе, нагадаем, прадставіць пераможца нацыянальнага конкурсу «Міс Беларусь-2008» Вольга Хіжынкова. Усяго ж да ўдзелу рыхтуюцца дзяўчаты са 120 краін свету.

Дарэчы, выпадкі «пераезду» конкурсу ў іншае месца здараліся і раней. Напрыклад, у 2002 годзе з-за бунтаў ісламістаў, калі загінула каля 200 чалавек, конкурс літаральна ў апошні момант быў перанесены з Нігерыі ў сталіцу Вялікабрытаніі.

АМЕРЫКАНЦЫ ЛЮБЯЦЬ ПАЖАРНЫХ

Самай прэстыжнай у ЗША амерыканцы лічаць прафесію пажарнага, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на даныя традыцыйнага апытання кампаніі «Харыс Інтэрэкцію». Прэстыжнай работу пажарнага назвалі 57 працэнтаў рэспандэнтаў.

У дзесятку найбольш прэстыжных у ЗША ўвайшлі таксама прафесіі вучонага, урача, медсястры і настаўніка, ваеннага і паліцэйскага, фермера, святара і інжынера. Найменш прэстыжнымі назвалі прафесіі агента па нерухомасці, біржавога брокера і банкіра.

У рэйтынгу сфер бізнэсу, якія лепш за ўсё абслугоўваюць спажыўцоў, першынствавалі супермаркеты (90 працэнтаў апытаных высока ацанілі іх работу), вытворцы камп'ютарнай тэхнікі (77 працэнтаў), пошукавыя сістэмы інтэрнэта і бальніцы (па 75 працэнтаў), вытворцы праграмнага забеспячэння (74 працэнты). Пяты радок занялі банкі (72 працэнты), нягледзячы на тое, што прафесія банкіра не такая прэстыжная. Найгоршай рэпутацыяй карыстаюцца кампаніі, якія займаюцца нафтай і вытворчасцю тытунёвых вырабаў.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ в г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 19 сентября 2008 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Адрес земельного участка	Площадь	Срок аренды	Цель использования	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
Лот № 1 ул. Ямницкая (0.0562 га — охранная зона ЛЭП)	0.0800 га	50 лет	Строительство и обслуживание складских помещений	740100000003005397	8 267 000	827 000
Лот № 2 ул. Первомайская в р-не дома № 72	0.0828 га	50 лет	Строительство и обслуживание административно-торгового здания с гостиничными номерами и кафе	740100000003005439	41 142 000	4 114 000
Лот № 3 б-р Днепровский (0.0070 га — водоохранная зона р. Днепр)	0.0070 га	10 лет	Строительство и обслуживание базовой станции сотовой связи	740100000004003035	681 000	68 000
Лот № 4 мкрн «Спутник»	0.0436 га	50 лет	Строительство и обслуживание здания магазина товаров повседневного спроса	740100000001004630	8 562 000	856 000
Лот № 5 ул. Симонова (0.0561 га — водоохранная зона р. Днепр)	0.0561 га	50 лет	Строительство и обслуживание пункта обслуживания легковых автомобилей	740100000005003772	10 628 000	1 063 000
Лот № 6 б-р Непокоренных	0.0140 га	3 года	Установка и обслуживание торгового павильона по продаже продовольственной группы товаров	740100000005003825	802 000	80 000
Лот № 7 ул. Ямницкая остановка «Улица Ямницкая»	0.0051 га	3 года	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000003005440	132 000	13 000
Лот № 8 ул. Якубовского остановка «Микрорайон Мир-2»	0.0023 га	3 года	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000001004631	174 000	17 000
Лот № 9 ул. Криулина	0.0306 га	50 лет	Строительство и обслуживание здания магазина	740100000002004740	6 142 000	614 000
Лот № 10 ул. Романова в р-не домов №№ 8, 10	0.0108 га	3 года	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000003005438	832 000	83 000
Лот № 11 ул. Габровская	0.2697 га	50 лет	Строительство и обслуживание административно-складской базы	740100000005003822	77 048 000	7 705 000

ПРИМЕЧАНИЕ:

1. Для участия в аукционе необходимо в срок, указанный в извещении, подписать соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и предоставить в уполномоченную организацию следующие документы: а) заявление на участие в аукционе; б) заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж); в) копию документа, содержащего идентификационные сведения (для физических лиц); г) доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица, паспорт; д) документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица; е) копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, индивидуального предпринимателя.

2. Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с предметом аукциона.

3. В течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельного участка победителю оплатить стоимость предмета аукциона, возместить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Центр по землеустройству») по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 08.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – **15.09.2008 года** до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона – **19.09.2008 года** с 15.00 до 15.40 в каб. 206.

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63

УНП 700008723

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

сообщает о проведении повторного открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность, который состоится 12 сентября 2008 года

в **16.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний. Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Центр по землеустройству») по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 08.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – **08.09.2008 года** до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона – **12.09.2008 года** с 15.20 до 15.50 в каб. 206.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, предоставить в уполномоченную организацию следующие документы: а) заявление на участие; б) заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 536, УНП 700123787; в) документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица; г) доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену.

Победитель аукциона обязан: оплатить в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность стоимость объекта аукциона; возместить затраты, связанные с подготовкой аукциона и документацией, необходимой для его проведения.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами.

Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

Покупатель, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка с наибольшей стоимостью.

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	ул. Бирюзовая, 37	0.1072 га	740100000007004491	3 808 000	381 000
2	ул. Бирюзовая, 39	0.1082 га	740100000007004492	3 843 000	384 000
3	ул. Бирюзовая, 42	0.1068 га	740100000007004494	3 788 000	379 000
4	ул. Бирюзовая, 44	0.1058 га	740100000007004484	3 753 000	375 000
5	ул.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

20 жніўня 2008 г. № 31 (134)

ГАРАДСКІЯ ШЛЯХІ

ДАРОГІ, ЯКІЯ... НЕ ВЫБІРАЕМ

Як грыбы пасля добрага дажджу вырастаюць у горадзе Жодзіне прыватныя дамы — імклівa разрастаецца ў апошнія некалькі гадоў індывідуальная забудова. Новая архітэктура, — галоўным чынам, дастойная, дабротная, так што гледзячы на такую прыгажосць, з зайздрасцю думаеш аб памерах кашалька гаспадара.

Іншая справа, кашалёк гэты ў любым выпадку не гумавы. І калі гаспадару хапіла грошай на сцены, дах, агароджу і вось гэтую клумбу пад вокнамі, гэта яшчэ не азначае, што ён здольны і вуліцу пад тымі вокнамі заасфальтаваць... Вось яна, дысгармонія сучаснага пейзажу: зірнеш навокал — ах, якія домікі! Зірнеш пад ногі — эх, дарогі...

Можа, думаю я, пазваніць у дзверы, папытацца ў каго-небудзь, чаму ён жыллё пабудаваў, а на дарогу «не скідваецца»? Не, неразумна неяк... Хоць я ведаю, што ў адным пасёлку пад Мінскам народ скінуўся «на дарогу» пад сваімі вокнамі. Не чакаць літасці ад мясцовай улады, а вырашыць пытанне самім — наша задача, падумалі тамтэйшыя насельнікі.

Пакуль колькасць прыватных дамоў у Жодзіне толькі расце, гэта абавязкова будзе непасрэдным чынам адбівацца на росце колькасці неўпарадкаваных дарог. Але ж не адным прыватным будаўніцтвам прырастае блізкі да сталіцы горад. Узводзяцца яшчэ і шматпавярховыя дамы ў новых мікрараёнах, і іх, між іншым, не кінеш з гравійкай, без стаянак для аўто, дзіцячых пляцовак ды пешаходных дарожак. Гэтаксама не скінеш з рахунку і дваровыя тэрыторыі ў старых раёнах, дзе дарогі не бачылі капрамонту са дня свайго нараджэння.

...Адным словам, дарогі за жыллём, ці лепей сказаць, за жыццём, не паспяваюць. Вось і сыплюцца скаргі ды патрабаванні на адрас мясцовай улады. Мы ж, простыя людзі, як разважаем? Я плачу падаткі, і, напэўна, маю права на тое, каб перад маім домам дый наогул у горадзе, дзе я жыву, былі нармальныя дарогі!

Вось і жыхарка Жодзіна, калі даведалася, што перад ёю — журналістка, адразу выпаліла: «Вы б пра нашы жудасныя дарогі напісалі...». Паспрабую, падумала я... Хоць, па праўдзе, ці ёсць у рэспубліцы гарады-пасёлкі, чые жыхары не маюць жадання звярнуцца да мяне з падобнай просьбай?

Іншая справа, Жодзіна зацікавіў мяне сваімі патэнцыяльнымі магчымасцямі ў вырашэнні трапяткога пытання. Усё ж такі размова ідзе пра горад з крыху больш як 60-тысячным насельніцтвам, пра буйны прамысловы цэнтр, у якім размешчаны РУП «Беларускі аўтамабільны завод», РУП «Кавальскі завод цяжкіх штамповак», ААТ «Світанак»... У горадзе дзейнічае каля 300 прадпрыемстваў і звыш тысячы прадпрымальнікаў... Гандлёвая сетка складаецца з сотні магазінаў... Функцыянуюць звыш 70 пунктаў грамадскага харчавання...

Вымушана сябе спыніць. Паколькі ведаю, што нягледзячы на сур'ёзныя сумы адлічэнняў у той жа Рэспубліканскі дарожны фонд, гораду сёлета было выдаткавана на дарожныя патрэбы... усяго 300 мільёнаў рублёў. Па-другое, паводле закона, прыватнік, які мае гандлёвы пункт ці жыве ва ўласным доме, як вядома, абавязаны клапаціцца і аб навакольнай тэрыторыі (на адлегласці 25 метраў), на якой гэты пункт або жыллё размешчаны. На практыцы ж мы, напэўна, яшчэ не «саспелі» — ні маральна, ні матэрыяльна — для актыўнага «клопату» такога кшталту.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ТЕМА ДНЯ

ОТОЙТИ ОТ БУМАГ И ЗАНЯТЬСЯ НАСЕЛЕНИЕМ

смогут сельские Советы после внедрения автоматизированной информационной системы



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вопросы совершенствования делопроизводства и внедрения автоматизированной информационной системы в местных Советах депутатов в очередной раз были рассмотрены на заседании рабочей группы, созданной при Совете по взаимодействию органов местного самоуправления.

Проблема сокращения бумагооборота и оптимизации отчетности назрела давно — что подтвердит любой председатель сельского Совета. Впервые подробно обсудив эту тему на выездном заседании в Молодечно в начале июня, члены Совета по взаимодействию пришли к выводу, что подняли практически нетронутый «пласт» вопросов. Бумаготворчество отнимает сегодня от 60 до 70 процентов рабочего времени председателя сельского Совета, и такая ситуация не может считаться нормальной.

Рабочая группа Совета по взаимодействию органов местного самоуправления под руководством его председателя Геннадия НОВИЦКОГО подготовила план мероприятий по совершенствованию делопроизводства в местных Советах депутатов, а также по созданию в 2008—2010 годах автоматизированной информационной системы местных Советов депутатов. Первая часть включает в себя анализ примерной номенклатуры дел поселковых и сельских Советов и исполкомов, внесение предложений по ее сокращению, изучение возможности оптимизации форм государственных статистических наблюдений и ведомственной отчетности, проработку вопросов упрощения административных процедур, осуществляемых местными Советами депутатов и исполкомами первичного уровня.

Вторая часть запланированных мероприятий касается создания автоматизированной информационной системы (АИС) «Местные Советы депутатов» и подразумевает под собой несколько направлений, или этапов. Это, во-первых, подключение местных Советов к системе защищенной электронной почты органов государственного управления «MAILGOV». Во-вторых, включение самого проекта по созданию автоматизированной информационной системы «Местные Советы депутатов» в перечень проектов Государственной программы информатизации «Электронная Беларусь» до 2010 года. В план включены также изучение и анализ делопроизводства, документооборота и информационных потоков сельских Советов, опытная эксплуатация и внедрение проекта АИС «Местные Советы депутатов», обучение пользователей АИС в местных Советах депутатов.

Уже на стадии подготовки самого плана удалось на четверть сократить номенклатуру дел на первичном уровне власти. Дальнейшая задача — создать примерную, типовую номенклатуру, единый порядок ее формирования для всей республики, для всех местных Советов.

— Но основной упор нужно сделать на ту часть программы, которая касается внедрения в Советах автоматизированной информационной системы, — подчеркнул Геннадий Новицкий. — Именно от реализации этого направления ожидается основной эффект, улучшение качества и производительности труда тех небольших коллективов, которые работают в сельских Советах.

Естественно, все новое приживается и принимается не сразу. Вот и у брестских специалистов возник вопрос: не проще ли, не дешевле ли было бы сначала изучить уже внедренные программы, по которым сегодня работает в республике 822 местных Совета. И только потом подключаться к системе защищенной электронной почты органов государственного управления «MAILGOV».

Но, как пояснил заместитель начальника центра информационных технологий ГУ «Главное хозяйственное управление» Управления делами Президента Владимир ЯНКОВСКИЙ, изучить информационные потоки имеющихся систем без подключения к данной «электронной почте» нельзя — именно она первична, потому что позволяет осуществить электронное взаимодействие между абонентами и «транспортировку» информации.

— Да, сейчас, без подключения к электронной почте «MAILGOV», ваша система тоже работает, но работает локально, в пределах района, — подчеркнул Владимир Янковский. — Вы обрабатываете информацию, потом... упаковываете ее в обычный конверт и пересылаете в райисполком по почте. В лучшем случае, по Интернету, где ваша информация, к тому же, практически не защищена.

Сегодня же ставится задача перейти от локальных и корпоративных систем к автоматизированной информационной системе, которая бы «завязала» на себе всю республику, все госорганы, — именно это позволит полностью исключить со временем бумажные потоки, дублирование информации и затраты другого характера.

Начальник управления информационных ресурсов и технологий Секретариата Совета Республики Александр НОВИК считает, что существующие сегодня на уровне областей автоматизированные системы не являются оптимальным вариантом обмена информацией — не только в силу своей локальности, но и потому, что не полностью охватывают все разделы учета и отчетности.

— Подключение к электронной почте «MAILGOV» для того и осуществляется, чтобы подняться над «локальностью», объединить в единую систему все государственные органы, — пояснил Александр Новик. — В некоторых странах вообще запрещено подключать компьютеры госорганов непосредственно к интернету. Ну а если хотите выходить в интернет просто так — устанавливайте компьютер, не подключая его к внутренней сети учреждения. Поэтому и предполагается подключение местных Советов именно к системе электронной почты органов государственного управления — сегодня нет более защищенной и качественной почты, чем «MAILGOV».

В необходимости подключения к системе, имеющей высокую степень защиты информации, уверен и заместитель министра связи и информатизации Николай СТРУКОВ.

— Если мы на разных уровнях создадим базы данных, то эти данные должны будут находиться под единой системой защиты. Так как информация, которая будет циркулировать внутри системы, предназначена не для всех.

Еще раз акцентируя внимание на важности обсуждаемого вопроса, Геннадий Новицкий подчеркнул:

— Наша сила не в административных ресурсах — так как Совет по взаимодействию не может давать никаких указаний. Мы рассчитываем на осознанное решение этой задачи на местах. Проделана большая работа — и с точки зрения повышения эффективности деятельности Советов, и с точки зрения экономии их ресурсов. И она продолжается.

Наталия КАРПЕНКО.

КОММЕНТАРИЙ

Сразу после окончания заседания рабочей группы «МС» попросила начальника управления информационных ресурсов и технологий Секретариата Совета Республики Александра НОВИКА ответить на несколько вопросов.

— Александр Сергеевич, на каком этапе находится разработка мероприятий по совершенствованию делопроизводства и созданию автоматизированной информационной системы местных Советов?

— У нас есть два плана. Первый касается наведения порядка в делопроизводстве и в документообороте. Мы хотим исключить дублирование информации, так как сегодня сельисполком посылает одни и те же данные разным потребителям, а на это уходит время. К тому же, некоторые виды отчетности, которую требуют у сельских Советов различные ведомства, вообще не предусмотрены государственным регламентом. Нет единого подхода и к формированию номенклатуры дел — в одном сельисполкоме это 3 папки, в другом — 50, в третьем — 20. И причем даже не в разных областях, а в пределах одного района. Поэтому наш первый план предполагает осуществление ряда мероприятий по совершенствованию делопроизводства. И после того, как здесь будет наведен порядок, займемся автоматизацией местных Советов.

— С 2005 года на местах внедрялась автоматизированная система «Сельский Совет». Сегодня она установлена более чем в 800 местных Советах... Может быть, есть смысл сначала рассмотреть реальный программный продукт? Зачем начинать с нуля?

— Да, в некоторых областях уже внедрены компьютерные системы, и этот опыт необходимо учитывать. Но там автоматизированы не все участки учета и отчетности, а только процентов 40 — в основном то, что касается хозяйственной деятельности. А вот информация по кадрам, по населению туда не вошла. Автоматизированные системы есть в Брестской области, Могилевской, Минской, Витебской и других. Но все они являются разрозненными, обособленными. Если подходить с государственной точки зрения, мы не можем внедрить чью-то одну систему. Они по-разному сделаны, а нам нужно создать что-то одно, общее, единое. Поэтому необходим выход на более высокий уровень, нужна новая информационная система, которая предусматривала бы создание интегрированной базы данных.

— Создание автоматизированной информационной системы «Местные Советы депутатов» будет включено в перечень проектов Государственной программы «Электронная Беларусь». Что это даст?

— Государственное финансирование, прежде всего. На реализацию проекта будет предусмотрено выделение средств, и достаточно больших. Что же касается исполнителя проекта по созданию АИС «Местные Советы депутатов», то его выберут на конкурсной основе — после обобщения поступивших заявок и представления их Координационному совету госпрограммы «Электронная Беларусь». Кто знает, может быть, из всех претендентов лучше всех окажется соответствующая организация из Брестской области? А может быть, из Могилевской или из Витебской? Но ясно одно: учитывая важность задачи и ее объем, необходимо найти организацию-не однодневку. Мало ведь внедрить проект — его придется постоянно обслуживать, сопровождать... И, безусловно, предпочтение будет отдано организации, которая уже имеет опыт подобной разработки.

В результате ее внедрения во всех сельских и поселковых Советах появится одинаковая система делопроизводства, замкнутая на единый портал. На этот портал по электронной почте госорганов «MAILGOV» будет стекаться вся информация. Каждый сельский Совет получит право доступа — т.е. возможность как минимум вводить и корректировать свою информацию. Рамки прав доступа мы еще будем обсуждать.

— Почему вы предлагаете подключить местные Советы именно к электронной почте органов госуправления «MAILGOV»?

— Из-за высокой степени ее защиты. А защищать будет что, поверьте. Думаю, какая-то внутренняя информация сельских Советов будет интересна многим... Электронная почта госорганов защищена более надежно, чем электронная почта интернета. И мы обязаны это учитывать, чтобы потом не сказали: вы не приняли надлежащих мер по защите информации.

— Подключение к этой системе дорого стоит?

— Да нет, я бы не сказал. Существуют расценки, и они небольшие. Оплата за единоразовое подключение для каждого сельского Совета — 45 346 рублей. Ежемесячная абонентская плата — 9018 рублей. В целом за услуги электронной почты госорганов область будет платить примерно 2—2,5 миллиона рублей ежемесячно. Хочу сказать, что использование для этих же целей интернета вряд ли обойдется областям дешевле.

— На что еще потребуются средства местных властей?

— Разработка и внедрение АИС «Местные Советы депутатов» должна пройти по программе «Электронная Беларусь», на что, как я уже сказал, будут выделены государственные средства. Ну а дальше понадобится финансирование уже из местных бюджетов. На что потребуются деньги? На оснащение компьютерами и их дальнейшее обслуживание. На создание базы данных в каждом местном Совете: сколько домов, кто в них живет, какие площади участка, что там посажено, сколько колодцев, фонарей и т.д.

На первом этапе (примерно в течение полугода) придется всю необходимую информацию собрать и ввести. И это, пожалуй, будет самым трудным для местных Советов. Но зато потом им будет значительно легче. Останется только вносить в базу данных некоторые текущие изменения — кто-то родился, кто-то зарегистрировался... Важно, чтобы информация постоянно обновлялась и была актуальной. И тогда система позволит давать любой отчет в любую минуту. А возможно, что сельский Совет вообще не будет заниматься отчетностью, так как вся необходимая база данных будет находиться в центральном портале. И любое государственное учреждение, любое ведомство сможет воспользоваться этой информацией. А Советы пусть занимаются населением.

АДРАСНАЯ ДАПАМОГА

ДАПЛАТЫ НА... КРАЙНІ ВЫПАДАК

З пачатку гэтага года ў Магілёўскім раёне колькасць заяў на адрасную сацыяльную дапамогу перавысіла леташні паказчык больш чым у чатыры разы. Аднак ці былі задаволены ўсе гэтыя заявы — пытанне ўжо іншае. Прынамсі, сёння ёсць правіла: для пачатку чалавек мусіць паспрабаваць вырашыць матэрыяльныя праблемы самастойна, а таксама скарыстацца безнаяўнымі жыллёвымі субсідыямі, бясплатным харчаваннем на маленькіх дзяцей і ўсімі астатнімі варыянтамі сацыяльнай падтрымкі. І толькі калі гэта не дапаможа — звяртацца па адрасныя выплаты.

Другі «пік»

Былы калгаснік меў невысокія заробкі і цяпер атрымлівае нізкую пенсію, маці вымушана кінуць працу і даглядаць дзіцяінваліда, жонка знаходзіцца ў «дэкрэтным», а зарплата мужа не перавышае 400 тысяч рублёў... Падобныя прыклады можна ўзгадваць бясконца. Прычым без дзяржаўнай падтрымкі тут на самай справе не абысціся. Як, зразумела, бывае цяжка шматдзетным і нявопўным сем'ям.

— Калі летась дапамога ў асноўным ішла шматдзетным і няпоўным сем'ям, то сёлета колькасць «адрасоў» павялічылася, і перш-наперш — за кошт поўных сем'яў з няпоўнагадовымі дзецьмі, сем'яў з дзецьмі-інвалідамі і адзінокіх пенсіянераў, — распавядае начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага райвыканкама Таццяна ПУЗЫРЭЎСКАЯ. — Стаў большым і сам памер выплат — у сярэднім ён складае 59 тыс. рублёў на чалавека ў месяц. Да прыкладу, найменшая сума адраснай дапамогі адной сям'і аказалася каля 3 тыс., а вось найбольшая сума — больш за 1 мільён 200 тысяч.

Як паказвае практыка, большасць патэнцыяльных прэтэндэнтаў аб адрасной сацыяльнай дапамозе ўжо ведаюць. Прычым чарговы «ўсплёск заяў» тут прагназуецца ў верасні. Дапамога можа прызначацца на тры месяцы, потым робіцца такі ж перапынак — адпаведна, той, хто атрымліваў адрасную падтрымку ў пачатку года, цяпер можа звяртацца па яе зноў.

Па-другое, з 209 да 224 тысяч рублёў павялічылася сама «планка даплат» — бюджэт пражыткоўага мінімуму. І патрэцяе. Нельга не ўзгадаць, што ў сукупны даход сям'і ўключаюцца льготы па аплаце за дзіцячы садок і за харчаванне школьнікаў. Аднак паколькі летам дзеці не наведвалі школу, а часцяком — і дзіцячыя садкі, гэтыя датацыі ў даход ужо не ўвойдуць. Даход сям'і акажацца меншым, а верагоднасць атрымання адрасной падтрымкі ўзрасце.

— Апроч ільгот па дзіцячых садках і школьным харчаванні, пры прызначэнні адрасной сацыяльнай дапамогі бяруцца пад увагу безнаяўныя жыллёвыя субсідыі і кошт бясплатнага харчавання на дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў, — працягвае Таццяна Пузырэўская. — Нарэшце, можа прымацца ў разлік і прадукцыя з уласнага падворка. Формула атрымліваецца наступная. Калі сельгаспрадукцыя ідзе толькі на спажыванне самой жа сям'і, то гэта на памер сукупнага даходу ніяк не ўплывае. Аднак калі сям'я прадае тую ж бульбу, здае свіней або цялят, то ў даход абавязкова залічаць 15 працэнтаў ад сумы рэалізацыі. І выключэнне тут адно — малако. Прыбытак ад здадзенага малака не ўключаецца ў даход у любым выпадку.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

МЯСЦОВАЕ ПАЛІВА

ПРАПАНОВА ЁСЦЬ. СПРАВА ЗА ПОПЫТАМ

На Гродзеншчыне шукаюць шляхі найбольш эфектыўнага выкарыстання драўніны ў якасці паліўных рэсурсаў

Дранікі ў нас заслужылі папулярнасць даўно і з'яўляюцца, можна сказаць, адной з «візітовак» Беларусі. Чаго пакуль не скажаш пра дранку, хоць гэты від паліва ўжо на працягу дзесяцігоддзяў задзейнічаны ў Аўстрыі, Фінляндыі і іншых еўрапейскіх краінах. Чым жа мы горшыя?

Лесу і драўніны, якую найбольш мэтазгодна выкарыстоўваць для забеспячэння кацельняў, у нас хапае. Разумення рэалій, што трэба спадзявацца не толькі на газ, але і выкарыстоўваць мясцовае паліва, апошнім часам таксама не бракуе. Тым больш, што гэта асэнсаванне падмацоўваецца ростам цэнаў на газ і канкрэтнай дзяржаўнай задачай: да 2012 года не менш за 25 працэнтаў паліўна-энергетычных рэсурсаў павінны складацца ў рэспубліцы з мясцовага паліва. І першачарговае значэнне надаецца менавіта драўнянаму паліву. Такім чынам, усе мясцовыя органы кіравання і прадпрыемствы не проста павінны мець жаданне, а абавязаны зладжана працаваць у гэтым накірунку. Што і робяць цяпер на Гродзеншчыне.

— Вытворчасць паліўнай дранкі ў вобласці развіваецца двума шляхамі, ёй займаюцца і прадпрыемствы лясной гаспадаркі, і палівазабеспячальныя арганізацыі. Спадзяёмся, што гэта станоўча паўплывае на якасныя і цэнавыя фактары гэтай прадукцыі. А падтрымка будзе аказвацца таму, хто працуе больш эфектыўна, — адзначае намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама **Мікалай КАВАЛЁЎ**.

Гасцям з іншых рэгіёнаў, якія прыехалі па вопыт у КУП «Гроднаабллпаліва», паказалі ўжо створаны «ланцужок» па вытворчасці паліўнай дранкі і яе транспарціроўцы на кацельню. Вытворчы працэс пачынаецца, зразумела, з нарыхтоўкі драўніны. У дадзеным выпадку гэта ўчастак, дзе сваю чорную справу зрабіў агонь, а дакладней, чалавечая безадказнасць у адносінах да прыроды. Пакалечаныя дрэвы яшчэ змагаюцца за жыццё, але відавочна, што найбольш аптымальны варыянт — пусціць іх на паліва, а ўзамен на гэтай плошчы пасадзіць новыя. Вось тут і паслужыць тэхналогія па вытворчасці паліўнай дранкі. Тут жа, у лесе драўніна трапляе ў «абдымкі» рубільнай машыны НЕМ-420. За рабочую змену гэта высакакласная тэхніка здольная без праблем запоўніць 5—6 аўтамабіляў — дранкавозаў, а за год вырабіць прыкладна 22,5 тысячы шчыльных кубаметраў дранкі.

Накіроўваемся ў вёску Новая Гожа Гродзенскага раёна. Літаральна нядаўна, у лістападзе, у тутэйшай кацельні запушчаны ў эксплуатацыю кацёл, які выкарыстоўвае не толькі газ, але і дранку. Нейкія высновы рабіць пакуль рана, аднак на сёння, паводле інфармацыі галоўнага інжынера КУП ЖКГ Гродзенскага раёна Андрэя Каяча, кошт адной гігакалорыі «газавага» цяпла складае 126 тысяч рублёў, а «драўнянага» — 135 тысяч рублёў. Але як будзе заўтра, калі газ, вядома ж, не стане таннейшым? Ды і, мабыць, не зусім карэктна ўлічваць пры параўнанні толькі цэнавы фактар. Мяркуйце самі. Грошы за газ вывозяцца з краіны. А выкарыстоўваючы мясцовае паліва, мы не толькі эканомім валюту, але і ствараем усю інфраструктуру (нарыхтоўка, перапрацоўка, транспарціроўка) па задзейнічанні раней незапатрабаванай сыравіны. Гэта рабочыя месцы, падаткі ў бюджэт.

Пракаментаваў генеральны дырэктар КУП «Гроднаабллпаліва» **Віктар НІКАЛАЙЧЫК**:

— Гродзенская вобласць — адна з самых газіфікаваных у Беларусі. У паліўным балансе летась прыродны газ займаў 85, а сёлета — 83 працэнты. Мы першымі адчулі на сабе зніжэнне аб'ёмаў рэалізацыі цвёрдага паліва (дроў, торфабрыкетаў). Як у такіх умовах захаваць калектывы ўсіх нашых 17 філіялаў, забяспечыўшы іх стабільнае фінансаваэканамічнае становішча і рост зарплаты людзям? Толькі за кошт развіцця дадатковых відаў дзейнасці. Наладзілі дрэваапрацоўку, вытворчасць драўнянага вугалю, тратуарнай пліткі, бардзюраў і жалезабетонных агароджаў, збор аўтамабільных шынаў, аказваем транспартныя і іншыя паслугі. Вялікія надзеі ўскладаем і на вытворчасць паліўнай дранкі.

Дзякуючы фінансавай падтрымцы Дэпартамента па энергаэфектыўнасці і Гродзенскага аблвыканкама закупілі сучасную тэхніку, навучылі кадры, стварылі ў нашых філіялах пяць брыгад па нарыхтоўцы драўніны. Гэта — першы этап праекта, рэалізацыя якога дазволіць нам павялічыць аб'ёмы работ і паслуг амаль на 30 працэнтаў. Другі этап — набыццё тэхнікі і арганізацыя вытворчасці паліўнай дранкі ў іншых раёнах вобласці, дзе яна, мяркую, у бліжэйшы час таксама спатрэбіцца. Спадзяёмся на цеснае супрацоўніцтва з мясцовымі органамі ўлады.

Такім чынам, прапанова ўжо ёсць. А як жа з попытам?

— На сёння заключаны дагаворы на пастаўку паліўнай дранкі да канца гэтага года з прадпрыемствамі жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў аб'ёме 10 860 шчыльных кубаметраў. Гэта амаль поўная загрузка тэхнікі, але пры ўмове раўнамернай працы. Каб не было так, што ў трэцім квартале рубільная машына будзе прастойваць, а ў чацвёртым фізічна не справіцца з неабходнымі аб'ёмамі.

Дарэчы, і кошт паліўнай дранкі намі пралічваўся пры ўмове, што тэхніка будзе пастаянна загружана работай. Цана залежыць таксама ад таго, дзе гэта прадукцыя будзе захоўвацца. Найбольш аптымальным варыянтам, на мой погляд, з'яўляецца будаўніцтва адпаведных пляцовак непасрэдна пры кацельнях прадпрыемстваў ЖКГ.

Ужо сёння ёсць эфектыўная тэхналогія, кадры, якія здольныя і, можна сказаць, гараць жаданнем рабіць карысную не толькі для сваіх прадпрыемстваў, але і для ўсёй дзяржавы справу. І вельмі важна, каб гэты энтузіязм быў падмацаваны зацікаўленасцю з боку партнёраў. Але ці гатовы жыллёва-камунальныя арганізацыі да выкарыстання дранкі? Прапанова гэтага віду мясцовага паліва пакуль апярэджвае тэмпы ўстаноўкі катлоў, якія разлічаны на яго выкарыстанне. Праўда, як запэўнівае намеснік начальніка ўпраўлення ЖКГ Гродзенскага аблвыканкама Ігар Ласоўскі, колькасць такіх катлоў ужо сёлета значна павялічыцца, а разам з тым будуць пастаянна ўзрастаць і аб'ёмы спажывання паліўнай дранкі.

Такім чынам, на Гродзеншчыне робяцца першыя крокі па фарміраванні рынку мясцовага паліва. Галоўная задача цяпер у тым, каб стварыць эканамічна выгадныя ўмовы і для яго вытворцаў, і для спажыўцоў, канкрэтных прадпрыемстваў і тэрыторый.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

ГАРАДСКІЯ ШЛЯХІ

ДАРОГІ, ЯКІЯ... НЕ ВЫБІРАЕМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Праўда, першыя станоўчыя зрухі ў памянёным накірунку ўжо ёсць, кажа намеснік старшыні Жодзінскага гарвыканкама па будаўніцтве і жыллёва-камунальнай гаспадарцы Уладзімір БАЛІЦКІ. Напярэдадні свята горада —10 верасня — завершыцца першая чарга рэканструкцыі гарадскога парку, які з'яўляецца не толькі асноўным месцам адпачынку маладых матуль з каляскамі, але і цэнтральнай «магістраллю», месцам, праз якое праходзяць шляхі-дарогі да розных «стратэгічна важных» гарадскіх аб'ектаў. У парку будуць новыя дарогі, адрэканструюецца сцэнічная пляцоўка і з'явіцца нават першы ў горадзе фантан...

Новенькія дарожкі ў Аўтазаводскім завулку.

— Гарадскі парк, калі рабіць яго як належыць, патрабуе 1,5 мільярда рублёў, а ў нашым распараджэнні — каля 350 мільёнаў, — кажа Уладзімір Міхайлавіч. — Галоўным чынам, гэта грошы, зароблены на суботніку. Плюс невялічкія ахвяраванні камерцыйных арганізацый і прадпрымальнікаў, якія пераканаліся, што сродкі пайшлі на канкрэтную справу: парк мяняецца на вачах. Тым не менш, галоўнай крыніцай фінансавання з'яўляецца гарадскі бюджэт...

...У Жодзіне зараз —144 вуліцы і 49 завулкаў. Іх агульная працягласць складае 114 кіламетраў. Не будзем забываць, што падчас капітальнага рамонту саміх вуліц у тых жа дварах не проста кладзецца плітка ці «раскатваецца» асфальт. Парадкуюцца і дзіцячыя пляцоўкі, абнаўляюцца лаўкі і сметніцы, адным словам, на ўсё гэта штогод гораду патрабуецца не менш за 5 мільярдаў рублёў! Што характэрна, сёлета (у сувязі з юбілеем Жодзіна, якому спаўняецца 365 гадоў) гораду, як ніколі, удасца наблізіцца да памянёнай лічбы. Гаворка ідзе аб 4 мільярдах рублёў. І «выйсці» на такую суму дазволяць нехарактэрныя абставіны: непасрэдны ўдзел у справе РУП «БелАЗ». Толькі на рэканструкцыю вуліцы Сыраквашы, названай у гонар першага дырэктара завода, прадпрыемства вылучыла 800 мільёнаў рублёў. Падобным чынам, як плануецца, будзе ўпарадкавана і вуліца 8 Сакавіка, на якой размяшчаецца ААТ «Світанак».

— 300 мільёнаў рублёў, якія нам вылучыў на гэты год Рэспубліканскі дарожны фонд, ужо асвоены, — тлумачыць Уладзімір Баліцкі. — Прыведзены ў належны стан вуліцы Працы і Сухаградская, якія не бачылі рамонту шмат гадоў. Між тым, на адной з іх размешчаны цэнтральны гарадскі рынак, а з нядаўняга часу — новы будынак гарадскога ўпраўлення ўнутраных спраў. Работа была праведзена сур'ёзная, і частка грошай, патрэбных на рамонт той жа Сухаградскай, была выдаткавана з гарадскога бюджэту... Выканалі бягучы рамонт старой вуліцы Фрунзе, якая размяшчаецца ў прыватным сектары і дзе знаходзіцца Навукова-практычны цэнтр жывёлагадоўлі.

Вуліца Крынічная. Эх, дарога...

Сёлета ўжо завершана ўпарадкаванне дзвюх дваровых тэрыторый, практычна гатова тэрыторыя па вуліцы Гагарына, наперадзе — абнаўленне яшчэ дзвюх: па вуліцах Ленінградскай і Савецкай.

У хуткім часе будзем здаваць у новым мікрараёне вуліцу Каліноўскага — з асфальтам, тратуарнымі дарожкамі, асвятленнем. Плануем рамонт цэнтральнай вуліцы 40 гадоў Касгрычніка, на што спатрэбіцца 1,5 мільярда рублёў. Палову сродкаў выдаткуе БелАЗ, палову — гарадскі бюджэт. Як толькі завершыцца газіфікацыя, поўнасцю будзе заасфальтавана і вуліца Партызанская. Зробім і ўчастак перайменаванай вуліцы Багуслава Поля — з месцамі для паркоўкі аўтамабіляў. Поўнасцю на сродкі горада плануем зрабіць своеасаблівы гістарычна-архітэктурны комплекс — прыгожае месца з імітаваным млынам ды альтанкай... Для адпачынку звычайных гараджан, для нашых маладажонаў і гасцей горада. Будзем спрабаваць завяршыць работу ўжо сёлета...

Святлана БАРЫСЕНКА. Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

г. Жодзіна.

АДРАСНАЯ ДАПАМОГА

ДАПЛАТЫ НА... КРАЙНІ ВЫПАДАК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Мужа не схаваеш

Пралічыць уласны даход самастойна складана, таму тут ніколі нялішне звярнуцца па дапамогу спецыялістаў сацыяльнай службы. Тым больш што для вызначэння права на адрасную падтрымку збіраць шмат папер не трэба — дастаткова прадставіць пашпарт, пасведчанні аб нараджэнні дзяцей і іншыя дакументы, што знаходзяцца «на руках», узяць даведку аб зарплаце і даведку аб складзе сям'і. Праўда, якраз з апошняй могуць узнікаць пытанні.

— Сустракаюцца прыклады, калі па дакументах жанчына выхоўвае дзяцей адна, але на справе ў гэтай сям'і пражывае мужчына, — кажа Таццяна Пузырэўская. — Нічога супраць грамадзянскіх шлюбаў мы не маем. Аднак падчас прызначэння адраснай сацыяльнай дапамогі абавязкам жанчыны-прэтэндэнткі — паведаміць такі факт. Прычым спробы схаваць тое, што сям'я мае дадатковую крыніцу даходаў, будуць мець вельмі непрыемныя наступствы, за ўтойванне звестак права на дапамогу можна пазбавіцца раз і назаўсёды. А атрымаць рэальны малюнак цалкам магчыма. Гэта ў горадзе дзверы зачыніліся, і хто чым жыве — загадка. У вёсках жа вядома ўсё і пра ўсіх, дастаткова выехаць на месца, пагутарыць са старшынёй сельвыканкама, супрацоўнікі ўпраўлення адукацыі аблвыканкама, знайшла свой працяг. Падобныя пісьмы былі разасланы ва ўсе школы, прафтэхвучылішчы, сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Добраахвотнікі-валанцёры дзяжурылі ў выхадныя дні на алеях парку, сачылі за культурай паводзінаў яго наведвальнікаў. У ажыўленых месцах парку з'явіліся памяткі, якія заклікалі людзей захаваць тую прыгажосць, што была створана і прыродай, і стараннем, і ўменнем ранейшых пакаленняў.

— І што змянілася ў парку ў сувязі з вышэйпералічанымі мерапрыемствамі? — пытаюся ў Алега Рыжкова, генеральнага дырэктара дзяржаўнай відовішчнай гісторыка-культурнай установы «Гомельскі палацава-паркавы комплекс».

Не можаш працаваць — шукай

Зрэшты, гэта падстава не адзіная. Часцяком дапамога не прызначалася або прызначалася ўсяго на адзін месяц у выпадках, калі дарослыя і здаровыя члены сям'і не працавалі і не надта хацелі адшукаць сабе пастаянную крыніцу заробкаў.

— Знайсці «лішняе» месца бывае няпроста, — заўважае Таццяна Пузырэўская. — Нягледзячы на тое, што цяпер колькасць вакансій у раёне перавышае колькасць беспрацоўных удвая, мы вымушаны канстатаваць, што дэфіцыт працоўнай сілы назіраецца далёка не ва ўсіх гаспадарках і сельсаветах. Да таго ж ёсць пэўныя праблемы з прапановамі для жанчын. І тым не менш разам са спасылкай на аб'ектыўныя цяжкасці нельга забывацца — чалавек абавязаны імкнуцца палепшыць сваё матэрыяльнае становішча. І калі ўладкавацца праблемна, неабходна звярнуцца па дапамогу ў службу занятасці.

Яшчэ адной «папулярнай» прычынай для адмовы ад адраснай падтрымкі становіцца... нежаданне апрацоўваць уласныя прысядзібныя ўчасткі. Патрабаванне весці гаспадарку датычыцца ўсіх, за выключэннем інвалідаў I і II груп, а таксама асобаў, якія ўжо дасягнулі 70-гадовага ўзросту.

— Гэтыя «фільтры» з'явіліся ў заканадаўстве спецыяльна для гультаёў і аматараў «моцных» напояў, — заўважае Таццяна Пузырэўская. — Дарэчы, для асобаў, якія ўсё ж працуюць, але захапляюцца спіртным, у нас уведзена і правіла кантролю. Чалавек атрымлівае адрасную выплату на пошце, і тут жа яго літаральна брэ «пад руку» прадстаўнік сельвыканкама, школы ці тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання і вядзе заплаціць за камунальныя паслугі, купіць прадукты або іншыя рэчы першай неабходнасці. Бо, на жаль, па-іншаму нельга — ёсць рызыка, што дапамога застанецца ў вінна-гарэлачным аддзеле.

Шоп-тур. Пасля... адмова

Між тым, пазбавіцца права на дапамогу могуць не толькі «птушкі вольнага палёту». Такое ж рашэнне прымаецца ў дачыненні да сем'яў, якія навучаюць дзяцей на платнай аснове або... выязджаюць за мяжу. І, у прыватнасці, у распаўсюджаныя сёння «рэчавыя туры» ва Украіну, скажам, той жа Хмяльніцкі.

— Трэба разумець, што адрасная дапамога аказваецца ў самых крайніх, амаль крытычных выпадках і што, як правіла, гэта «падтрымка на хлеб», — падкрэслівае Таццяна Пузырэўская. — Таму сітуацыя, калі сям'я знаходзіць грошы на аплату за навучанне ці паездку за мяжу, адназначна вядзе да адмовы.

Паміж горадам і вёскай

Увогуле дакументы на адрасную дапамогу трэба падаваць у раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Або ў якасці альтэрнатывы — у філіялы тэрытарыяльнага цэнтра. З улікам вялікіх памераў раёна такія філіялы працуюць у пяці аграгарадках. Прычым надалей колькасць філіялаў будзе ўзрастаць.

— Праблема з дакументамі ёсць толькі адна, — зазначае Таццяна Пузырэўская. — Адрасная дапамога можа прызначацца па месцы як пастаяннага, так і часовага жыхарства. Аднак бяда ў тым, што многія прэтэндэнты на адрасную падтрымку забываюцца аформіць часовую рэгістрацыю, што значна ўскладняе разгляд заваротак, даводзіцца рабіць дадатковыя запыты звестак у іншыя рэгіёны. Таму мы перакананыя, што сітуацыю з рэгістрацыяй трэба ўрэгуляваць і асабліва ў раёнах паблізу буйных гарадоў — міграцыя з сельскай мясцовасці ці наадварот тут значная, а адсюль узнікае блытаніна.

Грошы ёсць, магчымасць — не заўсёды

Традыцыйна няпростая тэма — падрыхтоўка да школы. Яшчэ летась кожнаму выпускніку раёна са шматдзетных сем'яў з мясцовага бюджэту была аказана дапамога ў памеры 200 тыс., а кожнаму першакласніку са шматдзетных сем'яў — у 100 тыс. рублёў. Выплаты тым жа першакласнікам з вялікіх сем'яў плануюць і сёлета. Аднак яны абмяжоўцца 2 базавымі велічынямі — 70 тысячамі рублёў. Прычына? Яна простая. Вырашана, што адрасная сацыяльная дапамога павінна быць асноўнай і па сутнасці... адзінай.

— Вельмі добра, што дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога стала больш важкай, аднак мы ўпэўненыя: паралельна права аказваць дадатковую падтрымку павінны мець і раённыя бюджэты, — лічыць Таццяна Пузырэўская. — Прынамсі, маюцца на ўвазе экстраныя выпадкі, якія заўсёды былі, ёсць і будуць. Ужо сёлета ў нас узнікла такая сітуацыя: здарыўся пажар, цалкам згарэў дом, праз два тыдні памірае бацька, маці з дзіцем-інвалідам на руках застаецца без жылля і сродкаў для існавання. Аднак высветлілася, што даход гэтай маці ўсяго на 1700 рублёў... перавышае «планку» для аказання адраснай дапамогі, і дапамога ёй не прызначаецца. Так, мы знайшлі выйсце, звярнуліся з хадайніцтвам у аблвыканкам, жанчыне выдатквалі 2 мільёны. Але гэта лішнія час, паперы і нервы. Падтрымаць сям'ю можна было б і на месцы, тым больш, што казаць аб вялікіх праблемах з грашыма не выпадала — нягледзячы на свой сельскагаспадарчы напрамак, наш раён не з'яўляецца датацыйным.

Сяргей ГРЫБ.

Магілёўскі раён.

ПАДСВЕТКА, ЛЕБЕДЗІ, ФАНТАНЫ...

У пачатку сёлетняга сакавіка ў Гомельскім парку культуры і адпачынку імя Луначарскага з'явілася група маладых людзей, якія раздавалі наведвальнікам лістоўкі-звароты. У іх утрымліваліся заклікі зрабіць парк узорам культуры паводзінаў, з тым, каб захаваць яго непаўторнае хараство і прыгажосць для будучых пакаленняў, забяспечыць чысціню і парадак.

Ініцыятыва, з якой выступілі супрацоўнікі ўпраўлення адукацыі аблвыканкама, знайшла свой працяг. Падобныя пісьмы былі разасланы ва ўсе школы, прафтэхвучылішчы, сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Добраахвотнікі-валанцёры дзяжурылі ў выхадныя дні на алеях парку, сачылі за культурай паводзінаў яго наведвальнікаў. У ажыўленых месцах парку з'явіліся памяткі, якія заклікалі людзей захаваць тую прыгажосць, што была створана і прыродай, і стараннем, і ўменнем ранейшых пакаленняў.

— І што змянілася ў парку ў сувязі з вышэйпералічанымі мерапрыемствамі? — пытаюся ў Алега Рыжкова, генеральнага дырэктара дзяржаўнай відовішчнай гісторыка-культурнай установы «Гомельскі палацава-паркавы комплекс».

Ён расказвае, што, згодна з адпаведным рашэннем аблвыканкама, парк і музей былі аб'яднаны ў адну вышэйназваную ўстанову, і з гэтага часу тут з'явіліся галоўны ландшафтны архітэктар і дэндролаг. Адным словам, пачалася новая старонка ў жыцці парку, які (і гэта агульнавядома) з'яўляецца ўнікальным разам з палацава-паркавым ансамблем Румянцавых-Паскевічаў не толькі ў Беларусі, але і на ўсёй постсавецкай прасторы. Гэты комплекс іншым разам параўноўваюць з Пецяргофам і Царыцыным, бо тут сабраны помнікі архітэктуры, гісторыі, культуры, археалогіі.

Сёння парк у Гомелі не проста зона адпачынку (дарэчы, летась яго наведала больш за мільён чалавек), а звяно музея, а калі больш дакладна, музей пад адкрытым небам, дзе, згодна з тым жа рашэннем аблвыканкама, вядуцца вялікія работы па рэканструкцыі. Першая чарга закончана, і цяпер працягваюцца работы другой чаргі, на што выдзелены вялікія грашовыя сродкі абласным бюджэтам і Міністэрствам аховы прыроды і навакольнага асяроддзя.

Аб тым, што парк у Гомелі набывае зусім іншы выгляд, сведчаць маштабныя работы, што праводзяцца тут. Вось Лебядзінае возера, якое аднаўляецца сіламі будаўнічага ўпраўлення № 45 адкрытага акцыянернага таварыства «Гомельпрамбуд» і будаўнічай кампаніі «Дэльта». На пляцоўцы я сустрэўся з прадстаўнікамі гэтых арганізацый — галоўным інжынерам Віталем Змушкам і начальнікам участка Канстанцінам Чарнашэем. Яны расказалі, што пасля таго, як з возера была адпампавана вада і выбраны тоўсты пласт мулу, пачалася засыпка дна пяском, на які ляглі бетонныя пліты, каб сюды магла заходзіць тэхніка. Тут прымяняюцца самыя сучасныя тэхналогіі, бо аб'ект — асабліві. Старая падпорная сценка па ўсім перыметры берага (яна з драўляных слупоў і дзе-нідзе падгніла ўжо) выкідваецца — і на яе месцы з'явіцца жалезабетон. Потым работы па ўмацаванні крутых схілаў працягнуць будаўнікі-меліяратары. Возера стане глыбейшым амаль на паўтара метра, і мяркуюць, што яно будзе зарыблена. Дарэчы, вада ў ім адновіцца не з ракі Сож, як планавалася раней, а за кошт ключавой вады з дрэнажных калодзежаў. А што з цар-птушкамі, лебедзямі? Да дзесяці белых прыбавяцца два чорнага колеру. І яшчэ такія прыемныя навіны: на возеры з'явяцца тры плаваючыя фантаны з падсветкай і невялікая воданапорная сістэма. Работы на Лебядзіным возеры запланавана закончыць у маі наступнага года.

З набярэжнай Сожа адкрываюцца воку маляўнічыя краявіды процілеглага берага. Сама набярэжная была пабудавана яшчэ ў савецкія часы, але ў сувязі з развалам адзінай краіны працягнуць яе да аўтамабільнага моста (ледзь не на паўкіламетра) не ўдалося. Цяпер жа гэта будзе зроблена. На рацэ стаіць плавальны кран, які выбірае грунт з сушы, каб набярэжная не рабіла ніякіх зігзагаў. Зрэзаны дзесяткі вербаў, а людзі з той самай «Дэльты» заняты на будаўніцтве фундамента. Работ тут хопіць гады на два. А за пешаходным мостам, што пралёг праз Лебядзінае возера, многія дзесяткі кубаметраў уradлівага грунту дабаўляюцца, замест асфальтаваных дарожак з'яўляюцца пашыраныя дарожкі з тратуарнай плітак, праводзяцца электракамунікацыі для таго, каб устанавіць арыгінальныя светлавыя апоры.

— Гомельскі палацава-паркавы ансамбль, — расказвае Алег Гар'евіч, — з'яўляецца сапраўднай жамчужынай, і да складанай работы па яго рэстаўрацыі запрашаліся спецыялісты з Санкт-Пецярбурга, з іншых гарадоў, у тым ліку і з Кіева. У 2009 годзе з'явіцца пампезная лесвіца ад грота да набярэжнай, будзе ўстаноўлена прыгожая мастацкая агароджа ўсяго парку, заменены газоны, створаны новыя кветнікі, клумбы. Распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя па рэстаўрацыі Зімовага саду і вежы аглядання. У перспектыве — стварэнне двух фантанаў.

— Ёсць чуткі, Алег Гар'евіч, што ўваход у парк будзе платным, што ён будзе закрывацца на ноч...

— У цэнтральнай частцы раней было мноства розных ларкоў. Іх ужо няма, а ў парку забаронена прадаваць алкагольныя напоі, піва, семкі і г.д., ужываць спіртное. Спакой людзей аберагае батальён хуткага рэагавання. У выніку фактаў вандалізму, — калі хто-ніхто ламае дрэўцы, — стала менш. А што да платнага ўваходу, дык ён уводзіўся і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года, і ў 50-я гады. Тэму гэту мы ўзнялі не для зарабляння грошай, а каб захаваць тое, што маем і будзем мець заўтра. Гэта можа быць сімвалічная аплата, як за ўваход у музей, а можа, яе не будзе зусім, калі справы з навядзеннем парадку будуць ісці як сёння.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

УДАКЛАДНЕНЫ ТЭРМІНЫ ЗБОРУ ЯГАД

Як паведамілі «Звяздзе» ў Мінскім вытворчым лесагаспадарчым аб'яднанні, сёння мяркуецца канчатковае прыняцце рашэння аб устанаўленні тэрміну збору дзікарослых ягад — брусніц і журавін — на тэрыторыі сталічнай вобласці.

Са спасылкай на Мінпрыроды наша газета ўжо давала інфармацыю аб устанаўленні такіх тэрмінаў па абласцях, у тым ліку і па Мінскай. Аднак адзначалася, што ў дачыненні да сталічнай вобласці яны папярэднія. Як стала вядома, у рашэнні абласнога выканаўчага камітэта будуць фігураваць наступныя даты, з якіх грамадзяне на законных падставах змогуць збіраць дзікарослыя ягады: брусніцы — з 23 жніўня, журавіны — з 6 верасня. Дарэчы, гэтыя тэрміны супалі з раней апублікаванымі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У ГРОДНЕ ВЫЯВІЛІ... МІНІ-ЗАВОД

Супрацоўнікі УДФР КДК па Гродзенскай вобласці і Гродзенскага РАУС сумесна з пагранічнікамі выявілі міні-завод па вытворчасці фальсіфікаванай гарэлкі, паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Міні-завод размяшчаўся ў адной з кватэр абласнога цэнтра. Аператыўнікі канфіскавалі 110 л спіртазмяшчальнай вадкасці з этыкеткамі «Максімка-2», каля 1 тыс. вінтавых коркаў, 53 шкляныя бутэлькі з гарэлачнымі этыкеткамі «Пшанічная ніва», 100 гарэлачных этыкетак з надпісам «Маскоўская», фільтр тонкай ачысткі, спіртамер бытавы і іншыя прылады.

У цяперашні час па факце праводзіцца праверка.

Ірына ТРУБАЧ, БЕЛТА.

ХМЕЛЕЎСКІЯ СЛАВУТАСЦІ

ЯК ПАДТРЫМЛІВАЦЬ ПАРАДАК У АГРАГАРАДКУ

Адна справа — абсталяваць аграгарадок, адрапартаваць аб здачы, і зусім іншая — паступова прывучаць людзей, выхоўваць іх свядомасць так, каб яны адчувалі, што жывуць не ў ранейшай вёсцы, а ў населеным пункце з асаблівым статусам. Інакш усе намаганні марныя. Фарба і пабелка аблезуць, вуліцы зарастуць, пабудовы вернуцца да ранейшых абрысаў.

Вось і ў Хмелеве, як расказала старшыня сельскага Савета Ірына Андрайчук, па першым часе самым складаным было прывучыць гаспадароў акуратна гнаць кароў па вуліцы. Толькі зусім далёкі ад вёскі чалавек можа падумаць, што гэта не праблема. Калі пасаджаны кветкі на клумбах, выраўнены вуліцы, пастаўлены бардзюры, то дастаткова, каб адзін раз прабеглі каровы, і спатрэбіцца брацца за рамонт зноў. Цяпер у Хмелеве каровы амаль што строем ходзяць. Не, дрэсіроўка не спатрэбілася. Проста пастух і гаспадары кожнай жывёліны суправаджаюць яе і сочаць, каб скаціна не лезла, куды не трэба.

Новую агароджу па першым часе таксама давялося ахоўваць. Былі выпадкі, калі моладзь нападпітку спрабавала дэманстраваць сваю сілу на бетонных пралётах агароджы. Але ўчасткоўвы вельмі хутка выявіў «асілкаў». І пасля таго, як вінаваты ў разбурэнні двух пралётаў заплаціў за аднаўленне дзесяці, ахвотнікаў ламаць агароджу значна паменела.

Цяпер у Хмелеве ўздоўж вуліц цвітуць кветкі. Першы год купілі расаду толькі аднаго віду. «І то пабойваліся, — прызнаецца Ірына Міхайлаўна, — што пакрысе «перамесціцца» грамадская прыгажосць некуды ў асабістыя агародчыкі». Але як сталі цвісці з вясны кветкі, як разбілі клумбы перад кожнай з сацыяльных устаноў, як выйшлі на суботнік па просьбе старшыні сельскага Савета гаспадыні са шматкватэрных дамоў і навокал значна папрыгажэла, — ніхто тых кветак з вуліцы не зачапіў. Сёлета купілі больш відаў. Вырошчваць расаду дапамагае і школа.

Нядаўна сельсавет набыў газонакасілкі, цяпер пастаянна абкошваецца не толькі цэнтральная частка населенага пункта, але і вуліцы. Насельніцтва старэе, некаторыя гаспадары дамоў не могуць нават абкасіць траву вакол сядзібы, даводзіцца дапамагаць. Цяпер клопатам сельсавета стала будаўніцтва агароджы, далейшае добраўпарадкаванне вуліц. Работы хапае. Бо здаць аграгарадок, па глыбокім перакананні кіраўніка мясцовай улады — гэта толькі пачатак справы, далей яго выгляд залежыць ад таго, колькі сілы і сродкаў будзе ўкладзена ў падтрыманне і развіццё.

Свой адбітак на ўклад жыцця вёскі апошняе дзесяцігоддзе накладвае, несумненна, манастыр. Хмелеўскі Свята-Праабражэнскі мужчынскі манастыр вядомы ў Беларусі і за яе межамі. Людзі едуць з рознымі праблемамі з розных гарадоў былога Саюза. А манастыр з аднаго боку жыве сваім жыццём, а з другога — не адарваны ад жыцця вёскі. Былі аднойчы ў сельскага Савета цяжкасці са зборам грошай на грамадска-карысную справу. І сходы, і ўгаворы не мелі патрэбнага выніку. Не прасіла ні аб чым настаяцеля айца Серафіма кіраўнік мясцовай улады — проста той даведаўся ад прыхаджан, як горача абмяркоўваецца пытанне паміж людзьмі. І сказаў падчас пропаведзі ненавязліва і тактоўна, што ўнесці пасільны ўклад у справу добраўпарадкавання сваёй вёскі, справу культуры і знешняга выгляду свайго населенага пункта дастойна кожнага хрысціяніна. І зрушылася з месца, пайшло. З таго часу наогул лягчэй стала арганізаваць людзей на якую-небудзь суполку.

Хмелеўцы вельмі ганарацца сваім манастыром. І не толькі таму, што ён зрабіў вёску знакамітай. Яны лічаць, што буры, іншыя прыродныя ліхаманкі абыходзяць іх край дзякуючы малітвам манахаў. І нават старшыня мясцовага СВК частку поспехаў гаспадаркі звязвае з суседствам манастыра. Не залiло, не засушыла — вось і ўраджай сабралі сёлета па 54 цэнтнеры з гектара. Манастыр і кадравым пытанням гаспадаркі спрыяе. Як? Ужо некалькі сем'яў, якія ў свой час прыехалі шукаць дапамогі ў манастыры, пасяліліся ў Хмелеве, уладкаваліся на працу. Пажылі, папрацавалі побач з манахамі, адчулі духоўную падтрымку і папрасіліся застацца тут. Гаспадарцы такія падыходзяць — яны не п'юць, працуюць сумленна, некаторыя ўжо і жыллё атрымалі.

А манахі дапамагаюць не толькі малітвай, духоўным настаўленнем, але і канкрэтнай справай, а заадно і прыкладам. Пры манастыры ёсць участак зямлі, дзе вырошчваюць бульбу ды іншыя сельгаскультуры. Восенню божыя людзі прывозяць старым адзінокім бабулькам бульбу, агародніну прама на падворак. Яны ўзялі пад сваю апеку таксама могілкі. Сельсавет цяпер толькі турбуецца, калі трэба знайсці тэхніку, каб вывезці смецце ці падвезці якія матэрыялы на могілкі.

Другая славутасць пасля манастыра ў Хмелеве — гэта мясцовая ўрачэбная амбулаторыя. Яе здалі два гады таму, і ад людзей чуюцца толькі падзякі. Вясковая ўстанова абсталявана найноўшай медыцынскай тэхнікай. Ёсць нават свая лабараторыя, дзе можна зрабіць нескладаныя аналізы. У палатах дзённага стацыянара штодзень на кропельніцах і працэдурах знаходзіцца некалькі чалавек. Бабулькі з малых, аддаленых вёсак вельмі ўдзячныя, што ёсць магчымасць падлячыцца, не накіроўваючыся ў раённую бальніцу, куды не заўсёды трапіць проста. І калі раней доктар прыязджаў сюды з горада па графіку, то з 1 жніўня ў Хмелеўскай амбулаторыі працуе малады спецыяліст па размеркаванні. Мы са старшынёй сельскага Савета зазірнулі сюды надвячоркам, калі ў доктара ўжо прыём закончыўся, а была толькі дзяжурная медсястра Алена Грыцук. Алена таксама малады спецыяліст. Дзяўчына вярнулася дадому пасля заканчэння Пінскага медыцынскага каледжа. Работа ёй падабаецца і, галоўнае, з'язджаць куды-небудзь з роднай вёскі Алена не збіраецца. Аб тым, што Хмелева мае перспектыву, гаворыць і той факт, што ў сельсавеце ёсць чарга на жыллё, а ў СВК — чарга на работу. І гэта не прыгарадная вёска, не пасёлак.

А на Хмелева глядзяць і суседзі. Калі ў Падлессі быў сход — сустрэча з кіраўніцтвам раёна, тамтэйшыя вяскоўцы ставілі пытанне, чаму ў іх не будуецца аграгарадок. Старшыня Жабінкаўскага райвыканкама Мікалай Токар падрабязна расказваў людзям пра магчымасці бюджэту раёна, ды і краіны ў цэлым. Гутарка зайшла тады і пра падтрыманне парадку на дварах, сядзібах. Аказалася, і ў Падлессі ёсць прыклад — сям'я Махонькаў. Аляксандра Андрэеўна і Фёдар Лукіч пераехалі ў Падлессе з Гомельшчыны ўслед за дзецьмі, якія трапілі пад адсяленне з забруджаных радыяцыяй раёнаў. Купілі звычайную хатку, давялі яе да ладу, адрамантавалі. Цяпер і дом, і двор патанаюць у кветках. У хаце прыгажэнныя палавікі, пакрывалы — справа рук гаспадыні. А яшчэ Махонькі — нашы адданыя падпісчыкі. Аляксандра Андрэеўна раней на пошце працавала, ужо пятнаццаць гадоў на пенсіі. Гаспадар дома — у мінулым калгасны вадзіцель. Патомныя працаўнікі, у абодвух бацькі на фронце загінулі. «За апошнюю чвэрць веку я ніводнага нумара «Звязды» не прапусціла, — расказвала Аляксандра Андрэеўна, — зараз чытаю ў некалькі этапаў. Адразу праглядваю хуценька па загалоўках, а потым адпачну і бярэся за ўважлівае чытанне. «Самакіраванне» чытаю, асабліва вышукваю матэрыялы з Гомельшчыны, пра радзіму — хочацца хоць у газеце лішні раз углядзець. А самае цікавае пакідаю на вечар». «Вы ж глядзіце там, старайцеся, каб газета наша беларускамоўная жыла, — наказвала на дарогу падпісчыца, — і пра сельсаветы пішыце, пра парадак на зямлі». А яшчэ папрасіла адзначыць як станоўчы момант, што ў вёсцы апошнім часам паставілі кантэйнеры, і гэта паспрыяла чысціні. Што я з задавальненнем і раблю.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Жабінкаўскі раён.

На здымках: Фёдар і Аляксандра МАХОНЬКІ; медсястра Алена ГРЫЦУК.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні;

АНІКЕЕВА Л. А., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце;

САСОНКА М. П., член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК:

Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292 21 03.

МЕДАЛЬНЫ ЗАЛІК

Месца	Краіна	Золата	Серабро	Бронза	Усяго
1.	Кітай	43	14	19	76
2.	ЗША	25	26	27	78
3.	Вялікабрытанія	16	9	8	33
4.	Аўстралія	11	11	12	34
5.	Германія	11	7	8	26
6.	Расія	10	14	18	42
7.	Паўднёвая Карэя	8	10	6	24
8.	Японія	8	6	8	22
9.	Італія	6	6	7	19
10.	Украіна	5	4	8	17
11.	Францыя	4	11	14	29
12.	Румынія	4	1	3	8
13.	Нідэрланды	3	5	4	12
14.	Іспанія	3	4	2	9
15.	Польшча	3	3	1	7
16.	Славакія	3	1	0	4
17.	Канада	2	6	4	12
18.	Кенія	2	3	2	7
19.	Чэхія	2	3	0	5
20.	Ямайка	2	3	0	5
21.	Новая Зеландыя	2	1	4	7
22.	Данія	2	1	3	6
23.	Паўночная Карэя	2	1	3	6
24.	Эфіопія	2	1	0	3
25.	Швейцарыя	2	0	3	5
26.	Грузія	2	0	1	3
27.	Куба	1	5	5	11
28.	**БЕЛАРУСЬ**	**1**	**3**	**7**	**11**
29.	Казахстан	1	3	4	8
30.	Зімбабвэ	1	3	0	4
31.	Азербайджан	1	2	2	5
32.	Нарвегія	1	2	2	5
33.	Славенія	1	2	2	5
34.	Інданезія	1	1	3	5
35.	Балгарыя	1	1	2	4
36.	Фінляндыя	1	1	1	3
37.	Манголія	1	1	0	2
38.	Бразілія	1	0	5	6
39.	Аргенціна	1	0	1	2
40.	Індыя	1	0	0	1
41.	Камерун	1	0	0	1
42.	Панама	1	0	0	1
43.	Тайланд	1	0	0	1
44.	Туніс	1	0	0	1
45.	Венгрыя	0	4	1	5
46.	Швецыя	0	3	0	3
47.	Турцыя	0	2	1	3
48.	Узбекістан	0	1	3	4
49.	Аўстрыя	0	1	2	3
50.	Грэцыя	0	1	2	3
51.	Алжыр	0	1	1	2
52.	Кіргізія	0	1	1	2
53.	Калумбія	0	1	1	2
54.	Літва	0	1	1	2
55.	Сербія	0	1	1	2
56.	Харватыя	0	1	1	2
57.	В'етнам	0	1	0	1
58.	Малайзія	0	1	0	1
59.	Партугалія	0	1	0	1
60.	Сінгапур	0	1	0	1
61	Трынідад і Табага	0	1	0	1
62.	Чылі	0	1	0	1
63.	Эквадор	0	1	0	1
64.	Эстонія	0	1	0	1
65.	ПАР	0	1	0	1
66.	Арменія	0	0	5	5
67.	Тайвань	0	0	2	2
68.	Егіпет	0	0	1	1
69.	Іран	0	0	1	1
70.	Латвія	0	0	1	1
71.	Марока	0	0	1	1
72.	Мексіка	0	0	1	1
73.	Таджыкістан	0	0	1	1
74.	Тога	0	0	1	1

Па стану на 18.00 19 жніўня.

Віншую дарагую матулю, **Рыму Дзмітрыеўну ГАНЧАРОВУ**, з днём нараджэння. Жадаю моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.

Сын Саша, *г. Магілёў.*

У суд Шаркоўшчынскага раёна Віцебскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **ЕРМАЛОВІЧ Яўгеніі Яўгенаўны**, 30 лістапада 1984 года нараджэння, ураджэнкі в. Сцяпянка Мінскага раёна, апошняе вядомае месца жыхарства — г.п. Шаркоўшчына, вул. Красная Горка, 44Б. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Я.Я. Ермаловіч, паведаміць іх суду Шаркоўшчынскага раёна Віцебскай вобласці на адрас: г.п. Шаркоўшчына, вул. 17 Верасня, 8 на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Суд Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці просіць грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра фактычнае месца знаходжання **СЯРГЕЕНКАВАЙ Святланы Пятроўны,** 1971 года нараджэння, ураджэнкі вёскі Дразды Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства і месца знаходжання — вёска Дразды Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці, на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы паведаміць іх суду на адрас: 211200, Віцебская вобласць, г.п. Лёзна, вул. Леніна, д. 100А.

ХАЦЕЛІ ЕСЦІ?

У Пастаўскі аддзел міліцыі звярнулася па дапамогу пенсіянерка, якая заявіла, што ноччу з яе агарода невядомыя скралі 20 кілаграмаў памідораў, 12 кілаграмаў цыбулі і 6 кілаграмаў морквы. Устанавілі, што зрабілі гэта 40-гадовы рабочы і 32-гадовы беспрацоўны.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«УПАЛЯВАНЫ» ПАЛЯЎНІЧЫ

У Жлобінскі раён прыехала на паляванне група мінчан. Недалёка ад вёскі Скепня адзін з іх па неасцярожнасці стрэліў з ружжа ў другога і параніў яго ў правае плячо. Пацярпелы быў дастаўлены ў бальніцу.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Алімпіяда-2008. Спецыяльны карэспандэнт перадае з Пекіна

«ЗОЛАТА» ЁСЦЬ. ШТО ДАЛЕЙ?

Залаты медаль штангіста Андрэя Арамнава павінен быў стаць пралогам для збору беларускай камандай яшчэ большага медальнага ўраджаю. Тым больш, што ён стаў сёмай узнагародай беларусаў на працягу трох апошніх дзён і адзінаццатай на ліку. Хоць па алімпійскім календары для беларусаў учора значылася няшмат дысцыплін, дзе можна было прымкнуць да медальнага пірага і атрымаць з яго кавалак.

Ад сваёй «порцыі» ўжо з самай раніцы адмовілася кідальніца кап'я Наталля Шымчук, якая ў рашэнні кваліфікацыі заняла выніковае 13-е месца, і вымушана была развітацца з марамі аб фінале. Адной з надзей на медаль, прычым няважна якой вартасці, значыўся барэц-вольнік Рызван Гаджыеў (55 кг). Напачатку ён без праблем прайшоў кубінца Майкла Перэса, але ў другой схватцы з узбекам Дзішодам Мансуравым нечакана ўступіў. З-за таго, што спартсмен з Узбекістана не прайшоў далей паўфінала, беларус не трапіў на суцяшальны паядынак, які даваў шанц пазмагацца за бронзавы медаль. Выхад на дзверы быў указаны і яшчэ адной беларускай кідальніцы кап'я Марыне Новік, якая ў кваліфікацыйным турніры заняла толькі 16-е месца.

Паспяхова прайшла першы этап спаборніцтваў прадстаўніца настольнага тэніса Таццяна Кастраміна, якая перайграла ў кваліфікацыйным раўндзе канадку Чанг Мо — (4:0). Усяліў аптымізм у далейшы станоўчы вынік вясляр-адзіночка каноэ Аляксандр Жукоўскі, які чыста выйграў свой кваліфікацыйны заезд на 500 м і прайшоў далей ў паўфіналы. Там жа ён выступіць і на дыстанцыі 1000 м.

Парадавалі стабільным выступленнем весляры Раман Петрушэнка і Вадзім Махнёў на байдарцы-двойцы на дыстанцыі 500 метраў. З вынікам 1:28,661 сек. яны выйгралі свой заплыў і таксама прабіліся ў 1/2 фіналу. Такога ж поспеху на каноэ-двойцы дабіліся і браты Андрэй і Аляксандр Багдановічы.

Не змаглі аказаць дастойнага супраціўлення сваім саперніцам нашы прадстаўніцы сінхроннага плавання, якія ў кваліфікацыйным турніры занялі перадапошняе, 16-е, месца і на гэтым завяршылі свае выступленні.

На жаль, чвэрцьфінальны паядынак беларускіх баскетбалістак з камандай Кітая стаў апошнім на гэтай Алімпіядзе: падначаленыя Анатоля Буяльскага ўступілі гаспадыням 62:77. Дарэчы, у паўфінале кітаянак будзе чакаць зборная Аўстраліі. Чэмпіёнкі свету чвэрцьфінальны паядынак гулялі супраць зборнай Чэхіі і выйгралі з разгромным лікам 79:46. У другой паўфінальнай пары павінны згуляць каманды ЗША і Расіі.

Гаспадары Алімпіяды перамагаюць практычна ва ўсіх відах.

Анатоль БУЯЛЬСКІ, галоўны трэнер нацыянальнай жаночай каманды па баскетболе:

«Тое, што здзейснілі беларускія баскетбалісткі, можна прыраўняць да подзвігу»

Фініш беларускіх баскетбалістак на Алімпійскіх гульнях у Пекіне быў азнаменаваны сустрэчай з камандай Кітая. Пры цяперашніх раскладках сілаў, калі практычна ва ўсіх без выключэння дысцыплінах гаспадары Алімпійскіх гульняў дыктуюць сваю моду і штодня атрымліваюць узнагароды пачкамі, сустрэча Кітай — Беларусь разглядалася не болей, як эксперыментальны матч для накаплення вопыту. Хоць ніхто з беларусак быў не супраць правесці яшчэ адну гульню ў паўфінале. Але ж гэтым марам беларусак не суджана было збыцца: кітаянкі выйгралі чвэрцьфінал 77:62.

Пасля гэтай гульні настаўнік беларускай зборнай выглядаў стомленым, але даволі кантактным.

— Анатоль Сяргеевіч, ці ўскладваліся на гэты матч пэўныя надзеі?

— На выхад у паўфінал? Безумоўна, мы хацелі выйграць. І пачатак сустрэчы паказаў, што з кітаянкамі можна і неабходна гуляць на роўных. Але ж гаспадыні турніру прапанавалі беларускай камандзе высокі тэмп гульні. І замест таго, каб астудзіць іх наступальны пыл, мы пагналіся ліквідаваць разрыў у ачках, які рос часам вельмі імкліва, і не змаглі справіцца з такой раскладкай. Зрэшты, я не хачу зараз, на гарачую галаву, рабіць нейкія кардынальныя высновы і падрабязны аналіз выступлення. Думаю, што трэба час, каб усё ацаніць як належыць.

— У народзе кажуць, што не так страшны чорт, як яго малююць. Калі перафразаваць гэты выраз на алімпійскі лад, ці не страшна было гуляць першы раз на Алімпіядзе?

— Сказаць, што мы прыехалі сюды, і нам мора па калена — нельга. Вядома ж, мы хвалявaліся і да кожнай гульні рыхтавaліся, як да апошняй. Мы ведалі, што алімпійскія гульні — гэта не чэмпіянат Еўропы і не адборачны турнір у барацьбе за алімпійскую пуцёўку. Але ж толькі акунуўшыся ў гэтую атмасферу, адчуваеш ўвесь напал страсцей і барацьбы. Інакш чым патлумачыць сённяшнія памылкі і некаторую нервовасць баскетбалістак?

— Вы маглі б паставіць ацэнку выступленню беларускіх баскетбалістак у Пекіне?

— Мне здаецца, што ставіць сабе адзнакі могуць толькі школьнікі. А калі больш сур'ёзна, то зараз вельмі рана гаварыць аб гэтым. Магу толькі сцвярджаць, што з першага разу на алімпійскім турніры як па нотах не згуляеш. Зразумела, што каманда набралася ў Пекіне бясцэннага вопыту, які ні за якія грошы не купіш. Увогуле, тое, што здзейснілі беларускія баскетбалісткі ў Пекіне, можна прыраўняць да подзвігу. Нават удзел у Алімпіядзе, не гаворачы ўжо пра выхад у 1/4 фіналу — гэта нязбыўная мара многіх камандаў свету.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ, *г. Пекін*

Бернд ШТАНГЕ:

«Растову» трэба паказаць чырвоную картку»

Фота Пятра ФАМІНА.

«Самае вялікае расчараванне за год працы ў Беларусі напаткала мяне ўчора. Гэтага і свет не разумее, як маленькі клуб не адпускае іграка згуляць у зборнай супраць Аргенціны. Ёсць правілы, рэгламент ФІФА і іх трэба выконваць.

А той, хто не вытрымлівае рэгламент, павінен атрымліваць жоўтую або чырвоную картку. І гэтую картку трэба адаслаць у Растоў», — заявіў на прэс-канферэнцыі галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па футболе Бернд Штанге. На таварыскі матч супраць Аргенціны, які пачнецца сёння а 20-й гадзіне на стадыёне «Дынама» ў Мінску, штабу нацыянальнай зборнай удалося сабраць усіх наймацнейшых на цяперашні момант ігракоў. У тым ліку мае жаданне згуляць і Аляксандр Кульчы, аднак яго клуб «Растоў» сёння праводзіць гульню ў чэмпіянаце Расіі, і клубнае кіраўніцтва не жадае адпускаць іграка.

Бернд Штанге паведаміў, што ёсць невялікія праблемы ў цэнтры абароны, астатнія ж пазіцыі ў беларускай дружыны двойчы застрахаваныя. У саперніка галоўны трэнер вылучыў выдатную камбінацыйную гульню і выкарыстанне кожнага шанцу для гола. «Я не думаю, што ў нас ёсць нейкія перавагі перад зборнай Аргенціны. Я бачыў аргенцінскіх футбалістаў у кубкавых гульнях падчас нядаўняга візіту ў Лондан — яны ў выдатнай форме. Але тыя, хто кажа, што памылкова гуляць з такой моцнай камандай, няхай супакояцца. Няхай мы правалімся, спатыкнёмся, але гэта не праблема. Мы не баімся зборнай Аргенціны, мы паважаем яе. Я думаю, аргенцінцы таксама ведаюць вынікі нашых матчаў са зборнымі Галандыі, Турцыі, Германіі, і ўсведамляюць, што прыйдзецца ім няпроста».

Трое ігракоў клуба БАТЭ запрошаны ў зборную. Гэта Сяргей Верамко, Ігар Стасевіч і Віталь Радзівонаў. Праўда, апошні знаходзіцца ў Берліне на рэабілітацыі пасля траўмы. Вельмі вырас як ігрок, заўважыў нямецкі спецыяліст, за апошні час Сяргей Верамко. Увогуле Бернд Штанге выказаў меркаванне, што БАТЭ зараз стаіць на парозе самай гучнай клубнай сенсацыі.

Ігракі прыехалі ў штаб зборнай пазаўчора ўвечары. Пасяліліся беларускія футбалісты ў гасцініцы «Вікторыя», аргенцінскія госці — у гасцініцы «Еўропа». Перад пачаткам матча, як мы паведамлялі раней, сярод балельшчыкаў будуць разыграны веласіпеды, матацыклы і аўтамабіль «Кіа», а федэрацыя футбола ўрачыста ўшануе футбалістаў, якія правялі больш за 25 матчаў за нацыянальную зборную і пакінулі спорт.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Уладальнік Кубка Стэнлі Бен Клаймер будзе выступаць за мінскае «Дынама»

За яго плячыма сем сезонаў у наймацнейшай Нацыянальнай хакейнай лізе.

Пяць з іх 30-гадовы нападаючы правёў у «Тампе», з якой у 2004 годзе заваяваў Кубак Стэнлі. Яшчэ два гады Клаймер выступаў за «Вашынгтон». Усяго ў НХЛ на рахунку хакеіста 438 матчаў, 129 ачкоў і 367 хвілін штрафу. У мінулым сезоне гулец абараняў колеры клуба Амерыканскай хакейнай лігі «Хершы Бэарз».

Аляксандр ШУСТЭР, *«Мінск—Навіны».*

ТОЕ Ж І ФУТБОЛ

Тэлесеткі

Да ўвагі гледачоў: сёння, 20 жніўня, у праграме тэлеканала «ЛАД» адбыліся аператыўныя змяненні. Вячэрні эфір цяпер выглядае наступным чынам:

19.40. Маст.фільм «Будулай, якога не чакаюць» (Расія). 1-я і 2-я серыі.
21.55. «Тэлебарометр».
21.55. «Экспедыцыя» (паўтор).
22.00. Футбол. Таварыскі матч. Расія — Галандыя (у запісе).
23.50. Алімпійскія гульні. Пекін-2008. Агляд дня (у запісе).
1.00 Алімпійскія гульні. Пекін-2008. Баскетбол. 1/4 фіналу (у запісе).

ПІНГВІН — РЫЦАР

Сімвал нарвежскай арміі імператарскі пінгвін па імені Нільс Олаф, які жыве ў заапарку шатландскага горада Эдзінбург, узведзены ў рыцарскае званне. Новыя рэгаліі пінгвіну дараваў кароль Нарвегіі Харальд V, паведамляюць інфармацыйныя агенцтвы.

etoday.ru

На тэрыторыі заапарка адбылася ўрачыстая цырымонія. Нільс Олаф, які мае званне палкоўніка каралеўскай гвардыі Нарвегіі, цяпер мае права называцца «сэрам».

Яшчэ ў 1972 годзе малодшы лейтэнант каралеўскай гвардыі Нарвегіі Нільс Эгільен, убачыўшы пінгвінаў у заапарку Эдзінбурга, угаварыў сваё начальства ўзяць шэфства над птушкамі. Аднаго з іх аднапалчане нарвежца назвалі Нільсам Олафам (у гонар Эгільена і караля Нарвегіі Олафа) і прысвоілі яму званне капрала. З тых часоў кожны год у жніўні імператарскі пінгвін праводзіць агляд нарвежскіх гвардзейцаў, для чаго тыя спецыяльна прыязджаюць у Эдзінбург.

За доўгія гады паспяховай службы Нільсу Олафу падаравалі два медалі, а ўлады Эдзінбурга паставілі антарктычнай птушцы помнік. Птушка-талісман памерла ў 1987 годзе ў званні сяржанта. На яго месца прызначалі двухгадовага самца. У параўнанні з папярэднікам яго кар'ера складвалася больш паспяхова. У 1993 годзе Нільс Олаф II атрымаў званне палкавога старшыны, у 2001-м — ганаровага палкавога старшыны, а тры гады таму стаў палкоўнікам. У гонар гэтай падзеі была наладжана ўрачыстая цырымонія. Нарвежскія афіцэры спецыяльна прыбылі ў Шатландыю, каб аддаць чэсць крылатаму афіцэру.

«Усе рапарты сведчаць аб яго вельмі добрых паводзінах і выдатным нясенні службы ў заапарку», — растлумачыў прысваенне звання палкоўніка пінгвіну Нільс Эгільен, які сам даслужыўся толькі да маёра.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
объекта долевого строительства

Застройщик – закрытое акционерное общество «ИНСЕРВИССТРОЙ»;
220036, г. Минск, ул. Р. Люксембург, 147-1.
УНН – 101225557. ОКПО – 37445837.
Режим работы для приема заявлений – с 9 до 18 часов.
Телефоны: (017) 213 51 52; 208 56 41.

Государственная регистрация: зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом, решение от 27 января 2000 г. № 93 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101225557.

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведению инженерных изысканий для этих целей» № 02250/0264380 действительна до 14.05.2012 г.

В течение предыдущих трех лет инвестиционные проекты строительства предприятием не реализовывались.

Цель строительства – исполнение проекта по инвестиционному договору № 6 от 16.06.2005 г. о реализации права на проектирование и строительство объекта **«Многоквартирный жилой дом № 24 по генплану в микрорайоне «Сухарево-4» со встроенными помещениями многофункционального назначения».**

Объект долевого строительства – здание жилого дома размещается во Фрунзенском районе, не относится к жилым домам повышенной комфортности, запроектировано из двух 6-этажных и двух 7-этажных жилых секций с подвалом и техническим чердаком. Высота этажей – 3,0 м, подвального – 3,0 м. В подвале размещены семь блоков помещений многофункционального назначения и помещение товарищества собственников. В подвальной части со стороны дворовой территории размещены: электрощитовая, тепловой узел и водомерный узел. Количество квартир в доме – 96, в том числе: однокомнатных – 38, двухкомнатных – 27, трехкомнатных – 31. Общая площадь квартир – 6119,83 кв.м. Лоджии застеклены. Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас, стены – газосиликатные блоки, наружная отделка – краска фасадная акриловая, штукатурка декоративная полимерная. Окна из профиля ПВХ с двухкамерными стеклопакетами, двери наружные – металлические. Внутренняя отделка стен и перегородок – штукатурка без чистовой отделки.

Начало строительства – октябрь 2007 года.
Окончание строительства – IV квартал 2008 года.

Данные о правах Застройщика:
- решение Мингорисполкома № 2017 от 06.09.2007 г. об изъятии, предоставлении и передаче в аренду земельных участков, разрешении строительства и реконструкции объектов и № 1502 от 11.07.08 г. в части размещения на 1-м этаже в секциях №№ 3 и 4 административных помещений вместо ранее запроектированных квартир. Свидетельство № 500/938-375 о государственной регистрации земельного участка;
- заключение государственной экологической экспертизы № 167-2007 от 22.03.2007 г.;
- заключение Белгосэкспертизы № 1278-5/07 от 08.06.2007 г.

Производство строительно-монтажных работ разрешено инспекцией Департамента Госстройнадзора по г. Минску за № 2-208Ж-111/07 от 10.10.2007 г.

Строительство жилого дома осуществляет ЗАО «Инсервисстрой».

Договоры создания объекта долевого строительства заключаются на:

• Два административных помещения, расположенных на 1-ом этаже в секциях №№ 3 и 4.

Стоимость одного квадратного метра общей площади помещения в текущих ценах составляет:
- 5 066 400,0 белорусских рублей;

Площадь помещений: 121,65 м²; 89,16 м².

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, помещение товарищества собственников.

Информацию об объекте долевого строительства и ходом работ по его строительству можно получить по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 147. Тел.: (017) 213 51 52, 208 56 41.

УНН 101225557

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

25 сентября 2008 года в 11. 00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, проводит аукцион по продаже объекта, находящегося в республиканской собственности, и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания.

На аукционные торги выставляется предмет аукциона, включающий:

Капитальное строение (конюшня) (инв. № 600/С-94999), расположенное по адресу: Минская область, Минский район, д. Лисовщина, 1938 года постройки, общей площадью 254,9 кв.м. Одноэтажное, фундамент железобетонный, стены – кирпичные столбы с бревенчатой забиркой, перекрытия деревянные, крыша двухскатная, шиферная, вентиляция – естественная, инженерные коммуникации отсутствуют, и **право заключения договора аренды земельного участка, площадью 0,2952 га, сроком на 30 лет.**

Условия использования земельного участка – для строительства и обслуживания деревообрабатывающего цеха.

Начальная цена предмета аукциона 29 593 898 рублей (в том числе: имущество – 13 765 564 рубля и право заключения договора аренды земельного участка – 15 828 334 рубля).

Сумма задатка предмета аукциона 2 000 000 руб.

Продавец имущества: Республиканское унитарное сельскохозяйственное производственное предприятие «Племптицерепродуктор «Правда», расположено по адресу: Минская область, Минский район, д. Чачково, 50 25 242, 50 25 241.

Арендодатель земельного участка: Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским райисполкомом решения о представлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка;

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды.

После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» **№ 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.**

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявок 22 сентября 2008 г. до 17.00.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

23 сентября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, проводит открытый аукцион по продаже объекта республиканской собственности, и права заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания с установлением начальной цены продажи объекта, равной одной базовой величине на дату продажи, составляющих единый предмет аукциона.

На аукционные торги выставляется:

Сведения об объекте, место нахождения	Основные характеристики объекта	Площадь земельного участка, отведенного для обслуживания объекта, га	Срок аренды земельного участка, лет	Начальная цена предмета аукциона, руб. (в т.ч. объекта)	Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка, руб.	Сумма задатка предмета аукциона, руб.
Не завершенное строительством капитальное строение – здание детского сада, расположенное по адресу: Минская область, Смолевичский район, д. Барсуки	Фундамент – бетонные блоки, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные. Степень готовности 42 %, двухэтажное, общая площадь строения 1782,1 кв. м. Строительство велось в период с 1988 по 1990 гг.	0,4762	50	3 829 710 (одна базовая величина, установленная на дату проведения аукциона)	3 794 710	1 500 000

Условия использования земельного участка: для размещения объектов общественного, жилого, административного, физкультурно-оздоровительного назначения.

Продавец недвижимого имущества: Республиканское унитарное производственное предприятие «Экспериментальная база «Жодино», расположенное по адресу: Минская область, Смолевичский район, д. Барсуки, тел. (801775) 20536, 20578.

Арендодатель земельного участка: Смолевичский районный исполнительный комитет.

Условия участия в аукционных торгах: осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте; создание покупателем не менее 3-х рабочих мест; запрещена продажа покупателем, иное отчуждение объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

К участию в аукционных торгах допускаются негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Смолевичским райисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды земельного участка.

3. После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2 но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 27 февраля 2007 г. № 108 и согласно Положению о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» **№ 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.**

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявок 19 сентября 2008 г. до 17.00.

Прапаршчык — штурман-«тысячнік»

Прапаршчык міліцыі, прадстаўнік Чыгуначнага аддзела г. Віцебска Дэпартамента аховы МУС Аляксандр Арлоў у якасці штурмана-памочніка экіпажа камбайна стаў першым «тысячнікам» у Віцебскім раёне.

Бацька і сын АРЛОВЫ.

Аляксандр ужо не першы год падчас водпуску працуе разам з бацькам у ЗАТ «Альгоўскае». Прапаршчык — хлебароб у трэцім пакаленні. Яго бацька, Віктар Арлоў, адзін з лепшых камбайнераў у краіне. Сын, дарэчы, дапамагае бацьку і араць зямлю, рыхтаваць глебу да будучага ўраджаю.

Кіраўнік ЗАТ «Альгоўскае» Цімур Надзірашвілі вельмі задаволены работай сямейнага экіпажа. І па месцы асноўнай працы прапаршчык мае добрую рэпутацыю.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *Віцебскі раён.*

РЭГІСТРАЦЫЯ ШЛЮБУ Ў... НОВЫМ ЗАМКУ

У Авальнай зале Новага замка, дзе напрыканцы XVIII стагоддзя размяшчалася каралеўская прыёмная, цяпер можна зарэгістраваць шлюб. Гэта ініцыятыва адміністрацыі ЗАГСа Ленінскага раёна абласнога цэнтра была падтрымана кіраўніцтвам Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.

Аб сваім жаданні зарэгістраваць шлюб у Каралеўскім палацы (дадатковая плата за цырымонію ў гэтым славутым месцы складае 120 тысяч рублёў) трэба заявіць пры падачы дакументаў у ЗАГСе. Першыя пары, якія ўжо скарысталіся такой унікальнай магчымасцю, ставілі свае подпісы на фоне афортаў вядомага мастака Ван Дэйка, якія цяпер дэманструюцца ў Авальнай зале.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

СВЯТА МЁДУ Ў «ЗАДЗВІННІ»

У віцебскім цэнтры народных рамёстваў і мастацтваў «Задзвінне», што ў гістарычным кутку на беразе Заходняй Дзвіны, прайшоў кірмаш-выстава «Мядовы спас».

На падворку цэнтра, нягледзячы на вялікую спякоту, было шмат гасцей. Людзі выстройваліся ў чэргі, каб купіць па вельмі прывабнай цане мёд і іншыя прадукты пчалярства. Прадавалі таксама і «мядовыя» сувеніры. Дзятве асабліва спадабаліся адкрытыя для прагляду дамкі з мноствам пчол. Майстры народных рамёстваў і прафесійныя мастакі прадавалі свае творы. Самадзейныя артысты весялілі прыпеўкамі. Нагадаю, што менавіта ў «Задзвінні» на мінулым міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ўпершыню працаваў «Горад майстроў». Цяпер тут праводзяць самыя розныя цікавыя мерапрыемствы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ХТО ПРАКТЫКАВАЎСЯ З РТУЦЦЮ?

Такое пытанне паўстала перад работнікамі міліцыі пасля таго, як да іх звярнулася гамяльчанка. А яе справа заключаецца ў тым, што ў час замены ўваходных дзвярэй у кватэру ў абшыўцы старых была выяўлена ртуць. Выкліканыя спецыялісты з абласнога ўпраўлення МНС, як нам паведамілі кіраўнік яго прэс-цэнтра Руслан Габрылёў, канстатавалі: канцэнтрацыя небяспечных пароў ртуці каля дзвярэй як унутры кватэры, так і на лесвічнай пляцоўцы, у 15—17 разоў перавышала яе дапушчальны ўзровень.

Гаспадыня кватэры (прадпрымальніца) выказала меркаванне, што, магчыма, тут не абышлося без яе канкурэнтаў, якім удалося нейкім чынам упырснуць ртуць у абшыўку дзвярэй. А можа, гэта суседскія дзеці забаўляліся? Сказанае — толькі здагадкі, вядома. Супрацоўнікі ж упраўлення зрабілі сваю справу як належыць, правёўшы дэмеркурызацыю.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

СВАЯ КАСАВІЦА

Вясковыя гаспадары задаволеныя ўласнымі ўраджаямі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сабранае на ўласных сотках збожжа ўжо заняло пачэснае месца ў бочках у кладоўцы МарыіАнуфрыеўны. Гаспадыня заплаціла сельскай гаспадарцы за абмалот: сёлетні кошт — 2 тысячы рублёў за сотку.

— Гэта цалкам нармальная цана, — запэўнівае пенсіянерка. — Цяпер бохан хлеба ў краме каштуе да паўтары тысячы. Так што ўсё прымальна.

— Давайце падлічым разам, — прапануе старшыня Вішоўскага сельскага Савета Наталля Галуза. — Напрыклад, я маю 20 сотак і заплачу за абмалот 40 тысяч рублёў. Пры сярэдняй ураджайнасці я атрымаю, скажам, 700 кілаграмаў збожжа. Набыць яго я змагу не меней чым за 200 тысяч. Так што выгада відавочная!

Паводле рашэння «Калгаса «Радзіма», які абмалочвае большасць надзелаў у Вішоўскім сельсавеце, жніво для ветэранаў і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны цалкам бясплатнае. Гэтай паслугай правамерна карыстаецца Цімафей Ягоравіч Сіняўскі.

На цяністай вясковай вуліцы сталы селянін з камфортам уладкаваўся на выцягнутым са старога аўтамабіля крэсле. Ён з задавальненнем азіраецца на ўласны ўчастак зямлі: каля ўжатых палосак на брызенце сушыцца пад спякотным жнівеньскім сонцам сабраная пшаніца.

— Так, мне 86 гадоў, але як сапраўдны калгаснік меней за 50 сотак я не засяваю, — хваліцца энергічны ветэран. — Сёлета вельмі добры ўраджай: для маіх курэй корму хопіць на цэлы год. І я вельмі рады за ўсю нашу сельскую гаспадарку!

Бялыніцкі «Калгас «Радзіма» шчыльна падышоў да завяршэння жніва. Засталося працы толькі на паўтара дні, але і яна пакуль адсунута, бо яравой пшаніцы яшчэ патрабуецца трохі часу для выспявання.

— Мы задаволеныя сёлетняй уборачнай кампаніяй, — сказаў кіраўнік гаспадаркі Аляксандр Лапацентаў. — Намалацілі амаль 11 тысяч тон збожжа, ураджайнасць — 50 цэнтнераў з гектара. На адным дыханні нашы людзі ўзяліся і адпрацавалі. Я вельмі ўдзячны працаўнікам: не было ні наймалога парушэння дысцыпліны, а было поўнае ўзаемаразуменне. Таму нездарма мы вырашылі аднавіць даўнюю традыцыю нашай гаспадаркі: калі жніво завершыцца, накрыем сталы проста на хлебным полі і адсвяткуем, з песнямі пад гармонік. Але пакуль яшчэ трэба папрацаваць...

Сем калгасных камбайнаў ад пачатку тыдня рушылі на прыватныя палеткі вяскоўцаў: за кожнай вёскай замацавана тэхніка і адказны супрацоўнік бухгалтэрыі.

Схема працы простая: загадзя людзі звярталіся ў калгас і паведамлялі аб сваім жаданні абмалаціць участак. Ехаць нікуды не трэба: дастаткова тэлефанавання, каб у патрэбны час пад'ехаў камбайн. Разлік на месцы, бухгалтар прыме аплату па ведамасці. Калі гаспадар здае ў калгас малако, то магчымы ўзаемаразлік.

— На тэрыторыі нашага сельсавета трэба абмалаціць прыкладна 1800 прыватных участкаў, — паведаміла Наталля Галуза. — Калі сухое надвор'е яшчэ пратрымаецца, то на гэтым тыдні ўборачная кампанія ў прыватным сектары і завершыцца.

Людзі, зразумела, хочуць паласці ўраджай у свае кладоўкі як мага хутчэй. Кожны гаспадар хвалюецца, спяшаецца і з трывогай глядзіць нават на самую бясшкодную хмарку на небе. Аднак, па вялікім рахунку, жніво на прысядзібных участках, прынамсі ў Вішоўскім сельсавеце, усе апошнія гады праходзіць паспяхова, без нараканняў.

Вельмі задаволена сваім ураджаем і сама старшыня сельскага Савета. Наталля Васільеўна, якая жыве ў вёсцы Лямніца, атрымала з уласнага поля 1,5 тоны збожжа. І, прызнаецца, радасна абдымала ўсе свае 22 мяхі.

— Так, не магла нарадавацца на свой ураджай! — смяецца жанчына. — У мяне ў гаспадарцы ёсць конь, карова, парася, качкі, куры. У маёй сям'і свая харчовая праграма, і будзьце ўпэўненыя, што мы яе выканаем!

Увогуле ў Магілёўскай вобласці ўборачная кампанія на прысядзібных участках распачалася ад выхадных дзён і ідзе цяпер поўнай хадой ва ўсіх сельскіх раёнах.

Як паведамілі ў аддзеле расліназводства Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама, на раніцу 19 жніўня было ўбрана 5 тысяч гектараў прыватных надзелаў, што складае 16 працэнтаў ад неабходнага. У лідарах па ўборцы ў прыватнікаў — Чэрыкаўскі, Касцюковіцкі, Глускі раёны.

У агульным хлебным пірагу, дзе складаецца намалот ад усіх катэгорый сельскіх гаспадарак, прысядзібныя надзелы важаць 9—10 працэнтаў. Паводле прагнозаў, жніво ў вяскоўцаў працягнецца яшчэ з тыдзень.

Ілона ІВАНОВА,
Бялыніцкі раён — Магілёў.

Ветэран з Аніськаўшчыны Цімафей Ягоравіч СІНЯЎСКІ ганарыцца добрым ураджаем пшаніцы.

КАМБАЙН З ПОЛЯ — У АГАРОД

На Брэстчыне жніво падыходзіць да завяршэння. На полі засталіся лічаныя дзялянкі. Намалочана больш за 1 мільён 200 тысяч тон збожжа. Але названая лічба будзе большай, калі дадаць сюды ўраджай з асабістых падворкаў вяскоўцаў. А малацьба на ўласных падворках працягваецца. Як правіла, камбайны пасля заканчэння работы на палях сельгаспрадпрыемстваў накіроўваюцца на прысядзібныя ўчасткі, каб абмалаціць вырашчанае.

Так было і ў сельгаскааператыве «Хмелева» Жабінкаўскага раёна. Гаспадарка сёлета атрымала рэкордны ўраджай і выйшла на першае месца ў раёне. Экіпаж камбайнераў Дзмітрыя Ляшко і Сцяпана Кавальчука на машыне ДОН-1500 сабраў 650 тон збажыны ў СВК, а затым прыступіў да абмалоту надзелаў вяскоўцаў.

З ранку выглядалі камбайн калгасныя ветэраны Любоў Маркаўна і Мікалай Максімавіч Кацэвічы (на здымку). І нарэшце велізарны агрэгат завярнуў на іх падворак. За лічаныя хвіліны іх ніўка ператварылася ў зярняты і бункеры саломы. Машына акуратна ссыпала збожжа на прыгатаваную посцілку і рушыла далей. Пенсіянеры засталіся задаволеныя: будзе прыбаўка да корму хатняй скацінцы і птушцы. Цэны ж на платную паслугу гаспадаркі прымальныя — паўтары тысячы рублёў за сотку плошчы абмалочанай збажыны.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Фота Святланы КРАЎЧУК.

Незаконны алкаголь

ПАЛЯВАННЕ НА САМАГОНШЧЫКАЎ

Міністэрства ўнутраных спраў не дае спуску самагоншчыкам і прадпрымальным асобам, якія нелегальна рэалізуюць моцнаградусныя напоі.

Толькі ў гэтым паўгоддзі было канфіскавана 1 млн 22 тыс. літраў самагону і самагоннай брагі. Летась за аналагічны перыяд — 621 тыс. літраў. Паводле слоў выконваючага абавязкі начальніка міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Аляксандра БАРСУКОВА, органы ўнутраных спраў праводзяць мэтанакіраваную работу па барацьбе з вышэйзгаданымі «прадпрымальнікамі». Прычым у цесным супрацоўніцтве з ляснікамі, а таксама Дзяржаўнай інспекцыяй жывёльнага і раслінnага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, паколькі вытворцы самагону сышлі з прыватных падворкаў у лясныя масівы.

Літаральна ў мінулым месяцы з інспекцыі жывёльнага і раслінnага свету паступіла інфармацыя аб тым, што ў Мядзельскім раёне адзін «прадпрымальнік» займаецца самагонаварэннем, маштаб якога вымяраецца 14 тонамі брагі, 465 літрамі самагону, 30 мяхамі мукі і цукру, 2 скрынямі дражджэй, якія былі адабраны ў парушальніка закона.

Такія «вытворчасці» наносяць каласальны ўрон навакольнаму асяроддзю. Як правіла, міні-фабрыкі размяшчаюцца ў такіх месцах, куды, што называецца, на легкавушцы не пад'едзеш. Для гэтага прасякаюцца спецыяльныя прасекі, губіцца лес, а разам з ім пасля і іншая навакольная раслінnасць, той жа ручай ці рака, у якую зліваецца брага... Не так даўно зафіксаваны выпадак высечкі ажно 28 дрэў, за якія злачынцы «атрымалі» 16 млн рублёў штрафу.

Але ж наяўнасць самагонных фабрык — бяда не толькі для рыбы і раслін. Той, хто набывае іх «прадукцыю», нават не ўяўляе сабе, наколькі рызыкуе жыццём (пра здароўе ў дадзеным выпадку гаварыць ужо не даводзіцца). У самапал для большага градуса дадаюць і курыны памёт, і пластмасу, і якіх там толькі хімікатаў часам не знойдзеш! А ўмовы, у якіх адбываецца вытворчасць? А стан здароўя гэтых самагоншчыкаў, на якіх без болю глядзець немагчыма?..

Пасля ўжывання прадукту з рук апошніх чалавек не проста п'янее, ён літаральна дурэе... А за гэтым добра праглядваецца і іншая праблема. Рост бытавой злачыннасці, няшчасных здарэнняў, ад якіх можа пацярпець як сам аматар моцнаградусных напояў, так і іншыя людзі. Нездарма ў некаторых сельскіх рэгіёнах на тэрмін уборачнай увогуле забаронена рэалізацыя спіртных напояў пасля пэўнага часу.

У гэтым паўгоддзі ў стане алкагольнага ап'янення было ўчынена ў цэлым на 3 працэнты менш злачынстваў, а ў грамадскіх месцах — на 9,6 працэнта менш, чым за тыя ж паўгода летась.

Менш становіцца і выпадковых атручэнняў алкаголем. Ужо ў 2006 годзе было на 10 працэнтаў менш, чым у папярэднім, у 2007-м — на 17. У сярэднім жа за год да гэтага паніжэння ў нас гінула каля 3 тысяч чалавек. Такім чынам, Беларусі пакуль удаецца не дапускаць такіх масавых атручэнняў «паленым» алкаголем, як гэта мае быць у той жа Расіі. Тым не менш нават уратаваныя ад нашумелых атручэнняў у тых жа Смалявічах моцна скарацілі сабе жыццё.

— Зразумела, што чалавек, які выпівае, выпіваць будзе, — кажа Аляксандр Пятровіч. — Але нашы метады барацьбы дазваляюць выкрываць не проста незаконныя крыніцы даходу пэўных асобаў, але ратаваць жыццё людзям, паколькі мы канфіскуем у нелегальных гандляроў і цалкам атрутныя рэчывы — усялякія «кірушкі», «максімкі», шклоачышчальнікі і г.д., якія завозяцца з Расіі, хаваюцца разам з прадуктамі харчавання ў фурах. Дарэчы, наколькі больш мы адбіраем гэтай атруты, настолькі расце рэалізацыя моцнаградусных напояў ва ўстановах гандлю. На працягу апошніх трох гадоў рэалізацыя спіртных напояў у магазінах прырастае ў агульнай складанасці да 10 працэнтаў. Гэта значыць, што пітушы чалавек спажывае больш якасныя напоі...

Мяркуецца, што кожны ўчастковы інспектар павінен ведаць, хто ў яго на ўчастку гоніць самагон і што з «выкрабленага» ідзе на продаж, гэтаксама як і ляснік павінен ведаць месцы работы самагонных «фабрык». У адваротным выпадку можна сказаць, што яны не на сваім месцы, мяркуе Аляксандр Барсукоў. Ён нагадвае, што пры продажы нават адной бутэлькі самагону «прадпрымальнай» асобе пагражае сур'ёзны штраф, памер якога залежыць ад канкрэтных абставінаў. Наогул, згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (арт. 12.27 «Незаконныя ўвоз, перавозка, захоўванне алкагольных напояў і тытунёвых вырабаў, вытворчасць, перапрацоўка і захоўванне этылавага спірту і тытунёвай сыравіны і продаж алкагольных напояў уласнай вытворчасці»), прадугледжаны штраф у памеры да 10 базавых велічынь. Паводле Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 11 «Аб удасканаленні дзяржаўнага рэгулявання вытворчасці, абароту і рэкламы алкагольнай, нехарчовай прадукцыі з утрыманнем спірту і нехарчовага этылавага спірту», за вытворчасць і перапрацоўку прадугледжаны штраф да 100 базавых велічынь, за рэалізацыю — да 10. Аднак калі ў выніку спажывання гэтай «атруты» хтосьці пацярпеў ад цяжкіх цялесных пашкоджанняў або меў факт гібелі чалавека, прадугледжана крымінальная адказнасць (Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 144 «Прычыненне смерці па неасцярожнасці») — абмежаванне волі тэрмінам да пяці гадоў або пазбаўленне волі на той жа тэрмін.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Простыя рэчы

ЦЭМЕНТ

Фота Пятра ФАМІНА.

Узнікла патрэба адрамантаваць лазню, хлеў. Неабходны мех цэменту. Абзваніў крамы — няма. У адной прапанавалі стаць на чаргу. Прыйдзе вагон — прададуць. Дэфіцыт цэменту. І гэта радуе — значыць, людзі будуюцца. Будуецца вёска, па прэзідэнцкай праграме ўзнікаюць і ў Пастаўскім раёне калі яшчэ не аграгарадкі, то прыгожыя новыя вуліцы на цэнтральных сядзібах сельгаскааператываў. Будуецца сам райцэнтр, які шырыцца і прыгажэе з кожным годам. Пасля пэўнага перыяду заняпаду, звязанага з расфарміраваннем і вывадам шматлікіх вайсковых часцей, Паставы сёння набылі новае дыханне.

Будуюцца дачныя пасёлкі ў надазёрных вёсках. Нядаўна мой стрыечны брат пахваліўся: узяў падрад на ўзвядзенне падмурка пад дачу ў надазёрнай вёсцы. А напарнік ад работы адмовіўся. Дык прыступіў да працы адзін — ад юначых гадоў па будоўлях, колькі гэтага цэменту ў руках пераняньчыў — цяжка падлічыць. Сам уладкаваў апалубку пад падмурак. Адзін замешваў раствор, адзін заліваў. І нічога, справіўся. Хаця пацягацца давялося. Каб не звычка — выйшла б гэта бокам. А ўцягнуўшыся — нічога. Цэмент трэба ўмець і размяшаць, каб раствор быў надзейны, каб не перабольшыць пяску. Пасыплецца падмурак — нядобрым словам успомніць твае работу гаспадар. Ды, паўтару, для брата гэта ўсё звычнае. Нядаўна ў Паставах ён выкладаў дом для аднаго заказчыка. З блокаў. Але ж два паверхі і яшчэ трэці падстрэшак. І пілаваць блокі даводзілася. А галоўнае — раствор замешваць. Тут патрэбен і цэмент добры, і пясочак прасеяны. Сам раствор замешвалі ў бетонамяшалцы, а вось падавалі яго на рыштаванні ў вёдрах спецыяльным калаўротам. Нічога, ладны дамок узняўся. Будуць жыць людзі, будзе доўга стаяць на ціхай вуліцы напамінак руплівасці братавых рук. А другі брат у Мінску таксама спрычыніўся да цэменту. У яго афіцыйна зарэгістраванае прадпрымальніцтва. Прымае заяўкі і дастаўляе на будоўлі пад Мінскам гатовы ўжо раствор. І бізнэс ідзе, праўда, у апошні час з'явілася шмат канкурэнтаў. Але ж і будаўніцтва катэджаў пад Мінскам не спыняецца, людзі хочуць мець прыватныя дамы.

Цэмент вядомы чалавеку даўно. Гэта парашкападобныя вяжучыя рэчывы, якія з вадою ўтвараюць пластычную масу, а потым і камянеюць. Прамысловая яго вытворчасць пачалася ў XIX стагоддзі. Але вядомы быў, безумоўна, раней. Ёсць жа ў лаціне caementum, што азначае — друз. А ў нямецкай мове — Zement.

Цэмент... А як жа — успомніў. Уладзімір Караткевіч. Яго «Чорны замак Альшанскі». Там жа Вітаўт Альшанскі прыдумаў для свайго ворага Валюжыніча і жонкі Гардзіславы лютае пакаранне. Замураваў іх у сутарэннях замка. Знайшоў.

«Вось так, — далятае зверху голас, — тут вам і ложніца, тут вам і жыць, і скончыцца. Вада там, у куце, капае са столі, там цэбар стаіць. Бачыце, я вас акрутне — жорстка ды люта — не замардаваў... І хата раскошная, акругле сем сажняў. Ну вось, будзеце вы там вартаўнікамі, і жывым вас не даклікацца.

Пачынае звужацца больш светлая пляма над галовамі. Чуваць глухі звон апаленай плінфы аб другую. Шорганне кельмы аб камень.

І цемра...»

Замуравалі. І такім растворам, што на стагоддзі. У тым жа рамане паводле аўтара рэшткі закатаваных знаходзяць праз стагоддзі. І зноў успомнілася пра цэмент. Аляксандр Твардоўскі. Ён напісаў гэты верш, калі пры Хрушчове ў СССР нішчылі помнікі Сталіну. Быў такі час, такая эпоха. Дык вось у Твардоўскага:

Дробится рваный цоколь
монумента,
Взвывает сталь отбойных
молотков,
Крутой раствор особого цемента
Рассчитан был на тысячи веков.
Все, что на свете сделано руками,
Рукам под силу обратить на слом,
Но дело в том,
что сам собою камень —
Он не бывает ни добром, ни злом.

Разумныя словы. Практычна наш зямляк многае бачыў наперад, многае разумеў. І ў сваіх вершах перад смерцю многае здолеў сказаць. Але іх, надрукаваўшы, неяк прытушавалі, пастараліся забыць.

І сапраўды, цэмент, змяшаны з вадою і пяском, у рэшце рэшт становіцца проста каменем. Гэта можа быць помнік якому-небудзь правадыру. Гэта можа быць вязніца. Ды звычайны дом. Як ёсць у нашых Паставах такі, пабудаваны самохаць адным з былых дзеячаў. Дом мае шэры колер цэменту і выбудаваны ў выглядзе сярэднявечнага замка, дзе не вокны, а байніцы, дзе і жыць сучаснаму чалавеку ці прыдатна.

Некалі была працяглая камандзіроўка ў Верхнядзвінскі раён, на Асвейшчыну, спрэс спаленую фашыстамі ў час вайны. Цяжкія ўражанні засталіся ад гэтай паездкі. Цэлы край быў вынішчаны, практычна не ацалелі жыхары — і дзеці, і старыя. Едзеш вясной — і толькі дзе-нідзе ў лесе раптам сустракаеш здзічэлую яблыню ці грушу. Значыць, тут была некалі вёска. І толькі ў Хатыні прачытаеш на плітах назвы гэтых вёсак. А пліты цяжкія, цэментаваныя.

З цэменту і іншых інгрэдыентаў камень робяць менавіта чалавечыя рукі.

Ёсць у слова цэмент і іншыя значэнні. Цэментам называюць касцявую тканку, якая пакрывае корань і шыйку зуба. Ды і наколькі ведаю, раней і пламбавалі зубы з выкарыстаннем нейкіх рэчываў, падобных на цэмент.

У пераносным сэнсе цэмент — тое, што злучае каго-небудзь і што-небудзь.

З цэментам мне ў сваім жыцці таксама давялося нямала пацягацца. Але асаблівыя ўспаміны аб арміі. Два разы на год, калі заканчваўся перыяд вайсковай вучобы, пачыналіся тыдні так званых гаспадарчых работ. У гэты час куды салдат толькі ні трапляў!

Ёсць успаміны прыемныя. Двойчы прывозілі нас працаваць на мінскі завод «Крышталь». Не ведаю, як цяпер, а тады ён размяшчаўся недалёка ад стадыёна «Дынама». Вось гэта была праца! Мы разбівалі і грузілі на машыны старую цэментаваную муроўку. Цяжкавата, ды і пыльна. Але ж затое — абед. У часць не адвозілі, кармілі на месцы. І тут, як казаў адзін знаёмы мне дырэктар спіртавога завода: «Быць у Рыме і не пабачыць папу...» Наліваласа нам чарачка, і не адна. А спрытнейшыя траплялі і ў сутарэнні завода, дзе можна было прадэгуставаць рознага.

Гэта прыемна. А некалькі разоў кідалі нас на разгрузку вагонаў з цэментам на чыгуначную станцыю. Вось тут ужо добрае пекла. Мала таго, што цяжка, але ж і пыл душыць. І вярнуўшыся ў казарму — дзе ты памыешся? Толькі каля рукамыйніка. І завяршу пра цэмент і армію. Неяк летам нам аб'явілі, што дывізію павінен наведаць тагачасны міністр абароны СССР Грэчка. Пачаўся ўсеабдымны «шмон». Стаіць цэлы дзень заліўны дождж. Літаральна стаіць сцяной. А мы заліваем-бетануем дарожкі. Нейкі начальнік палічыў, што да прыезду міністра яны павінны быць на цэнтральнай алеі новыя. Прыгналі вялікую сушылку з авіяцыйным рухавіком. Яна дае такі моцны струмень гарачага паветра, што дождж да зямлі не даходзіць. Але ж ён мочыць нас, а гарачае паветра проста перахоплівае дыханне. Аднак зацэментавалі, прывялі ўсё ў адпаведны поглядам начальства выгляд. Праўда, Грэчка так і не прыехаў.

Бетон — гэта будаўнічы матэрыял, атрыманы з зацвярдзелай сумесі пяску, гравію, шчэбеню з цэментам і вадой. Паходзіць слова з французскага beton. Гэта моцны будаўнічы матэрыял. Асабліва для дарог, нават узлётна-пасадачных палос. Расказваюць, што шыкоўныя бетонкі ў Германіі, так званыя аўтабаны. Відаць, што так, не бачыў. А вось першую бетонку мы пабачылі каля роднага гарадка яшчэ ў канцы шасцідзесятых гадоў мінулага стагоддзя. Адкуль яна ўзнікла ў правінцыі ды яшчэ ў тыя гады? Дзякуючы ракетнай дывізіі, якая дыслакавалася ў Паставах і ваколіцах. Гэта была дарога! Тады пра асфальт яшчэ і не думалі, у райцэнтры на вуліцах ляжаў брук, а то і проста грунтоўка. А тут шырокая бетонка, якая цягнулася ад гарадка некалькі кіламетраў у лес, дзе стаяла вайсковая часць, дзе стаялі ракеты. Мы прыязджалі на гэту бетонку, як на экскурсію. На роварных рамах прывозілі сюды дзяўчат, каб проста пракаціць іх па бетонцы «з ветрыкам».

Недзе ж у гэты час узнікла і бетонная ўзлётна-пасадачная паласа на ваенным аэрадроме каля Пастаў. Яна потым некалькі разоў перараблялася ў сувязі з тым, што мянялася, цяжэла тэхніка, самалёты, што садзіліся на яе. Цяпер гэту бетонку разабралі. І жалезабетоннымі плітамі, якім зносу няма, высланыя многія дарожкі ў райцэнтры.

Некалі, у час навучання на літфаку ўніверсітэта, па праграме савецкай літаратуры 20-х гадоў павінен быў прачытаць раман Фёдара Гладкова «Цэмент». Прызнаюся, не чытаў, ды і аднакурснікі таксама. Хапала іншага цікавейшага чытання. Раман, праўда, гарталі, каб на экзамене не трапіць у непрыемнае становішча. Пра аднаўленне прамысловасці пасля грамадзянскай вайны, вобраз перадавога рабочага і гэтак далей. Увогуле тады такая літаратура была моднай. Што? Нават лірык Ясенін тады напісаў:

Как в смирительную рубаху
Мы природу берем в бетон.

А ўвогуле для мяне слова цэмент найбольш асацыюецца са словам сяброўства. Яно самае надзейнае, калі сцэментаванае агульнымі клопатамі, пачуццямі, перанесенымі выпрабаваннямі.

Алесь КАСЦЕНЬ.
г.Паставы.

У БЯРОЗАВЫМ ГАЁЧКУ

Лясніцтва ў вёсцы Дабрамысль Лёзненскага раёна, акрамя непасрэдных абавязкаў, займаецца ўпарадкаваннем зоны адпачынку на Дабрамысльскім вадасховішчы, стварае пляцоўкі для турыстаў, альтанкі, масткі, лаўкі. З вясны па восень на маляўнічым беразе заўсёды шмат наведвальнікаў, таму для захавання прыроды на дапамогу работнікам лесу ідзе школьнае лясніцтва. Не першы год доўжыцца цеснае супрацоўніцтва. У гэтыя дні брыгада школьнікаў пад кіраўніцтвам настаўніка працы Івана Петухова ўзводзіць комплекс альтанак па ўласным праекце. Юныя будаўнікі выкарыстоўваюць матэрыялы лесу толькі з адходаў дрэваапрацоўкі і стараюцца не нанесці шкоды зялёнай зоне. Яны ўпэўненыя, што адпачываючыя ацэняць іх намаганні, будуць берагчы ўзведзенае дзіцячымі рукамі, паважна ставіцца да хараства роднай прыроды.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ляснічы Мікалай ФЕДАРЭНКА наведвае куток лясной зоны адпачынку, дзе працуюць старшакласнікі Дабрамысльскай школы Алег МІНАЕЎ, браты Дзяніс і Канстанцін САКАЛОВЫ, іхні настаўнік працы Іван ПЕТУХОЎ.

ТВАЕ ПРАВЫ
Інфармацыя. Парады. Дапамога.
№ 6 (10)

Рэха публікацыі

Адпраўленне пасажыраў арганізавана па-новаму. Але апошнія далёка не ўсім задаволены

У нумары газеты ад 17 чэрвеня пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» была змешчана скарга пасажыраў, якія карыстаюцца паслугамі сталічнай аўтастанцыі «Аўтазаводская». У прыватнасці, пасля праведзенай тут рэканструкцыі металічная агараджа вакол кожнай платформы знікла, самі платформы сталі карацейшымі і больш шырокімі, чым дагэтуль. З-за гэтага цяпер пасажыры пры чаканні свайго рэйса ўтвараюць не чаргу, а натоўп. Але самае галоўнае — маршруткі на прыгарадныя напрамкі «выдалілі» на некалькі крайніх платформаў перона. Раней яны спыняліся на тых жа платформах, што і рэйсавыя аўтобусы. Пра такі перанос ведаюць не ўсе, скардзіліся нам, вось і кідаюцца з канца ў канец перона. Ды і памянёныя платформы знаходзяцца на рагу будынка аўтастанцыі, дзе многія якраз і накіроўваюцца на перон, што ў гадзіны пік вядзе да ўзнікнення ўсё таго ж натоўпу...

Выступленне газеты было разгледжана ў транспартным камунальным унітарным прадпрыемстве «Мінсктранс».

«Зараз на аўтастанцыі «Аўтазаводская» завяршаецца рэканструкцыя, якая не толькі змяніла знешняе і ўнутранае аблічча аўтастанцыі, але і дазволіла па-новаму арганізаваць адпраўленне пасажыраў ад аўтастанцыі.

Да правядзення рэканструкцыі на пероне адпраўлення мелася 8 платформаў, якія былі абнесены агароджамі. Пры правядзенні рэканструкцыі агароджы зрэзаны і платформы развернуты ў іншы бок, што выключыла магчымасць узнікнення дарожна-транспартных заторaў пры ўездзе і выездзе з платформаў адпраўлення і ДТЗ пры правядзенні пасадкі.

Таксама павялічана колькасць платформаў адпраўлення з 8 да 11, што дало магчымасць разгрузіць платформы, якія маюцца. Раней частыя адпраўленні аўтобусаў і невялікі інтэрвал паміж адпраўленнямі выклікалі збор вялікай колькасці людзей на малой прасторы, у выніку — скаргі і нараканні з боку пасажыраў. Зараз пасажыры раўнамерна размеркаваны па ўсім пероне.

На аўтастанцыі для аўтобусаў малой умяшчальнасці выдзелены 4 платформы (8, 9, 10, 11). Гэта выклікана тым, што аўтобусы вялікай і малой умяшчальнасці маюць адзін і той жа маршрут і ў рэйс адпраўляюцца з інтэрвалам у 5 хвілін, і арганізаваць іх адпраўленні з адной платформы не ўяўляецца магчымым.

У бліжэйшы час на аўтастанцыі «Аўтазаводская» будуць устаноўлены платформенныя ўказальнікі і на платформах 8—11 для зручнасці пасажыраў будуць указаны не толькі назва маршрута, але і расклад руху».

P.S. «Арганізаваць адпраўленне ад адной платформы не ўяўляецца магчымым...». Раней, яшчэ да рэканструкцыі, такая магчымасць была, а цяпер знікла. У мінулай публікацыі мы мімаходзь закраналі такі бок пытання (які, як нам здаецца, мае месца быць) як канкурэнцыя паміж дзяржаўнымі і недзяржаўнымі перавозчыкамі. Зараз «маршрутачнікі» самі абілечваюць пасажыраў. У мінулы раз галоўны інжынер філіяла «Мінскі аўтавакзал» Уладзімір Іваніс нам так і сказаў: калі вашы заяўнікі выказваюць незадаволенасць, няхай пішуць, каб уладальнікі маршрутак заключалі дагаворы з аўтастанцыяй на продаж білетаў на іх рэйсы праз касы. Але чаму пасажыры павінна нешта пісаць? Найперш ім павінна быць зручна, а як такія камфортныя ўмовы забяспечыць — сумесная справа і аўтастанцыі, і тых самых «маршрутачнікаў», ці не так?

І яшчэ пра «раўнамерна размеркаваных па ўсім пероне пасажыраў». Не ведаю, як мінулую публікацыю чыталі спецыялісты, але там людзі якраз і скардзіліся, што пасля ўсіх вышэйпералічаных новаўвядзенняў на аўтастанцыі падчас чакання рэйсаў утвараецца натоўп — менавіта на тых платформах, дзе зараз могуць спыняцца маршруткі...

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ходзяць чуткі, што...

«ХУТКАЯ ДАПАМОГА» БУДЗЕ АБСЛУГОЎВАЦЬ ТОЛЬКІ ЭКСТРАНЫЯ ВЫКЛІКІ

Як патлумачыла нашай газеце намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла Жылевіч, у гэтых чутак ёсць рэальная глеба. Ні для каго не сакрэт, што вельмі часта служба хуткай дапамогі выконвае неўласцівыя ёй функцыі: выязджае да хворых з прастудай, абвастрэннем хранічных захворванняў, радыкулітам, галаўным болем, артэрыяльным ціскам, знімае ЭКГ, займаецца абязбольваннем і транспарціроўкай пацыентаў. Дакладна вызначаных крытэрыяў для выкліку хуткай медыцынскай дапамогі ў нас няма. І ў 64 працэнтах выпадкаў «хуткая дапамога» выконвае абавязкі амбулаторна-паліклінічнай службы. Але хуткая дапамога — гэта, у першую чаргу, экстраная дапамога, таму яна павінна працаваць у «рэжыме чакання». Як нам гэтага дасягнуць?

Мы збіраемся падзяліць усе брыгады на брыгады, якія аказваюць неадкладную і хуткую (экстраную) дапамогу. Неадкладная дапамога будзе «прывязана» да паліклінічнай службы, але на якасці аказання медыцынскай дапамогі гэта ніяк не адаб'ецца. Брыгады неадкладнай дапамогі будуць аснашчаны таксама як і лінейныя. Эксперымент па ўвядзенні брыгад неадкладнай медыцынскай дапамогі праводзіўся ў Мінску, Брэсцкай і Віцебскай абласцях і цалкам сябе апраўдаў. За кошт зніжэння колькасці выклікаў па неадкладных паказаннях і, адпаведна, нагрузкі на «хуткую дапамогу» аператыўнасць выезду яе брыгад павысілася з 92 да 99 працэнтаў. Паводле дзеючага нарматыву, у выпадку экстранага выкліку на ўвесь шлях ад падстанцыі «хуткай дапамогі» да пацыента адводзіцца ў межах горада максімум 15 хвілін і 30 хвілін — у сельскай мясцовасці.

Але хачу падкрэсліць, што гаварыць пра нейкія канкрэтныя тэрміны раздзялення традыцыйнай структуры службы хуткай дапамогі пакуль што заўчасна. Сёння мы працуем над нарматыўна-прававой базай, пры падрыхтоўцы якой улічваюцца ўсе складаныя пытанні, з якімі давялося сутыкнуцца ў ходзе эксперыменту. Зразумела, што пры кожнай урачэбнай амбулаторыі ў сельскай мясцовасці нельга арганізаваць пост неадкладнай медыцынскай дапамогі. Таму агульнага для ўсіх рэцэпта не будзе. На тэрміны ўвядзення сістэмы раздзялення брыгад будуць уплываць таксама і тэмпы мадэрнізацыі лячэбна-прафілактычных устаноў. Нельга скідваць з рахункаў і наяўнасць ці адсутнасць кадраў. А для службы хуткай дапамогі гэта вельмі актуальная праблема.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:

Функцыі брыгады хуткай дапамогі — дарожна-транспартныя здарэнні, раптоўныя захворванні, якія пагражаюць жыццю пацыента, няшчасныя выпадкі, цяжкія траўмы і атручэнні, падзенні з вышыні, сардэчныя прыступы, надзвычайныя сітуацыі.

Функцыі брыгад неадкладнай дапамогі — аказанне неабходнай дапамогі даросламу насельніцтву пры вострых і абвастрэннях хранічных захворванняў, выклікі для транспарціроўкі хворых у стацыянар, для абязбольвання анкалагічных хворых.

«ВЯСКОВЫЯ» ДАПЛАТЫ: БЮДЖЭТ АБО... ПРЫБЫТАК

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Парушэнні наймальнікамі заканадаўства, нізкая кваліфікацыя кадравікоў, несвоечасовае павышэнне іх кваліфікацыі плюс недахоп спецыяльнай літаратуры. Усё гэта — прычыны. Што ж да наступстваў, то імі становяцца просьбы патлумачыць той або іншы «працоўны» нюанс. І чым буйнейшы горад — тым большая колькасць падобных зваротаў. Прычым, як давялося пераканацца падчас чарговай «выязной прыёмнай» Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў Бабруйску, пералік найбольш папулярных тэмаў тут быў і застаецца практычна нязменным — гэта водпускі, заробкі і пенсіі.

Водпуск пераносіцца па згодзе

Працоўны водпуск быў запланаваны на жнівень. Як мае быць, у гэтым месяцы работнік піша заяву, атрымлівае адпускныя, аднак... у апошні дзень тэлефануе майстар цэха і патрабуе заўтра з'явіцца на сваім месцы. Бо ідзе адпачываць зусім іншы чалавек.

— Паколькі водпуск ужо прадастаўлены, то адклікаць з яго можна толькі з пісьмовай згоды самога работніка, — падкрэслівае кансультант-дзяржінспектар Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Марына Грышукевіч. — Прычым у выпадку адмовы ўжыць якія-небудзь «санкцыі» да работніка тут немагчыма.

Істотным парушэннем з'яўляецца і адвольнае «ссоўванне» графікаў водпуску па жаданні кіраўніцтва. У такім выпадку, раіць Марына Грышукевіч, лепш за ўсё паспрабаваць усё ж дамовіцца з наймальнікам. А калі не атрымаецца — можна звярнуцца ў дзяржінспекцыю працы. Бо законная падстава для пераносу ёсць толькі адна — зноў-такі двухбаковая згода наймальніка і работніка.

Між тым, таксама «летняе» пытанне — якой павінна быць працягласць водпуску ў работніка, які заняты ўсяго на 0,25 стаўкі? А адказ тут наступны: працягласць будзе такой жа, як і ў работніка на поўную стаўку. Іншая рэч, што «чвэрцьставачнік» мае меншую зарплату. А значыць, яму налічаць і меншыя адпускныя.

Скараціць і прыняць немагчыма

У нечым тыповая сітуацыя. Вадзіцелю пагражае скарачэнне. Як тут быць?

— Кіраўнік можа прыняць рашэнне аб скарачэнні, — кажа Марына Грышукевіч. — Аднак, па-першае, пры гэтым работніку неабходна прапанаваць усе магчымыя вакансіі. А па-другое, трэба мець на ўвазе, што пасля скарачэння наймальнік не мае права ўвесці «ліквідаваныя» пасады на працягу пэўнага часу. Калі ж пасаду скарацяць, а праз два дні ўвядуць зноў, работнік зможа аднавіцца праз суд з аплатай вымушанага прагула і кампенсацыяй маральнага ўрону.

Адмовіўся? Рыхтуйся да... звальнення

Завод мае шмат заказаў і хоча змяніць дзвюхзменны рэжым работы на трохзменны. Ці можа работнік адмовіцца ад выхадаў у трэцюю змену? І што будзе вынікам такой адмовы?

— Змяніць рэжым работы наймальнік мае права, праўда, пры гэтым яму давядзецца абгрунтаваць прычыны і папярэдзіць аб новай раскладцы за 1 месяц, — падкрэслівае Марына Грышукевіч. — Што ж да адмовы ад 3-й змены, то ў такім выпадку наймальнік можа работніка звольніць з выплатай 2-тыднёвай дапамогі. Адно, што прыцягваць да работы ў 3-ю змену (інакш кажучы, да работы ноччу) можна далёка не ўсіх — скажам, гэтага нельга рабіць у дачыненні да інвалідаў, якія маюць медыцынскія проціпаказанні.

Калі сапсуецца станок

Раптоўная паломка абсталявання — адзін з тых самых «вытворчых момантаў». Як кажуць, усё можа быць. Аднак пытанне тут у іншым: як усё ж павінен аплачвацца час вымушанага прастою?

— Час вымушанага прастою аплачваецца ў памеры 2/3 тарыфнай стаўкі, — адзначае Марына Грышукевіч. — І гэта — абавязковая мінімальная планка. Прычым аплата можа быць і большай, аднак пры адной вельмі істотнай умове — адпаведным запісе ў калектыўным дагаворы.

Цяжарная? Выпрабаванне не прайшла...

Маладая жанчына ўладкавалася ў прыватную фірму з выпрабавальным тэрмінам. Да заканчэння тэрміну выпрабавання застаецца адзін дзень, і ўсё б нічога. Аднак раптам кіраўніцтва даведваецца: жанчына — цяжарная. А вынікам становіцца звальненне.

— Нягледзячы на тое, што фармальна звальненне адбылося пасля заканчэння тэрміну выпрабавання, тут ёсць магчымасць звярнуцца на працягу месяца ў суд з патрабаваннем як аднаўлення на працоўным месцы, так і кампенсацыі маральнага ўрону, — мяркуе Марына Грышукевіч. — У суд трэба прадставіць копію загаду аб прыёме на работу, копію загаду аб звальненні і матывіроўку таго ж звальнення. А далей усё будзе залежаць ад вынікаў разбору. Прычым на карысць цяжарнай жанчыны могуць пайсці многія рэчы, і ў тым ліку — адсутнасць дысцыплінарных спагнанняў ці нават... выдача той або іншай прэміі. Бо прэмія з'яўляецца пацвярджэннем таго, што працоўныя абавязкі выконваліся добрасумленна.

Прафагляд ідзе ў лад?

Паводле спецыфікі дзейнасці, чалавек мусіць праходзіць рэгулярныя медыцынскія агляды. Працяглы час усё было добра. Аднак на апошняй камісіі з'явілі ся прэтэнзіі да зроку, і цяпер існуе верагоднасць адхілення ад выканання ранейшых працоўных абавязкаў. Між тым, сам работнік з заключэннем урачоў не згодны і лічыць, што ён бачыць добра. Як быць?

— Аспрэчыць заключэнне медыкаў могуць толькі медыкі, таму ў выпадку нязгоды застаецца хіба што звяртацца ў больш высокія інстанцыі — аж да Міністэрства аховы здароўя, — заўважае Марына Грышукевіч. — Аднак тут, нягледзячы на нібыта адсутнасць якіх-небудзь праблем з вачамі, неабходна памятаць адну рэч — падчас аглядаў медыкі не проста канстатуюць цяперашні стан зроку, але і прагназуюць, як на гэтым працоўным месцы зрок можа змяніцца ў будучыні. Таму сэнс прыслухацца да парады ўрача, як правіла, ёсць. Тым больш, што пры звальненні з-за дрэннага здароўя наймальнікам павінны прапаноўвацца «прымальныя» вакансіі. І толькі калі прымальных месцаў не акажацца, адбудзецца звальненне з выплатай 2-тыднёвай дапамогі.

Спрэчкі вырашаюцца праз суд

Грамадзянін заключыў дагавор падраду на выкананне будаўнічых работ. Работы былі выкананыя. Аднак заказчык адмаўляецца падпісаць адпаведны акт і заплаціць грошы.

— Дзейнасць па грамадзянска-прававых дагаворах не падпадае пад працоўнае заканадаўства, адпаведна, усе спрэчныя моманты тут неабходна вырашаць толькі праз суд, — зазначае Марына Грышукевіч. — Адно, што варта нагадаць: у дадзеным выпадку трэба звярнуцца ў суд па месцы знаходжання арганізацыі на працягу 3 гадоў. Прычым да іскавай заявы трэба дадаць копіі дагавораў падраду, а надалей будуць прымацца пад увагу вынікі экспертызы выканання работ ці, як варыянт, паказанні сведак.

«Кантрактнік» мае... перавагі

На рабоце робіцца павелічэнне зарплаты «кантрактнікам». Аднак гэта не датычыцца работнікаў, якія занятыя па бестэрміновых працоўных дагаворах. Ці ёсць тут парушэнне?

— Хутчэй за ўсё, ніякага парушэння тут няма, — тлумачыць начальнік упраўлення працы і зарплаты Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама Ірына Фабрыстава. — Справа ў тым, што ў заканадаўстве сапраўды прадугледжана магчымасць павелічэння заробкаў толькі «кантрактнікам», інакш кажучы, гэта рашэнне зусім не абавязкова павінна распаўсюджвацца на «бестэрміноўшчыкаў».

Не менш цікавае пытанне — даплаты за работу ў сельскай мясцовасці. Каму яны павінны рабіцца?

— Даплаты за работу ў сельскай мясцовасці абавязкова робяцца работнікам некаторых бюджэтных устаноў, скажам, настаўнікам або урачам, — тлумачыць Ірына Фабрыстава. — Пры гэтым можа рабіцца такая даплата і пазабюджэтнікам. Аднак толькі за кошт прыбытку. Такім чынам, у дадзеным выпадку ўсё залежыць ад фінансавага стану кожнай канкрэтнай арганізацыі.

Нарэшце, яшчэ адзін няпросты момант. Работніцы маюць адзін разрад, выконваюць аднолькавыя абавязкі, аднак атрымліваюць розныя прэміі і, адпаведна, розныя заробкі? Ці правільна гэта?

— Гэта пытанне рэгулюецца палажэннем аб прэміяванні, якое распрацоўваецца ў кожнай канкрэтнай арганізацыі і ўплываць на якое адкуль-небудзь звонку нельга, — зазначае Ірына Фабрыстава. — Словам, змяніць «правілы гульні» тут можна зноў-такі толькі на ўзроўні арганізацыі. Пры гэтым ёсць два шляхі — або настаяць на новаўвядзеннях падчас заключэння наступнага калектыўнага дагавора, або звярнуцца ў камісію па працоўных спрэчках.

Калі аднойчы мала...

Маці адна выхоўвае дзіця, якое часта хварэе. Зарплата невялікая, таму жанчына вырашыла звярнуцца па адрасную сацыяльную дапамогу. Такую дапамогу сапраўды аказалі, аднак кардынальна сітуацыю гэта не змяніла. Што рабіць?

Адзін з варыянтаў тут відавочны — звярнуцца ў службу занятасці з просьбай падшукаць іншую, больш «грашавітую» работу. Аднак калі знайсці прывабнае месца ўсё ж не атрымаецца, ёсць сэнс зноў напісаць заяву на... адрасную сацыяльную дапамогу. Праўда, ужо не на штомесячную, а на аднаразовую. Прынамсі, з улікам стану здароўя дзіцяці прыняць рашэнне аб прадастаўленні «паўторнай» дапамогі ў раёне сапраўды могуць.

Сведкі плюс архіў

Пенсійная тэма была і застаецца актуальнай заўсёды. Вось распаўсюджаны выпадак. Пенсія была прызначана ў 1992 годзе выходзячы з заробкаў за 24 месяцы. Ці можна ўзяць для вызначэння індывідуальнага каэфіцыента нейкі іншы час?

— Пенсіі, што былі прызначаны да 2000 года, сапраўды магчыма пераразлічыць — выходзячы з заробкаў за любыя 5 гадоў запар з 15 апошніх гадоў работы, — распавядае намеснік старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама Вера Шлапакова. — Пры гэтым для пераразліку трэба звярнуцца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы свайго жыхарства. Аднак, зразумела, што пры звароце неабходна прадставіць зместкі аб заробках за выбраныя 5 гадоў.

І яшчэ адна даволі распаўсюджаная праблема. Якім чынам можа быць залічаны ў стаж работа ў калгасе ў пасляваенны час ва Украіне, калі ніякіх пацвярджальных дакументаў ужо няма — ёсць толькі сведкі?

— Для таго, каб камісія па прызначэнні пенсій залічыла гэтыя гады ў стаж, неабходна прадставіць не толькі паказанні сведак, але і дакумент з калгаса ці архіва аб тым, што зместкі сапраўды не захаваліся, — тлумачыць Вера Шлапакова. — Прычым без такога дакумента перагляд пенсійнай справы, на жаль, немагчымы.

Сяргей ГРЫБ.

Мінск—Бабруйск.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Бытавыя фільтры не выклікаюць змянення мікраэлементнага саставу вады

Наш даўні чытач і падпісчык мінчанін Пётр Андрэевіч Навуменкаў, як і многія іншыя гараджане, выказаў сумненне ў быце фільтры для водаправодных вады са зменнымі картрыджамі (не праточнага тыпу). Гэтыя картрыджы час ад часу трэба мяняць. У чытача ўзнікае пытанне: ці праўда, што такія фільтры акрамя ўласна шкодных прымесяў затрымліваюць і карысныя для арганізма чалавека солі, якія ўтрымліваюцца ў пітной вадзе, робяць яе «збяднелай»? Ці так гэта насамрэч? Пётр Андрэевіч прасіў парады: магчыма, трэба выкарыстоўваць нейкія пэўныя фільтры, якія не «збядняюць» ваду, ці рабіць што іншае? Чытач цікавіўся меркаваннем спецыялістаў па гэтай праблеме.

Рэдакцыя ў пошуках адказу мусіла звярнуцца ў ДУ «Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя». «На ваш запыт паведамляем, што фільтры бытавыя не праточнага тыпу са зменнымі картрыджамі адносяцца да фільтраў для механічнай ачысткі пітной вады. Яны прызначаны для выдалення з яе цвёрдых часцінак, пяску, завісі, іржы. Дадзеныя фільтры не выклікаюць змянення мікраэлементнага саставу вады.

Змена картрыджаў прадугледжваецца патрабаваннямі тэхнічных умоў і інструкцый па эксплуатацыі ўказаных фільтраў. Пры выкарыстанні картрыджа звыш устаноўленага ліміту яго фільтрацыйныя ўласцівасці губляюцца, што павялічвае рызыку пагаршэння якасці вады, якая праходзіць праз фільтр, у сувязі з магчымасцю павелічэння на ўнутранай паверхні колькасці мікраарганізмаў.

Больш глыбокая ачыстка вады дасягаецца пры выкарыстанні больш дарагіх фільтраў, у якіх выкарыстоўваецца з'ява зваротнага осмасу. Як правіла, такія фільтры не маюць зменных элементаў, бо абсталяваны сістэмай аўтаматычнай прамыўкі. Але пры гэтым метадзе фільтрацыі сапраўды адбываецца «вымываннe» пэўнай колькасці карысных мінеральных кампанентаў, якія ўтрымліваюцца ў вадзе.

Лічым, што бытавыя фільтры для пітной вады трэба набываць толькі пры неабходнасці дадатковай яе ачысткі. Пры гэтым неабходна строга кіравацца рэгламентам змены картрыджаў і іншымі патрабаваннямі, указанымі ў інструкцыі па эксплуатацыі фільтра».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Кансультацыя натарыуса

БАЦЬКІ ПАВІННЫ ПАКРЫВАЦЬ ВЫДАТКІ ДЗЯРЖАВЕ, ЯКАЯ ЎТРЫМЛІВАЕ ІХ ДЗЯЦЕЙ

З 1 студзеня 2007 года дзейнічае Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у неспрыяльных сем'ях» ад 24 лістапада 2006 года. Указаным нарматыўным актам прадугледжаны выпадкі, пры якіх дзеці нядбайных бацькоў могуць быць прызнаныя маючымі патрэбу ў дзяржаўнай абароне, адабраныя ў бацькоў і змешчаныя на дзяржаўнае забеспячэнне без звароту ў суд. Такое адбываецца, калі бацькі вядуць амаральны лад жыцця, з'яўляюцца хранічнымі алкаголікамі ці наркаманамі або іншым чынам неналежна выконваюць свае абавязкі па выхаванні і ўтрыманні дзяцей, у сувязі з чым яны знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Больш падрабязна пра такія сітуацыі сёння чытачам расказа намеснік загадчыка першай Мінскай гарадской дзяржаўнай натарыяльнай канторы Веранікі ЛІТВІНКА.

ВЫКАНАЎЧЫ НАДПІС — РАСПАРАДЖЭННЕ АБ СПАГНАННІ

Усе выдаткі, зрасходаваныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, павінны ў поўным аб'ёме пакрывацца бацькамі, у тым ліку і тымі, хто сваіх бацькоўскіх правоў пазбаўлены. Гэтыя выдаткі пакрываюцца ў добраахвотным парадку, але калі бацькі добраахвотна не кампенсуюць іх, дык яны спаганяюцца прымусова: з працуючых бацькоў — на падставе выканаўчага надпісу натарыуса, з непрацуючых бацькоў, або з бацькоў, месца жыхарства якіх невядома, — згодна з пастановай суда.

Выканаўчы надпіс натарыуса з'яўляецца яго распараджэннем аб прымусовым спагнанні ў бясспрэчным парадку з даўжніка на карысць спаганяльніка грашовых сумаў. Гэты дакумент з'яўляецца актам, які падлягае выкананню па тых жа правілах, якія ўстаноўлены для выканання рашэнняў судоў.

ДА НАТАРЫУСА — ПА МЕСЦЫ ЗНАХОДЖАННЯ СПАГАНЯЛЬНІКА

Хто звяртаецца да натарыуса за здзяйсненнем выканаўчага надпісу?

Упраўленні (аддзелы) адукацыі — у выпадках, калі дзеці знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу, апякунскіх сем'ях, прыёмных сем'ях.

Дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы, дзіцячыя вёскі (гарадкі), дзяржаўныя спецыялізаваныя ўстановы для няпоўнагадовых, якія маюць патрэбу ў сацыяльнай дапамозе і рэабілітацыі, дзяржаўныя ўстановы, што забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі — у выпадках, калі дзеці знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні ў гэтых установах.

Звяртацца трэба да натарыуса па месцы знаходжання спаганяльніка, што прадугледжана пунктам 3 артыкула 94 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці».

ПРАЦЭДУРА ПРОСТАЯ І БЯСПОШЛІННАЯ. АЛЕ НЕ РАСПАЎСЮДЖАНАЯ

Для здзяйснення натарыяльнага надпісу натарыусу трэба прадаставіць шэраг дакументаў. Якіх? Гаворка ідзе пра наступныя паперы:

— копію пасведчання аб нараджэнні дзіцяці або іншыя дакументы, што пацвярджаюць паходжанне дзіцяці ад бацькоў (аднаго з іх), якія абавязаны пакрываць выдаткі па ўтрыманні дзяцей, заведчаныя спаганяльнікам;

— копіі дакументаў аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў, аб адабранні дзяцей ці іншых дакументаў, на падставе якіх дзіця змешчана на дзяржаўнае забеспячэнне, засведчаныя спаганяльнікам;

— даведку аб перыядзе знаходжання дзіцяці на дзяржаўным забеспячэнні, аб выплачаных бацькамі (адным з іх), якія абавязаны пакрываць выдаткі па ўтрыманні дзяцей, сродкаў у лік пагашэння выдаткаў па ўтрыманні дзяцей і суме сродкаў на ўтрыманне дзяцей, што падлягаюць спагнанню штомесячна з гэтых бацькоў (аднаго з іх);

— даведку з месца працы бацькоў (аднаго з іх), якія абавязаны пакрываць выдаткі па ўтрыманні дзяцей.

Выканаўчы надпіс павінен быць здзейснены натарыусам не пазней чым на наступны дзень пасля атрымання ўказаных дакументаў. За здзяйсненне выканаўчага надпісу спаганяльнікі вызваляюцца ад выплаты дзяржаўнай пошліны на падставе падпункта 2.14 пункта 2 артыкула 10 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай пошліне».

Тым не менш, паводле слоў Веранікі Літвінкі, нягледзячы на прастату і бясплатнасць дадзенага натарыяльнага дзеяння, яно дагэтуль не распаўсюджана.

Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.

Кватэрнае пытанне

ЁСЦЬ ПРАВІЛЫ І ВЫКЛЮЧЭННІ

Нядаўна мы даведаліся, што ўнесены ўдакладненні ў правілы пастаноўкі грамадзян на кватэрны ўлік. У Мінску ён, як вядома, мае свае асаблівасці (калталту тэрмінаў пастаяннага пражывання). У іх нічога не змянілася?

Л. Карпук, *г. Мінск.*

Асаблівасці сапраўды маюцца. У прыватнасці, згодна з пунктам 6 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадастаўленне жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565, у рэдакцыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 верасня 2007 г. № 439) не прымаюцца на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў грамадзяне, якія прыбылі ў Мінск з іншых населеных пунктаў, на працягу 5 гадоў з дня рэгістрацыі іх па месцы жыхарства ў г. Мінску.

Указам кіраўніка дзяржавы ад 3 чэрвеня 2008 г. № 292 з гэтага агульнага правіла зроблена выключэнне: абмежаванне не будзе распаўсюджвацца на ўселеных ва ўстаноўленым парадку і пражываючых у жылым памяшканні мужа (жонкі), няпоўнагадовых і поўнагадовых непрацаздольных дзяцей, непрацаздольных бацькоў як наймальніка, уласніка, члена арганізацыі забудоўшчыкаў, так і членаў іх сем'яў, якія прымаюцца на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у якасці члена сям'і грамадзяніна, які мае пастаяннае месца жыхарства ў г. Мінску, а таксама дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, асобаў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, маладых спецыялістаў, якія атрымалі адукацыю за кошт рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў і накіраваны на працу па размеркаванні ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, грамадзян, запрошаных (прызначаных на пасаду), у тым ліку ў парадку пераводу ў г. Мінск, на працу (службу) у іншы дзяржаўны орган, іншую арганізацыю з іншых населеных пунктаў, а таксама звольненых з ваеннай службы па ўзросце, стане здароўя, скарачэнні штатаў і пражываўшых у Мінску да прызыву (паступлення) на ваенную службу альбо ў выпадку пражывання ў г. Мінску іх блізкіх сваякоў (бацькі, маці, мужа (жонкі), дзяцей, уключаючы ўсыноўленых (удачароных), родных братоў, сясцёр, дзеда, бабкі і ўнукаў.

Новаўвядзенне з'яўляецца і ўстанаўленне 5-гадовага тэрміну работы грамадзян, якія прыбылі ў г. Мінск з іншых населеных пунктаў, для атрымання права быць прынятым на кватэрны ўлік па месцы работы (службы) у арганізацыях, размешчаных у г. Мінску. Гэта патрабаванне не распаўсюджваецца на вышэйпамянёных дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, маладых спецыялістаў, а таксама грамадзян, запрошаных (прызначаных на пасаду) на работу ў дзяржаўны орган альбо іншую арганізацыю.

Новыя нормы, якія рэгулююць парадак уліку грамадзян, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уступаюць у сілу праз чатыры месяцы пасля афіцыйнага апублікавання Указа № 292 («Советская Белоруссия», 6 чэрвеня 2008 г.).

Віктар САВІЦКІ.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Выхавальніца:
— Дзеці, зараз жа развяжыце мяне!
Дзеці (хорам):

— Не-е! Кашу есці не будзем!

☺

У канторы звініць тэлефон. Мужчына здымае трубку:
— Алё, — чуецца голас яго жонкі. — Дарагі, ты з'еў бутэрброд, які я табе паклала з сабой?
— Так, мілая!
— Смачны быў?!
— Вельмі смачны, сонейка!
— Так??! Ну тады добра. А то я толькі зараз заўважыла, што чышчу абутак гусіным паштэтам...

Усміхнёмся!

☺

Нецвярозы ляснік, адмахваючыся ад камароў сякерай, высек 40 гектараў лесу.

☺

Мужчына прыходзіць да ўрача даведацца аб выніках аналізаў. Доктар:
— У вас у крыві 98 працэнтаў алкаголю.
— 98??? Блін, навошта я піў з лёдам!

ЧЭМПІЁНСКАЕ ВОЗЕРА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

За возерам Вечалле Ушацкага раёна замацавалася добрая слава. Тут праходзяць буйныя спаборніцтвы па водналыжным спорце, на якіх сустракаюцца многія наймацнейшыя водналыжнікі Беларусі і былога СССР. Наваполацкія сёстры Паліна і Ксенія ЛЕШЧАНКІ з задавальненнем катаюцца ў пары, калі іх буксіруе іхні бацька — майстар спорту, трэнер вышэйшай катэгорыі Ігар ЛЕШЧАНКА.

Інфарм-укол

Пасля абеду — кароткі сон

Камусьці з нас дастаткова шасці гадзін сну, а некаму мала і дзесяці. Колькасць сну, у якім мы маем патрэбу, вызначаецца нашай спадчыннасцю. А вось схільнасць да дзённага сну — індывідуальная рыса, якая сустракаецца ў мужчын і жанчын, жыхароў поўдня і поўначы.

Аказваецца, не толькі жыхары Міжземнамор'я і некаторых краін Усходу маюць патрэбу ў сіесце, і зусім не спякотны клімат таму прычынай. Калі сонца знаходзіцца ў зеніце, многія з нас перажываюць патрэбу ў адпачынку. Спецыялісты лічаць: калі яе задаволіць, гэта дапаможа палепшыць увагу, памяць і павысіць творчы патэнцыял. Вучоныя Гарвардскага ўніверсітэта высветлілі, што дзённы адпачынак дазваляе «перазагрузіць» мозг і пасля значна лепей засвойваць новую інфармацыю. Іншыя даследчыкі паказваюць, што гэты 20-хвілінны адпачынак павышае вытворчасць інтэлектуальнай працы прыкладна на 20 працэнтаў. Ёсць меркаванне, што ў чалавеку генетычна запраграмавана схільнасць да засынання каля 14—15 гадзін. У гэты перыяд зніжаецца ўвага, злітаюцца вочы, галава нахіляецца... Калі трымацца навуковага падыходу, ідэальна даць сабе 20—30 хвілін адпачынку каля 14—15 гадзін дня. Кожны можа самастойна распрацаваць для сябе «антыстрэсавую паўзу»: пакласці галаву на рабочы стол або расцягнуцца ў парку на траве...

Дапамога пры болю ў спіне

Кажуць, што прыкладна 70 працэнтаў людзей хоць бы раз у жыцці перажылі боль у спіне, астатнія пакутуюць ад яе пастаянна. Як дапамагчы чалавеку, калі яго скруціў востры прыступ болю ў спіне?

- Чалавек павінен прыняць зручнае становішча, пры якім боль адступае (напрыклад, легчы на спіну і пакласці пад калені валік або высокую падушку) і не рухацца.
- Прыняць прэпарат для абязбольвання: дыклафенак, ібупрафен, парацэтамол, артафен і г.д.
- Прыкласці на хваравітае месца на 5—7 хвілін пакет з лёдам. Прыкладна 30 працэнтам пакутнікаў гэта прыносіць палёгку.
- У першыя гадзіны нанясіце крэм з конскім каштанам або прэпарат накшталт ментолу, анестэзіну, эскузану, каб зменшыць ацёк.
- Пасля можаце скарыстацца крэмамі, гелямі, бальзамамі: фіналгон, вальтарэн-эмульгель ці іншымі.
- Як толькі боль прыступіўся, пачынайце пакрысе рухацца. І, калі ласка, не зацягвайце з візітам да ўрача.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

15 жніўня 2008 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі ўвяло ў паштовае абарачэнне маркі «Акадэмічнае веславанне», прысвечанную гульням XXIX Алімпіяды ў Пекіне, падрыхтаваную ВЦ «Марка» РУП «Белпошта». Мастак Віктар Старухін.

8 ліпеня 2008 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі ўвяло ў паштовае абарачэнне маркі «Баравік» і «Лісічка» з серыі «Грыбы ядомыя», падрыхтаваную ВЦ «Марка» РУП «Белпошта». Мастак Рыгор Доўбік.

Чытайце ў наступным нумары

Энергетычныя напоі могуць прывесці да інсульту?

У апошні час у маладзёжным асяроддзі ўсё большую папулярнасць разам з півам і слабаалкагольнымі напоямі набіраюць напоі энергетычныя. Яны, як правіла, не ўтрымліваюць алкаголь, але ад гэтага не з'яўляюцца менш небяспечнымі. Не сакрэт, што «энергетыкі» ўтрымліваюць дозы кафеіну, якіх дастаткова было б і для таго, каб падбадзёрыць слана. Адваротны бок медаля — згушэнне крыві і наступныя праблемы з сэрцам, крывяноснымі сасудамі і ў канчатковым выніку — інсульт. Прычым да такіх наступстваў можа прывесці не толькі злоўжыванне энергетычнымі напоямі, але нават умеранае іх спажыванне.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.57	20.27	14.30
Віцебск —	5.43	20.21	14.38
Магілёў —	5.47	20.18	14.31
Гомель —	5.48	20.10	14.22
Гродна —	6.13	20.42	14.29
Брэст —	6.17	20.38	14.21

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Аляксея, Антона, Васіля, Дзмітрыя, Івана, Мітрафана, Міхаіла, Пімена, Пятра.*

К. *Бярнарда, Сабеслава, Самуэля.*

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

20 жніўня



1898 год — нарадзіўся (г. Чавусы Магілёўскай вобл.) Леў Яўхімавіч Маневіч, выдатны савецкі ваенны разведчык, камбрыг, Герой Савецкага Саюза (1965, пасмяротна). У Чырвонай Арміі з 1918 года. Перад Другой сусветнай вайной у некаторых краінах Еўропы быў вядомы як пасяховы камерсант, уладальнік камерцыйных фірмаў, на самай жа справе — вёў разведвальную работу. У 1936 годзе арыштаваны ў Італіі і асуджаны на 12 гадоў зняволення. У 1943 годзе перададзены гітлераўцам, прайшоў канцлагеры Мельк, Маўтхаўзен, Эбензе. Адзін з арганізатараў антыфашысцкага падполля, кіраўнік падпольнай арганізацыі ў канцлагеры Эбензе (Аўстрыя). Вызвалены амерыканскімі войскамі 6 мая 1945 года і неўзабаве памёр ад знясілвання.

1940 год — у Мексіцы агент НКУС Рамон Меркадэр лёдарубам смяротна параніў аднаго з лідараў рускай рэвалюцыі, стваральніка IV Інтэрнацыянала Льва Троцкага.

Цытата дня:

«Сябрам пакінь утрая больш, чым сабе. Для сябе захавай галоўнае: хоць бы крупінку чыстага сэрца».

Хун Цзычэн (XVII ст.), кітайскі пісьменнік.

На конкурс апавяданняў

ВЫПАДКОВАЕ ЗНАЁМСТВА

Наша горкае і сумнае мінулае. Нам толькі здаецца, што мы збылі яго. Назаўсёды з ім развіталіся. Але яно жывучае, не-не ды падцікуе нас, напомніць пра сябе ў самы нечаканы час і ў самым нечаканым месцы, як гэта здарылася з героем апавядання Вячаслава Вольскага.
Віктар КАЗЬКО.

Павел Іванавіч штосьці затрымаўся дома і на лецішча паехаў апоўдні. У такі час у электрычцы мала народу. Ён сеў на першай лаўцы за дзвярыма і ўткнуўся ў газету. Калі да адпраўлення цягніка заставалася хвілін пяць, у вагон зайшла пажылая кабета. Яна была па-старамоднаму апранутая ва ўсё самаробнае і рознакаляровае вязанне з вышыўкамі і, нягледзячы на спякотны дзень, зашпіленая на ўсе гузікі сваёй дзівоснай кофты і такой жа размаляванай камізэлькі. Жанчына нясмела агледзелася, выбіраючы месца. Спынілася на свабоднай лаўцы насупраць Паўла Іванавіча.

Прытулілася да акна і прыціхла. Тым часам электрычка зрушыла з месца і Павел Іванавіч зноў заняўся газетай. Аднак думкі раз-поразу збіваліся на выпадковую спадарожніцу. Яна ехала з горада і, пэўна, на лецішча, — разважаў Павел Іванавіч. — Вясковая і сціплая, такія раней сустракаліся толькі на адзіноких хутарах. І тут яму падумалася, што зрэдку здараецца, падобныя да яе кабеты ў маладосці трапляюць у вялікі горад, але і там жывуць сваім вясковым укладам.

Пэўна, на трэцім прыпынку штосьці здарылася з сувяззю, бо машыніст спачатку прахрыпеў у мікрафон нешта невыразнае, а потым і наогул сціх. І тут суседка Паўла Іванавіча захвалявалася. Яна адвярнулася ад акна і стала азірацца. Аднак Паўла Іванавіча турбаваць не адважылася. Той сам заўважыў гэта яе хваляванне.

— Вас непакоіць, што машыніст перастаў аб'яўляць прыпынкі? — спытаў ён.

— Так, так, на самай справе...

— Не хвалюйцеся, на гэтай лініі я іх ведаю амаль што ўсе. Як ваш называецца? Падкажу, дзе вам выходзіць.

Спадарожніца назвала свой прыпынак. І тут Павел Іванавіч не зусім супакоіў, бо і сам ехаў туды ж. Але цяпер яго ўжо зацікавіла, да каго яна едзе ў іх дачны пасёлак, бо амаль усіх старажылаў ён ведаў, а яе ніколі раней не сустракаў.

— Прабачце, — сумелася кабета, — я нават і не ведаю, як вам адказаць. Тут дача майго мужа, з якім мы нібы ў разводзе. Была я там разы са два і то так даўно, што і не памятаю, як яе знайсці.

Такі адказ яшчэ больш здзівіў і заінтрыгаваў Паўла Іванавіча: «нібы ў разводзе» ды яшчэ з былым мужам. Пра гэта ён чуў упершыню. І тут кабета сама паспяшалася выправіць сваю неакрэсленую фразу.

— Шчыра кажучы, не вельмі хочацца забіваць вам галаву сваім жыццём. Але калі вас гэта зацікавіла... Даўно ўсё гэта было, — з нейкім асуджаным выглядам загаварыла жанчына. — Сышліся мы яшчэ перад вайной, дакладней, у год вялікага хапуна. Ужо тады ў нас з Кір'янам усё пачыналася не па-людску. На вячорках ён да мяне прычапіўся: «Пагаварыць трэба, давай выйдзем». А я ў той час забягала сустрэч з ім, бо ў нашай сям'і і ва ўсёй вёсцы Кір'янаву сям'ю ведалі як лайдакоў і галаданцаў. Мой старэйшы брат Арцём, запрыкмеціўшы, што Кір'ян да мяне заляцаецца, увогуле забараніў да мяне падыходзіць.

— Ну, а як вы да гэтага ставіліся? — спытаў Павел Іванавіч.

— На той дзявочы розум мне было нават цікава. Уяўляеце: хлопец не дае праходу, а брат яго адганяе. Арцём быў ладны хлопец, а Кір'ян ні тое ні сёе і вельмі кволы. Хаця трохі і шкадавала яго: ужо вельмі па мне сох. У той вечар я выйшла з ім за акопіцу.

Ён доўга сунуўся моўчкі, быў нейкі ўстрывожаны, усё азіраўся. Сказаць праўду, што мяне папярэдзіў Кір'ян, не магла, бо яго ў нашым доме і так ненавідзелі. Брат мог яго проста прыдушыць. Таму вырашыла спаслацца на чуткі на вячорках: маўляў, дзяўчаты шапталіся пра тры сям'і: нашу, Пархімчыкаў і Забродскіх.

У сенцах я сутыкнулася з бацькам, і на душы неяк адлягло: мільганула думка паведаміць яму ўсё. У канцы майго блытанага і ўсхваляванага расказу твар бацькі зрабіўся зямліста-чорным. Ён у роспачы махнуў рукою...

Раніцай у вёсцы паявіліся нейкія людзі ў скураных куртках, а таксама старшыня сельскага Савета і двое міліцыянтаў. Праз паўгадзіны ўвесь гэты натоўп завітаў на наш падворак. Адзін з міліцыянтаў зайшоў у хату і пагрозліва буркнуў Арцёму:

— Калі Кір'ян адслужыў у войску і вярнуўся да бацькоў, зноў стаў чапляцца да мяне, угаворваць, каб выйшла за яго замуж. Я ж памятала, як да Кір'яна ставіліся ў нашай сям'і і пад рознымі адгаворкамі адцягвала згоду. Да таго ж у маёй галаве глыбока заселі словы Арцёма на развітанне: «Калі вернешся дадому, беражыся Кір'яна».

А Кір'ян не даваў праходу. Аднойчы ноччу ўваліўся п'яны і стаў пагражаць, што заўтра ж напіша допіс, што я дачка ворага народа і што ўцякла з этапу, і мяне сашлюць на Калыму...

— А што ж суседзі, ды наогул вяскоўцы? Хіба яны не маглі за вас заступіцца? — падаў голас Павел Іванавіч.

— Баяліся ўсе, а некаторыя нават асуджалі, што я з кулацкай сям'і пагарджаю гаротным бедняком Кір'янам. Словам, выйсця я не знаходзіла.

На Каляды нас ажанілі. Мы сталі жыць у старэнькай хатцы яго бацькоў. Але цяпер ужо я павінна была рабіць на іх вялікую сям'ю ў гаспадарцы, якая яшчэ нядаўна была нашай. Колькі слёз праліла на тых родных пожнях, якія для мяне былі ўжо абрыдлымі і чужымі.

Пасля вайны мы пераехалі ў горад. Кір'ян уладкаваўся ў нейкай канторы, а я на птушкафабрыцы. У нас ужо было двое дзяцей: дачка і сын. Выдзелілі нам двухпакаёўку ў хрушчоўцы. Аднойчы на добрым падпітку Кір'ян выхваляўся, што ўсё гэта ён заслужыў і ўлады яго вельмі цэняць.

А пад восень у той год, калі скінаў Сталін, з ссылкі нечакана вярнуўся Арцём. Кароткая радасць ад таго спаткання з братам скончылася для мяне новай бядой. Амаль з парога Арцём коршакам накінуўся на Кір'яна: «А ну, давай выкладвай, як ты, спраўдзіўшы нашу сям'ю на Салаўкі? Як мяне з бацькам зрабіў ворагамі народа? Як ты нам у страху падсунуў іржавы абрэз, а потым накрэмзаў допіс?..

Кір'ян упаў перад Арцёмам на калені і пачаў па-сабачы скуголіць і прасіць у брата літасці. А я стаяла ў разгубленасці і не ведала, што рабіць, як іх развесці. Я добра ведала свайго брата... А тут такое... Божачка ты мой...

Арцём схапіў Кір'яна за каўнер кашулі і выцягнуў за дзверы. На лесвіцы была валтузня, а потым Арцём вярнуўся адзін... Доўга расказваў, чаго яны нацярпеліся з бацькам на Салаўках, а пасля і на Балтыйскім канале, дзе бацька і памёр. Там, у балоце, і пахаваў яго Арцём.

Пасля скандалу Кір'ян вярнуўся ў вёску да сястры. Арцём жа ніяк не мог уладкавацца на работу, жыў у мяне. Аднойчы прыйшоў узрадаваны з бутэлькай віна — яго прынялі ў пажарную каманду. У той вечар мы сядзелі на кухні і шчыра гаманілі. І тады нечакана Арцём стаў прасіць прабачэння за тое, што выгнаў Кір'яна. «Як бы там ні было, а ён твой муж, вунь і двое дзетак у вас. Толькі ведаеш, Каця, не мог я яму дараваць такое. Ён загубіў усю нашу сям'ю: маці, бацьку, мне паламаў жыццё. Ды хіба ён цябе ашчаслівіў?

«Пра што ты гаворыш», — запярэчыла я.

Арцём памаўчаў, зацягнуўся цыгаркай, а потым расказаў пра даўні выпадак, калі ён раскусіў Кір'яна. «Памятаеш, на вячорках (гэта было яшчэ да нашага выселення) Мікола Панкратаў пад гармонік расказаў вершык-прыпеўку:

Дзве гармоні, адзін бубен,
У калгасе жыць не будзем.

Дык праз тыдзень на Міколу прыехалі і ён некуды знік. Мы, хлопцы, пасля доўга гадалі, хто на яго данёс. Перабралі ўсіх, сышліся на тым, што гэта справа рук Кір'яна.

Пасля на канале я сустрэўся з Міколам Панкратавым. Ён гэта павердзіў. Той жа міліцыянт мне на месцы збору раскулачаных шапнуў пра Кір'янаў абрэз і данос. Аднойчы з бутэлькай самагону Кір'ян перад ім выхваляўся: «Гэтыя кулакі Грыбоўскія запомняць мяне на ўсё жыццё. Уяўляеш, мне падабаецца іх дачка, а яе брат мяне ў каршэнь з хаты... Ну, адпомшчу... Загрыміць ён са старым Грыбам на Калыму, а Каця мне дастанецца, дзявацца ёй будзе некуды...

Брат настойваў, каб я развялася з Кір'янам. Але ж у мяне не было шлюбнага пасведчання. У той час, калі мы сышліся, я не магла паказвацца на вочы начальству ў сельскім Савеце. А пазней заводзіць паперчыну аб шлюбе, каб тут жа яго скасаваць, палічыла марнай тратай часу. Так амаль паўвека і пражыла — і не ўдава, і не замужняя жанчына, хоць за сцяною, у адной кватэры, жыве мой былы муж.

— Дык ён вярнуўся да вас пасля таго выгнання?! — здзівіўся Павел Іванавіч.

— Бяда, як кажуць, адна не ходзіць. Пэўна, праз паўгода, як Арцём стаў пажарнікам, у навальнічную ноч загарэлася стайня ў прыгараднай вёсцы. Яго каманду накіравалі туды... Арцём некалькі разоў кідаўся ў ахопленую полымем стайню, ратуючы коней, пакуль не рухнула страха. З таго пажару Арцём не вярнуўся...

Вось пасля пахавання Арцёма Кір'ян і вярнуўся. Ён пасяліўся ў адным пакоі, а я з дзецьмі — у другім. І на сваю дачу ён не пускаў ні мяне, ні дзяцей. А на мінулым тыдні паехаў да сястры ў вёску, ды там і злёг, і, відаць, надоўга, бо сястра патэлефанавала, каб я з'ездзіла на дачу, паліла градкі. Стаіць жа такая спёка, згарыць усё, што ён там вясною панаторкаў. Я ж і забыла, дзе тая яго дача і як да яе дабірацца.

Электрычка набліжалася да іх прыпынку. Але ў гісторыі, расказанай спадарожніцай Паўла Іванавіча, было яшчэ шмат нявысветленых абставінаў. І першае, што цікавіла, ці змяніўся з цягам часу Кір'ян.

— Не-е, ніколечкі. Наадварот, стаў яшчэ больш нахабным, скрытным і подлым. Уявіце сабе такое...

Тут кабета сумелася, пэўна, раздумвала, гаварыць ці не, а потым усё ж наважылася:

— Аднойчы сын прыйшоў з інстытута пахмурны і ўсхваляваны. Я пытаюся: «Што здарылася, Ваня?» «Ды так, глупства», — адказвае. Не стала лезці з роспытамі. А сын за абедам дастаў з кішэні паперку і падае мне. Я ўзяла, чытаю. І сэрца так закалаціласа, а ў вачах так пацямнела, што думала, вось-вось страчу прытомнасць. Я пазнала почырк Кір'яна. Гэта быў яго допіс у бюро камсамольскай арганізацыі інстытута, дзе вучыўся сын. Кір'ян паведамляў, што Іван Батрак з сям'і антысаветчыкаў, што яго дзед і дзядзька былі актыўнымі ўдзельнікамі банды Булак-Балаховіча... Так Кір'ян помсціў нават роднаму сыну. За што толькі...

Цяпер, калі кабета назвала прозвішча свайго былога мужа, Павел Іванавіч успомніў дачніка з суседняга кааператыва. Ціхі, хадзіў ён неяк бокам, правым плячом наперад, мабыць, таму што левае было вывіхнутае ці перабітае. Маленькія вочкі вечна схаваныя пад насупленымі бровамі. Размаўляў з людзьмі, гледзячы ўніз.

Тым часам электрычка спынілася на іх прыпынку. Павел Іванавіч расказаў спадарожніцы, як прайсці да дачы, а яна закончыла свой расказ:

— Ваню не выключылі з інстытута, дзякуй Богу, той час мінуў. Але ні вучыцца там, ні жыць пад адным дахам з такім бацькам ён не мог. Сын на канікулах паехаў на цаліну, там і застаўся. А я адна. Век пражыла адна і памру адна...

Вячаслаў ВОЛЬСКІ.

СУТКІ

СУТКІ — адрэзак часу ў 24 гадзіны. Прынята лічыць, што сутки падзяляюцца на чатыры роўныя па працягласці часткі: раніцу, дзень, вечар і ноч.

Аднак неабходна адзначыць што ў культуралагічным разуменні часу ўсе 24 гадзіны нашых сутак далёка не раўназначныя паміж сабой, хутчэй за ўсё, кожная з іх валодае сваёй аўрай, сваім энергаінфармацыйным патэнцыялам, рытуальна-магічным полем, у прасторы якога прысутнічае выключна яму адпаведнае сацыякультурнае напружанне. Пра гэта зусім недвухсэнсоўна сведчаць шматлікія замовы лекава-прафілактычнай накіраванасці. Многія з іх пачынаюцца не бытавой, а у найвышэйшай ступені сакраментальнай формулай-пачаткам: «Добрым часам, першым разам», «Лепшым часочкам, першым разочкам», «Першым разочкам, Гасподнім Божым часочкам», «Першым разам, Божым указам, лепшаю гадзінкаю, лепшаю часінкаю».

- Гэта ж ідэя прысутнічае ў якасці абавязковай умовы ва ўсёй вясельнай абраднасці: добра ведалі той час, калі адпраўляюць святоў, калі рашчыняюць цеста для каравая, калі бласлаўляюць маладых, калі пачынаюць святочнае застолле, у рэшце рэшт, калі дзеляць каравай.
- Некаторым сакральным зместам напоўнены і момант адпраўкі чалавека ў далёкую (а асабліва — невядомую) дарогу. Самыя блізкія людзі на парозе дома (ці каля варот) абавязкова скажуць словы-пажаданні на добры шлях: «Дай, Божа, у добры час», «Благаславі, Госпадзі, у добрую хвіліну», «З Богам».
- Практычна любая значная падзея ў жыцці і дзейнасці нашых продкаў не пачыналася без слоў бласлаўлення і свяшчэннай формулы-пажадання: «Дай, Божа, у добры час». Неабходна распачынаць сяўбу збожжа ці бульбы, жаць жыта, квасіць капусту, садзіць дрэва, засыпаць бульбу ў склеп і г. д. — і кожны раз важнаму для жыцця дзеянню абавязкова папярэднічала формула-абярэг, формула-пажаданне. Заслугоўвае ўвагі тлумачэнне некаторых інфарматараў да лячэння хворага чалавека замоўленай вадой ці толькі замовамі: «На худы час трапіць — не паможа, а на добры — памагаець».
- У цяперашні час існуе некалькі варыянтаў поглядаў на пачатак сутак, іх структуру, кампаненты, якія іх складаюць. Фальклорныя творы і абрадавая практыка ўсходніх славян сведчаць пра тое, што пачатак сутак можа быць прымеркаваны і да поўначы, і да часу, памежнага з досвіткам (світанкам). З аднаго боку, абрады, звязаныя з зімовым і летнім сонцаваротам, пачынаюцца роўна апоўначы. З другога боку, у казачным эпасе шырока распаўсюджаны матыў, які можна ўмоўна назваць «да трэціх пеўняў». Часавая прастора дзеяння нячыстай сілы абмежавана поўначчу і ранішнім спевам пеўня, які прадказвае пачатак дня і тым самым адымае моц у рознай нечысці. «Трэці спеў пеўняў» (у фальклорных творах ёсць ускосныя сведчанні, што ў перыяд паміж вясновым і восеньскім раўнадзенствам яно адпавядае 3 гадзінам ночы) — гэта яшчэ не ўзыход сонца, але ўжо той момант у структуры сутак, які азначае абуджэнне чалавека і пачатак яго шматпланавай гаспадарчай дзейнасці.
- Зусім па-іншаму пачатак сутак прамаркіраваны ў хрысціянска-праваслаўнай традыцыі. Новыя суткі ў царкоўным набажэнстве пачынаюцца а 18 гадзіне. Таму Дзень Анёла-ахоўніка трэба адзначаць, пачынаючы з 18 гадзін папярэдняга дня.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.948 Індэкс 63850. Зак. № 4521. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12